УА “ Бабыніцкая дзяржаўная агульнаадукацыйная
ДС/СШ Полацкага раёна”

# Летапіс
# вёскі Бабынічы

## Намінацыя “ Сельскія населеныя пункты”

**Аўтарскі калектыў:**


М. Вілішчук

К. Грыднева, Н Дук,

А. Забела, В.Скарупа,

Я. Падсаднік, В. Шугалей.

Кіраўнік праекта

З.Дз.Шклянік


Бабынічы, 201

**Бабынічы – кропля Беларусі**





***Бабынічам прысвячаецца***

Не хаваецца між лясоў
І балотаў топкіх.
Не ляжыць паміж лугоў,
Ручаёў таропкіх.
Паміж люстраных азёр
Раскідала хаты.
Сцеражэ яе прастор
Белы птах крылаты.
Гэта ты, мой родны кут,
Бабынічы завецца.
Пра цябе складу радок,
Каб застаўся ў сэрцы.
Ты заўжды паўсюль са мной,
Цішынёй атуліш,
Цёплай ласкаю сваёй
Да сэрца прытуліш.
Захінеш мяне ў туманы,
Я з табою навек застануся.
Ты ў разбегу дарог зямных
Кропелька Беларусі.

М. Станоўка

У глыбіні Полацкай зямлі,вёрст за 40 ад старажытнага Полацка, тулілася паміж двума азёрамі мястэчка, дзе жылі 40 сямей служылых людзей. Былі гэтыя людзі добрыя і шчырыя, жылы ў згодзе паміж сабою. Ды не абмінула агульная хвароба і іх: калі край пачаў дзяліцца на праваслаўных і каталікаў, і местачкоўцы паддаліся звабе – адны хацелі застацца праваслаўнымі, другія – прыняць каталіцтва, бо ваявода Полацкі быў католікам.

Калі войска Івана Жахлівага асадзіла Полацк, усе баяры-каталікі рушылі на дапамогу Полацкаму ваяводзе, а праваслаўныя адправіліся на дапамогу рускаму войску, бо рускі цар абяцаў падтрымку праваслаўя.

Так добрыя суседзі-местачкоўцы сталі ворагамі. Забыліся яны пра тое, як добра і мірна жылі, забыліся, што дзяліць ім нечага, бо Радзіма ў іх адна.

Засталіся іх сем’і сіротамі, бо ў жорсткай і нікому не патрэбнай барацьбе загінулі баяры панцырныя і путныя, жыхары аднаго мястэчка, праваслаўныя і каталікі. А жанчынам – удовам трэба было гадаваць дзяцей, падымаць іх на ногі. І некаму было ім дапамагчы, бо ні Стэфан Баторый, ні Іван Жахлівы не прывыклі клапаціцца пра чужых дзяцей. Сталі жанчыны самі араць, сеяць, жаць ды малаціць, каб дзяцей пракарміць. За працай яны забыліся, што мужы іх у свой час былі ворагамі. А каб выжыць, дапамагалі адна адной. Не далі яны загінуць мястэчку, дзяцей сваіх паднялі ды ў свет вывелі. Але так і пражылі ўсё жыццё без мужчын, адны. А калі хто новы з’яўляўся ў мястэчка, здзіўляўся ладу, што панаваў тут, а яшчэ больш таму, што жылі тут адны жанкі. “ Бабы, вы чые?” – пытаўся здзіўлены госць. “Нічые,”- чуў  у адказ. Так і пайшла чутка пра мястэчка, дзе бабы нічые. А хутка словы гэтыя зліліся ў адно і сталі назвай – Бабынічы.

Даўно мінуў той час, але і сёння паміж азёр Бабына і Несета ўбачыш мястэчка, дзе спадарыня Гісторыя пакінула свой след.

Вось такая прыгожая легенда жыве ў нашай мясцовасці, па –свойму асвятляючы яе даўніну. Памяць пра людзей, што спакон веку тут жылі, жыве ў назвах, якія яны пакінулі пасля сябе, у песнях, створаных іх талентам, у традыцыях, што захоўваюць іх нашчадкі.

А што ж за зямля такая – бабыніцкая?

# Гістарычны экскурс

Бабынічы, вёска ў Полацкім раёне паміж азёрамі Бабына на захадзе і Несета на ўсходзе. Цэнтр сельсавета і калгаса імя М.З. Мялешкі. За 40 км на паўднёвы захад ад Полацка, 145 км. Ад Віцебска, 7 км. Ад чыгуначнай станцыі Загацце.Так характаразуецца наша малая радзіма ў “Энцыклапедыі гісторыі Беларусі” [40]

У ваколіцах Бабынічаў археолагамі зафіксавана два курганныя могільнікі – на берагах азёр Нявіда і Вялікі Бялёнак. Курганны могільнік на беразе возера Нявіда выявіўА.Р.Мітрафанаў. Ім было выяўлена 6 могільнікаў, даследавана – два. Паўторна ў 1975 г. курганы даследаваў Г.В.Штыхаў. Па яго меркаванні, тут адбываліся пахавальныя абрады. Зноўдзены тры пахаванні, у адным з насыпаў знойдзены перапаленыя косці, пахавальныях рэчаў не было. Знойдзены таксама кавалак ляпнога гаршка 5-7 ст. і некалькі фрагментаў ганчарнай керамікі. Ля возера Вялікі Бялёнак знойдзены курганны могільнік у складзе 17 курганоў[4].Зусім побач з вёскай знаходзіцца гарадзішча, якое датуецца 1-13 ст. У культурным пласце выяўлена кераміка днепра-дзвінскай і банцараўскай культур, фрагменты ганчарнага посуду, гліняныя біканічныя прасліцы, жалезныя сярпы, нажы, шылы, шпоры, бранзалет. Вядома з 19 ст. Даследаваў каля ста квадратных метраў В.І. Шадыра.

Так што жыццё на бабыніцкай зямлі было здаўна.

Старажытнае

гарадзішча.

*Фота*

*А.Зайцавай*



Бабынічы месцяцца паміж азёрамі Бабына і Несета. Возера Бабына знаходзіцца ў басейне р. Нача. Плошча 0,6 км$^2$.Праточнае, упадае рака быстрыца і чатыры ручаі, злучана пратокамі з азёрамі Несета і Нявіда. Багата на рыбу.Возера Несета мае плошчу 0,5 км$^2$. Вадазбор чатыры км. Багата на рыбу [4] Карацей, край наш азёрны.



*Бераг возера Несета. Фота А. Зайцавай.*

Паводле пісьмовых звестак, Бабынічы вядомы **з другой паловы 15 ст**., калі належылі полацкаму баярыну **З.В.Корсаку**, потым яго сынам і ўнукам. Паводле **Полацкай рэвізіі 1552г., згадваецца як"отчина и дедина" 5 унукаў З.Корсака.** Складася з феадальнага двара і сяла, дзе жыло 57 сем'яў(дымоў) сялян і 40 сем'яў ваеннаслужылых людзей – баяр панцырных і путных. З іх 13 сем'яў належыла В.М. Зяноўевічу - Корсаку , 45 – яго брату Івану, а астатнія іх стрыечным братам: Багдану, Глебу і Фёдару Іванавічам Корсакам [2]

Пазней Бабынічы заставаліся ў складзе Полацкага ваяводства, ва ўладанні нашчадкаў названых асоб; частка маёмасці ў выніку шлюбаў перайшла ў іншыя роды. Некаторыя з нашчадкаў роду Корсакаў пакінулі свае сляды ў тагачасных дакументах. Так, **Глеб Іванавіч Корсак**, адзін з уладальнікаў Бабыніч, **у 1534 г.** ад імя сваёй маці Настассі падаў у суд скаргу на пана Станіслава Ладзяціча за тое, што пажар, які распачаўся ў пушчы пана Станіслава, перакінуўся на пушчу яго маці на Начы і знішчыў шмат бортных дрэў. Кодэксам законаў, на падставе якога чынілі тады суд, быў Статут Вялікага княства Літоўскага [П, 40].

У 1552г. пасаду полацкага гараднічага займаў пан Васілій Міхайлавіч Корсак. Яму належалі чатыры " атчызныя" двары, сярод якіх і Бабынічы . Яго брат, Іван Міхайлавіч Корсак, займаў пасаду полацкага харужага, ён меў тры "атчызныя" двары, сярод якіх таксама лічацца Бабынічы. [37]

Можна меркаваць, што Бабынічы былі значным пасяленнем на Полаччыне па фактах, што ўпамінаюцца ў гістарычнай літаратуры. Да прыкладу, у 16 ст. на Полаччыне існавала даволі развітая сетка дарог, але толькі некаторыя з іх лічыліся найбольш важнымі, вялікімі : **Бабыніцкая**, Віцебская, Дрыская, Матырынская, Нешчарцкая, Чарсвяцкая і Язненская. Яны звязвалі Полацк з бліжнімі і дальнімі цэнтрамі ВКЛ і таму ўтрымліваліся ў добрым стане. Адаведныя абавязкі павінны былі выконваць сяляне, адным з такіх абавязкаў была павіннасць будаваць і рамантаваць шматлікія масты на важных дарогах праз рэкі Дрыса, Нача, Обаль, Струня, Ула, Ушача і інш. На гэтых дарогах былі створаны станы, месцы для адпачынку службовых асоб і змены коней у сёлах Кублічы, Курылавічы, ловеж, Матырына, Саланевічы. Сюды сяляне павінны былі дастаўляць харч і фураж, а таксама падводы. [37]

М. Спірыдонаў, даследчык гісторыі Полаччыны, называе павіннасці, якія лічыліся за прыгоннымі сялянамі Полаччыны : даннікі, дольнікі, прыгонныя людзі, путныя сяляне, цяглыя сяляне, кунічнікі, сяляне на ільгоце, сельскагаспадарчыя слугі. Значую частку складалі вольныя сяляне, былі яшчэ агароднікі і сельскія рамеснікі, адносна залежнасці якіх ад пана няма канчатковай упэўненасці, верагодна, яны былі часткова залежнымі. Гаспадарскія путныя слугі традыцыйна лічыліся вольнымі, так што можна меркаваць, што тыя жыхары Бабыніч, якія значацца, як " путныя"(37)у гэты час былі людзьмі вольнымі. Сяляне маёнтка Бабынічы мелі павіннасць на тры дні работы на тыдзень [ 37]

**Канец 15 пачатак 16 ст.ст** пазначаецца для ВКЛ, у складзе якога знаходзілася к гэтаму часу Полацкая зямля, пяццю войнамі з Масквой. Асабліва цяжкой для Полаччыны была чацвёртая вайна ( 1512 – 1522). У 1558г. цар Іван Грозны распачаў вайну супраць Лівоніі. ВКЛ выступае ў абарону апошняй. Узіму 1562 – 1563гг. рускае войска ўзяло Полацк. Гэтыя падзеі не абмінулі і Бабынічы, паколькі населялі іх " ваеннаслужылыя людзі, баяры панцырныя і путныя". Люблінская унія ( 1569г.) фактычна паклала канец існаванню ВКЛ. Полацкія землі пасля ўзяцця Полацка Стэфанам Баторыем уваходзяць у склад Рэчы Паспалітай.

**У 1654г.** расійскі цар Аляксей Міхайлавіч распачаў вайну супраць Рэчы Паспалітай. Адной з першых яе ахвяр стаў Полацк, узяты 17 чэрвеня. З самага пачатку 13-гадовага панавання Расіі на Полацкіх землях станаўленне мясцовага насельніцтва да новай улады было неадназначным. Частка шляхты прысягнула Аляксею Міхайлавічу, і з яе былі сфарміраваны цэлыя палкі, якія ваявалі на баку цара, частка ж не хацела гэтага рабіць. Багацейшыя паехалі ў незахопленыя раёны дзяржвы, бяднейшыя хаваліся па лясах. У 1658 г. вялікі гетман ВКЛ Павел Сапега паслаў да Глыбокага палкоўніка Уладзіслава Валовіча са значнымі сіламі. Валовіч узяў Глыбокае і зрабіў яго сваёй штаб – кватэрай. Даведаўшыся пра такі паварот падей, полацкая шляхта стала ў масавым парадку пераходзіць на бок Валовіча. Увесь левы бераг Дзвіны зімою 1658-1659г. практычна выйшаў з-пад кантролю царскай адміністрацыі. Усе цягаты гэтага часу зведалі і Бабынічы. **У студзені 1659г**. шляхціцы полацкай роты Восіпа Касоўскага, якая ваявала на баку рускага цара, прыйшлі **ў сяло Бабынічы**. Каб высветліць сапраўдны стан рэчаў, яны сказалі, што з Глыбокага. І тут мясцовы поп Сцяпан вазьмі і скажы : хвала, маўляў, Богу, што вы з Глыбокага, а то павінны быць людзі з Полацка. Тут бацюшу і ўзялі. . . На добыце ён апраўдваўся тым, што “испужався”[ 4,с.44 ]

Наступствы вайны паміж рускім царом і Рэччу Паспалітай былі жахлівымі для Полаччыны. Калі да вайны ў Полацкім ваяводстве жыло 162 478 чалавек, дык пасля вайны колькасць жыхароў скарацілася да 40 930 чалавек. [4,с.46] Безумоўна, у агульным патоку скарацілася і колькасць жыхароў у Бабынічах.

**У 17-18ст.** Бабынічы функцыянавалі як прыватнаўласніцкае мястэчка ў складзе Рэчы Паспалітай, затым Расійскай імперыі, што пацягнула за сабой утварэнне валасцей. **У 1763 г.** у мястэчку адкрыта валасная ўправа.

**У Бабыніцкую воласць** уваходзіла 8 сельскіх таварыстваў: Бабыніцкае, Юраўскае, Дзмітроўскае, Ухвішчанскае, Саланевіцкае, Арэхаўскае, Загацкае, Ксавер’янаўскае. Дзейнічаюць **праваслаўныя цэквы ў мястэчках Бабынічы,** Арэхаўна, прыпісныя прыходы ў в. Вуглы, пагосце Саланевічы. Капліцы дзейнічалі ў пагосце Саланевічы і в. Падкасцелле. Касцёлы ў в. Падкасцелле, і маёнтку Ухвішча. Дзве яўрэйсія сінагогі ў мястэчках Бабынічы і Арэхаўна, там жа малітоўныя дамы. Вучылішчы Міністэрства народнай асветы ў Бабынічах і Арэхаўне, царкоўнапрыходскае ў пагосце Саланевічы, тры школы граматы, дзве **лячэбныя ўстановы ў мястэчках Бабынічы** і Арэхаўна, тры **хлебныя запасныя магазіны, дзве казённыя**

**вінныя лаўкі ў Бабынічах** і Арэхаўне, два вадзяныя млыны ў фальварках Братаўна і Ключонкі, два ветраныя млыны ў вёсках Лесава і Сушына**. Вінакурныя заводы** ў маёнтку Арэхаўна, у мястэчках Арэхаўна і **Бабынічы**. [4, с.72]

**З 1793 г.** Бабынічы пазначаюцца як мястэчка ў складзе Расійскай імперыі, цэнтр воласці Лепельскага павета Полацкай, **з 1802г**. Віцебскай губерніі.[2]

Запіс у паялявым журнале за **7 жніўня 1808г**. сведчыць, што мястэчка Бабынічы з фальваркамі і вёскамі знаходзілася ў сумесным ўладанні памешчыкаў: былога полацкага маршала і кавалера Антона Восіпава, сына Сяліцкага, смаленскага падчашага Паўла Іванавіча Байкоўскага, шалбеляніца Карла і братоў яго Ігнатовых, дзяцей Корсакаў, вознага Сямёна Корсака, полацкага харунжага Івана Іванавіча Нарніцкага, шляхціча Гіпаліта Іванова, сына Садкоўскага [2]

Падзеі Айчыннай вайны **1812 - 1814 гг**. пакінулі свой след і на бабынікай зямлі. Пасля вызвалення Полацка рускія войскі, якія праследвалі адступаючага праціўніка, далі яму бой каля многіх населеных пунктаў, што знаходзілія на поўдзень ад Полака: каля Туроўлі, Семянца, Вароніч, Арэхаўна, **Бабыніч.[**4, с. 56] Непадалёку ад вёскі знаходзіцца ўрочышча Залатая горка, дзе, паводле падання, пахаваны французскія салдаты.

**З 1836** года ў гісторыі мястэчка з’уляецца яўрэйская складаемая. З’яўленне яўрэяў на Беларусі адносіцца да памежжа 14 – 15 ст. Асабліва інтэнсіўна міграцыя іх х Польшчы і Германіі адбываецца ў 16 ст. Першае дакументальнае сведчанне пражывання яўрэяў у Бабынічах датуецца 1836г. [2]

**За 1836 г.** у мястэчку значыцца царква, два двары ў сем душ лікам. Яўрэйскага насельніцтва 73 душы ў дзесяці дварах. Старастам мястэчка быў Шмуйла Абрамавіч Рыўкін [2]

**За 1846** г. замацаваны наступныя звесткі пра інвентар маёнтка Бабынічы (мястэчка ўваходзіла ў склад маёнтка, які належыў Францу Восіпавічу Корсаку). Пад будовамі знаходзілася 12 дзесяцін зямлі, зямлі ворыўнай пры пустэчы – 38 дзесяцін, сенажацяў 7 дзесяцін, пад лесам – 190 дзесяцін. Лес у асноўным сасновы і бярозавы, непрыдатны для будаўніцтва. Выкарыстоўваўся для абгароджвання надзелаў і на дровы. Продаж лесу і прадуктаў харчавання адбываўся за 35 вёрст у г. Полацку, і 30 вёрст у г.

Дзісна. Сяляне ў асноўным займаліся земляробствам, плацілі падушны падатак. Па дамоўленасці з прыхадскім свяшчэннікам апрацоўвалі зямлю ці плацілі грашовы аброк [2]

Усе тэндэнцыі тагачаснага грамадскага жыцця і дзяржаўнага развіцця знаходзяць месца ў Бабынічах. З сярэдзіны 19 стагоддзя ў мястэчкі прыходзіць асвета. **У 1862г**. у Бабынічах адкрыта валасное вучылішча для дзяцей сялян – уласнікаў[2]

**У 1864г**.адкрыта Бабыніцкае народнае вучылішча. Месцілася ў грамадскім доме бясплатна[2)] Змена статуса вучылішча пашырыла магчымасці адукацыі для бабыніцкіх дзяцей, паколькі цяпер доступ да асветы атрымалі не толькі дзеці сялян-уласнікаў, але ўсё дзеці наогул. На ўтрыманне Бабыніцкага народнага вучылішча штогод адводзілася 139 руб. З дзяржаўнага казначэйства і 50 ад валаснога. **З 24 кастрычніка 1886г.** настаўнікам у народным вычылішчы пачынае працаваць Павел Фёдаравіч Істомін, праваслаўнага веравызнання, які скончыў курс у Віцебскім уездным вучылішчы [2]

**У 19 ст.** у гісторыі мястэчка ўзнікае след новых яго ўладальнікаў – Тамашэвічаў. За **1880г.** значыцца пасямейны спіс двараніна Лепельскага ўезда Віцебскай губерніі, уладальніка мястэчка Бабынічы, Тамашэвіча, які сведчыць:” Іеранім – Казімір – Франц Францаў сын Тамашэвіча, 1857 г.н., 1 кастрычніка. Яго маці Казіміра Ягор’ева з Івашэўскіх, 21 лютага 1836 г.н., яго сястра Марыя 1864г.н. Род Тамашэвічаў зацверджаны ў дваранскай годнасці указам урадавага сенату па Дэпартаменту Геральдыкі 23 лістапада 1832 г. за № 6934, а Іеранім – Казімір- Франц – Францаў сын Тамашэвіч залічаны да гэтага роду азначэннем Віцебскага дваранскага дэпутацкага сходу, які адбыўся 14 ліпеня 1896г.На дваранскае паходжанне маюцца наступныя дакументы: пасведчанне Віцебскага дваранскага дэпутацкага сходу ад 23 верасня 1869г. за № 1139: уладальнік маёнтка Бабынічы з мястэчкам Бабынічы .Маецца даведка: Франц Францаў Тамашэвіч зацверджаны ў дваранстве загадам Герольдыкі ад 23 лістапада 1832 г. за 3 6934, сын жа яго Іеранім – Казімір – Франц, што нарадзіўся ў 1857 г., сапрычасны да роду прапановай сходу 14 ліпеня 1896г., якая ўвайшла ў законную сілу.”[2]

За **1881г.**захаваўся дакумент, які сведчыць, што мястэчка знаходзілася ў валоданні памешчыка Тамашэвіча. Колькасць жыхаоў – 449, мужчын -228, жанчын – 221. [2]

У другой палове **19 ст.** мястэчка актыўна разбудоўваецца, з’уляюцца новыя ўстановы, пашыраецца штат ужо дзейных. Расце колькасць жыхароў, як уяўляецца, у першую чаргу за кошт прытоку яўрэйскага насельніцтва з іншых населеных пунктаў. На карысць гэтай высновы сведчыць той факт, што за пяць год колькасць бабынян павялічылыся болей як на пяцьсот чалавек.

Дакумент сведчыць, што ў **1886г.** Бабыніцкае валаснное ўпраўленне ўваходзіць у міравы ўчастак Лепельскага ўезда. Колькасць душ, якія знаходзіліся ў складзе – 968. Архіўны дакумент за **1894г**. утрымлівае прозвішчы 184 яўрэяў, жыхароў мястэчка. Значная частка з іх пражывалі раней у Арэхаўне, Ушачах, Чашніках [2] (**Дадатак №1**). Яўрэі ўзбагацілі жыццё мястэчка. З іх з’яўленнем у Бабынічах пашыраецца гандаль, пачынаюць працаваць вапнавы, малочны заводы, ваўначоска, цагельня. Адкрыты абутковая і швейная майстэрні. Асноўная роля ва ўсіх установах належала яўрэям.

У **1897г**. у мястэчку адзначаецца наяўнасць трох гандлёвых лавак.[2] Гандаль, у асноўным, вялі яўрэі.

**У 1906 г.** тут адзначаецца ўжо 295 жыхароў –яўрэяў. Яўрэі клапаціліся пра ўсё неабходнае для жыцця і адпраўлення рэлігійных рэтуалаў. Імі ўзведзена сінагога, малітоўная школа, функцыяваў нават рытуальны басейн [2]

У **1900г.** у мястэчку ўжо дзейнічае ўрачэбны прыёмны пакой, фельчарам тут працаваў Максім Кавальчык.[2]

На пачатку **20 ст.** мястэчка застаецца ў валоданні роду Тамашэвічаў. Так, за **1905г.** замацаваны звесткі пра тое, што мястэчкам валодаў дваранін каталіцкага веравызнання А. Тамашэвіч. Колькасць ворыўнай зямлі – 30 дзесяцін, 30 дзесяцін – пад лесам.Колькасць двароў – 70, насельніцтва – 326 чалавек, мужчын 156, жанчын – 170. У мястэчку дзейнічала праваслаўная царква, сінагога, яўрэйкая малітвенная школа, народнае вучылішча. [2]

Разам з тым, у жыцці местачкоўцаў былі свае праблемы і складанасці, характэрныя для часу ўвогуле.

Пісьмо настаўніка Бабынікага народнага вучылішча В. Драздзецкага ў газету “Віцебскі голас” аб цяжкім матэрыяльным становішчы вучылішча за **1906г.** яскрава сведчыць аб адносінах уладаў да патрэбаў простага люду.

“Не привыкло наше народное училище до сих пор к снисходительному вниманию со стороны местных волосных заправил; веоятно ему и не стать привыкать. Ждём не дождёмся того времени, когда сельские школы станут в другие условия, вступят в дугую жизнь – лучшую.

Вот уже от начала учебного года пошёл третий месяц, а внашем училище нет сторожа. Ученики сами комнаты метут, за керосином ходят, а воду возят с полверсты от училища, а по неосторожности другой и с бочки упадёт, перемочится и , брося всё, несётся во всю прыть домой обогретсься, осушиться.

Но ещё труднее бывает нам, когда волосные заправилы уедут в Лепель на « сдатчину», и угонят стоечных лошадей, оставив нам одну только бочку. Но хорошо ещё, что бочку оставили, а унас есть руки, ноги да сила, как у комара… Ну, слава богу: воды навозили, дров аносили, завтрак сварили – покушаем… Учитель кричит: в класс! Проходит урок, другой – глядь : время обеда близко.опять вода, дова… А там глядишь Иван да семён урок и не выучили. Учитель говорит, -« Ну останьтесь без обеда да посидите до № часов в классе». « Слава богу! Слава богу! Теперь дрова не носить, воду не возить. Слава богу! Слава богу!»,- слышит учитель , только что скрывшийся за дверью. А другие Гришки да Мишки чуть- ли не завидуют им. Слава богу, что в училище ребят, что у Мамая полчищ : одного туда, другого сюда, там сам подбежишь, тут подбодришь и дело сделано, и день скоротали. И так изо дня в день.

А там в волости старшина сидит, да на просьбы учителей отвечает : « Ничего, ничего! Твои мальцы прытки, не что им и делать.Вот зараз сторожа найду.» И третий месяц всё ищет.Учитель несколько раз ходит в волость просить, чтобы нашли сторожа. Грозит, что занятия прекратит, начальству жаловаться будет. « Ничего, ничего, зараз сторожа поищу», - слышит ответ.Приходишь в десятый раз. Смотришь, старшина хватает шапку и что – то спешит. Где же старшина? А он давно уж там, где море синее плещет.

Ну, думаешь, надо наконец обратиться к земскому: он, наверное уж, поможет в горе. Пишешь раз, пишешь другой – ответа нету. Вдруг колокольчик динь- динь – динь. От радости волнуешься: думаешь инспектор, смотришь- земский. Вот лошади шажком пошли, вот, вот остановятся у крыльца и земский зайдёт на « поросят» посмотреть, ободрить, слово ласковое сказать. Приготовились встретить. Ан нет, ямщик ударяе по лошадям, и кони мчатся, увозя скорее ездока. Думаешь, господи боже, не от нас ли? И вместо радостного чувства, сколько является обид, горечи, печали!!!

Известный

Покорнейше прошу господина редактора поместить это в газету” Витебский голос”, учитель В. Дроздецкий. 2 ноября 1906 г. [2]

Нягледзечы на праблемы, паднятыя ў пісьме настаўніка, вучылішча працягвала плённа працаваць. За час свайго існавання яно дало пуцёўку ў жыццё тысячам маладых бабынян.

На пачатку 20 ст. у мястэчка з’яўляецца яшчэ адзін уладальнік – **А.У. Шырын. У 1906г**.А. Сапуноў у”Спісе населеных пунктаў Віцебскай губерніі” паведамляе, што мястэчка Бабынічы адносіцца да Лепельскага павета. У ім мяшчанскае кіраванне, валасная ўправа. Уладанне дваран, католікаў Шырына Аляксандра Усцінавіча і Тамашэвіч Аліны Феліксаўны. 338 жыхароў, з іх 43 хрысціян, 295 яўрэяў, 7 служачых духоўнага сану, 295 мяшчан, 36 сялян. У мястэчку 92 драўляныя будынкі, з іх жылых 52, нежылых – 40. Пабудавана царква. Працуе народнае вучылішча, прыёмны пакой, казённая вінная лаўка. [2]

Маёнтак А.У.Шырына размяшчаўся ў прыгожым маляўнічым месцы, але крыху наводдаль ад азёр. Гэта не падабалася пані Шырын. Каб дагадзіць каханай, пан загадаў зрабіць рукатворнае возера проста побач з сялібай. Так і з’явілася ў ваколіцах мястэчка яшчэ адно возера, якое завецца Копанкай.

**У 1912г**. у мястэчку адкрываецца паштова-тэлеграфнае аддзяленне. Начальнікам працуе Фёдар Навумавіч Кудраўцаў. Царкоўным свяшчэннаслужыцелем – Пётр Нарбут, равінам быў Мендель Іоселеў Рыўлін.[2]

**У 1913г**. у Бабыніцкай воласці Лепельскага ўезда ўжо налічвалася пяць сельскіх абшчын, два земскіх начальнікі. Комплекс паселішчаў у Бабынічах складаўся з мястэчка (70 дамоў, 326 жыхароў) і фальварка Бабынічы – Вовель (належалі памешчыку А. Тамашэвічу), маёнтка Бабынічы – Юраўшчына ( належаў нашчадку першых уладальнікаў В.Корсаку) і маёнтка Вуглы – Бабынічы (належаў Ф. Русецкаму) [2]

Гэта апошні запіс здарэвалюцыйнага мінулага Бабыніч. Бурныя імклівыя падзеі пачатку 20 ст. – Першая сусветная вайна, Кастрычніцкая рэвалюцыя – непазнавальна змянілі жыццё мястэчка.

**У 1918г.** мястэчка вызвалена ад нямецкай акупацыі перыяду Першай сусветнай вайны. Утвораны валасны выканкам як сведчанне рэвалюцыйных перамен, што дакаціліся да краю. У склад Бабыніцкай воласці ўваходзілі

наступныя насеныя пункты: в. Альховічы, в. Бабынічы, маёнтак Бабынічы, фальварак Баравыя, фальварак Барбарова,мёнтак Быстрыца, ф-к Белеўшчына, зазценак Весялова, в. Вуглы, м-к Гірсы, ф-к Галінова,в. Галаты, ф-к Галавачова, ф-к Гасеўшчына,в. Еськаўшчына, ф-к Жыхары, ф-к Забалоцце, в. Загоршчына, ф-к Зуі, м-к Караваіна, ф-к Кісадолеўшчына, ф-к Лабачова, в. Мажуйкі, ф-к Мокрыя Пожні, засценак Немірова, ф-к Паднесета, ф-к Пазнякі, ф-к Пекаршчына, ф-к Падсаднікі, хутар Падсаднікі, засценак Пятрова, ф-к Пятрова, в. Рабчонкі, в.Сапегі, ф-к Тулаўшчына, маёнтак Ухвішча, ф-к Уша, засценак Чорная Лужа, ф-к Шабузіна, маёнтак Юраўшчына.[2]

За 1 км ад Бабыніч праходзіць дзяржаўная мяжа з Польшчай. Пасля станаўлення савецкай улады пачынаеца сыход шляхты ў Польшчу, што моцна абвастрае сітуацыю. Атмасфера часу знайшла бліскучае адлюстраванне ў пісьме старшыні Арэхаўскага валрэўкома(суседні з Бабыніцкім) Серафімава.

“ В Полоцкий уездный исполком,30 декабря 1920г.

Наша волость находится при самой границе и даже разделена надвое благодаря этому сильно развит шпионаж со стороны местной сбежавшей шляхты и подвергается набегам со стороны польских войск. Беспощадно ограблено разное имущество населения этой нейтральной полосы.

Дать какое-либо сопротивление волревком не в силах за отсутствием всякой вооружённой силы (бывшие в распоряжении волревкома пять человек красноармейцев 154 полка ВНУС отозваны в свою часть). Даже члены ревкома в любой момент рисуют быть убранными.

Был проведён набег на имение Ореховно, Загатье, и дер. Грицковщина и много других, кроме того местная шляхта в сопровождении солдат делает наезды по ночам в разные фольварки и имения и увозит хлеб и были случаи даже перевода скота за демаркационную линию, дезертиры бегут целыми десятками. В таком положении ревком работать не в состоянии. Просим ходатайствовать перед высшими властями о немедленной высылке вооружённого отряда для отражения набегов польских банд, бегущих через нашу волость дезертиров, кроме того, волревком констатирует, что необходимо вооружить хотя бы винтовками членов и сотрудников волревкома, которые как хорошо организованны и появившуюся банду своими силами вполне могут задержать.

Председатель Ореховского волревкома Серафимов

Памежнае становішча мястэчка абумовіла той факт, што станаўленне новай улады тут ішло няпроста. Так, у зводцы арганізацыйнага пададдзела ўпраўлення Полацкага павятовага выканкама адзначаецца, што “ общая характеристика настроения рабочих, крестьян и пр. населения – хорошее, за исключеним поляков-кулаков, проживающих в Бобыничской волости, которые распространяют слухи о том, что местность их будет занята якобы поляками” [ 4, 95]

У гэтым жа дакуменце утрымліваюцца звесткі пра тое, што у Бабыніцкім валвыканкаме камячэйка ўмешваецца ў справы выканкама, не маючы на тое ніякіх падстаў. Складана было бабынянам будаваць новае жыццё.

У 20-ых гадах адбываецца ўзбуйненне паветаў. **З 1922г.** Бабынічы ў Полацкім павеце. Па-ранейшаму асноўную частку жыхароў складаюць яўрэі. У спісе жыхароў вёскі на здачу хлеба за красавік. **1924г**. значыцца 70 гаспадароў яўрэйскіх двароў [2] (**Дадатак №3**)

Да гэтага часу адносіцца паданне аб апошнім з нашчадкаў першых уладальнікаў пасялення – Корсакаў. Ва ўладанні Корсака знаходзіўся маёнтак Юраўшчына, што насупраць Бабыніч, на супрацьлеглым беразе возера Бабына. Дом быў прыгожы, разумна збудаваны з выдатнай цэглы – будаваўся на вякі. У Корсака было двое малы яшчэ дзяцей і прыгажуня жонка. Так сталася, што яна пакахала свайго парабка – “злюбілася” з ім, як кажуць. Калі муж даведаўся пра гэта, у парыве рэўнасці і нянавісці застрэліў парабка. Корсака ў той жа дзень забралі ў турму, а пані з’ехала з дзецьмі ў Польшчу. Так заканчваецца гісторыя Корсакаў у Бабынічах.

Рэвалюцыйныя змены закранулі не толькі прыватнае жыццё. **У 1925г.** паветы рэарганізаваны ў раёны.**З 25.08. 1925 – 1931гг.** Бабынічы ў Полацкім раёне [4, 52]

Перамены ў паслярэвалюцыйным жыцці не зводзіліся толькі да рэарганізацыя і замены адной назвы на другую. **За 1925 г.** значыцца першае скасаванне шлюбу ў Бабыніцкай воласці [2] У жыццё вяскоўцаў уваходзяць новыя паняцці : камуніст, камсамолец, піянер,прадналог, рэўком, сельсавет, калгас.

**У снежні 1929** г. на тэрыторыі Бабыніцкага сельсавета ўтвораны першы калгас. Калгаснае будаўніцтва ішло няпроста і часам нават трагічна, аб чым сведчыць гісторыя першага старшыні калгаса” Зара новага жыцця” М.З. Мялешкі, што захавалася не толькі ў людской памяці, але і ў раённай прэсе.

Імем першага важака

У снежні 1929г. – першы год калектывізацыі. Хутаране з Вуглоў, Яськоўшчына аб'ядналіся ў калгас " Зара новага жыцця". Важаком калгаса стаў малады, энергічны камуніст Мікалай Захаравіч Мялешка. Ён быў з тутэйшай бядняцкай сям'і, родам з вёскі Чамярычына. Цвёрда Мялешка вёў лінію партыі, цвёрда наступаў на кулацкае ахвосце. Побач яшчэ праходзіла так званая " польская граніца". І кулакі злараднічалі над калгаснымі актывістамі. У адзін са снежанскіх дзён 1929 г. бабыніцкія жыхары апошні раз бачылі  Мікалая Захаравіча. На досвітку старшыня адправіўся на станцыю за попелам. А тут насустрач яму і папаўся Васіль Дудняк.Прабраўшыся ў кладаўшчыкі, ён разбазарваў маёмасць, аднятую ў багацеяў, трымаў тайны з варожымі элементамі. Строгі быў погляд у тую раніцу ў старшыні.Дудняк гэта зразумеў." Пойдзем у склеп, старшыня, там уся - ўся маёмасць."

А праз некалькі дзён у " Зары новага жыцця " забілі трывогу: дзе сташыня? Расказваюць, што Дудняк вадзіў вяскоўцаў у поле і паказваў у адным месцы памятую пшаніцу: маўляў, Мялешка уцёк у той, польскі бок , а тут , у пасевах, тайком назначае спатканне з жонкай.Толькі на наступны год адбылася разгадка. Калгаснік Мікіта Сапега пайшоў з вудачкамі і донкай на возера і там убачыў труп чалавека. У ім апазналі старшыню Мялешку. Пачалі пошукі забойцы.  Незадоўга пасля знікнення старшыні ў калгасе ішоў камсамольсккі сход. Позна вечарам вярталіся са сходу дзяўчаты. Дарога праходзіла ля могілак. Маша з Галяй убачылі на могілках павозку. На калёсах нешта было загорнута пасцілкамі. Там корпаўся Дудняк. Убачыўшы пільны погляд знаёмых яму  дзяўчат, Дудняк пагнаў воз у другі бок. Усё гэта ўспомнілі на судзе.  Высветлілася, што Дудняк спачатку закапаў цела старшыні ў склепе, а вясной вырашыў закапаць яго на могілках. Калі планы забойцы сарваліся, ён пачапіў камень на шыю ахвяры і кінуў у возера. З ушанаваннем пахавалі свайго старшыню бабыніцкія калгаснікі. З таго часу калгас носіць імя свайго першага старшыні."[2]

Дзеля аб'ектыўнасці неабходна адзначыць, што існуе і іншая версія забойства Мялешкі. Кажуць, што Дудняк вельмі хацеў, каб пасаду старшыні калгаса заняў яго пляменнік. Так і здарылася : пасля знікнення Мялешкі яго пасаду заняў пляменнік забойцы.

Пэўная частка бабынян захоўвала аднаасобны лад жыцця.Адзначаецца 21аднасобная гаспадарка лікам у 98 душ. У карыстанні бабыніцкіх аднаасобнікаў было 54 г зямлі.[2]

Жыццё не стаяла на месца, а імкліва ішло наперад і несла змены. У школе жыццё ідзе па новым русле. З’яўляюцца новыя адкацыйныя методыкі, які ўсімі сіламі імкнуцца асвоіць бабыніцкія настаўнікі [2]

Яшчэ адна прыкмета часу – піянеры і камсамольцы, што з’яўляюцца тут, як і паўсюль. Сярод першых піянераў – россып беларускіх і яўрэйскіх прозвішчаў: Жэня і Саша Уладзіміравы, дзеці паважаных усімі настаўнікаў Савы Уладзіміравіча і Еўдакіі Васілеўны Уладзіміравых, Лея Топаз, Этя і Нуся Язенер, Надзя Шынелька, Муша Лейтман, Соня Левіт, Эця і Хана Сорыны, Геся і Рыва Іофэ, Сяргей Агапаў, Віталь Палітыка.



*Першыя піянеры і камсамольцы школы. Фота з фонду школьнага музея.*

Такая ж карціна і з першымі камсамольцамі, што з’явіліся адначасова з піянерамі : Эця Хацянава, Кейля Іофэ, Кастрель Іофэ, Ізраіль Левіт, Гілярый Левіт, Грыша Сядлоўскі, Фёкла Аўласенка, Мікалай Саўчанка, Фоця Кімстач, Іван Пахілка, Сімон Гельман, Замкан Гельман, Палітыка, браты Сімкінавы [8]

Маладая краіна Саветаў мела патрэбу ў новых кадрах. Гэта прымушае інтэнсіўна іх рыхтаваць. Пасля сямігодкі многія камсамольцы прадаўжаюць вучобу ў школах рабочай моладзі, на рабфаках, ФЗУ. Так гартуецца эліта грамадства. На хвалі ўздыму аказваюцца і многія вучні бабыніцкай сямігодкі: М.Г. Падсаднік, П.П.Маскаленка, Г. Левіт, М. Серафімаў і многія іншыя. Размова пра іх лёсы пойдзе ў раздзеле “ Людзі бабыніцкай зямлі”

Пачатак 30-ых г. у былым Савецкім Саюзе пазначаны барацьбой з “рэлігійным опіумам”. Не абмінуў гэты працэс і Бабынічы. Пасля ўтварэння калгаса былі разбураны царква і сінагога. Свята – Мікалаеўская царква месцілася на самым высокім месцы мястэчка – гары, якую зараз займае клуб. Зусім побач, пад гарою, стаяла сінагога. Абедзве былі бязлітасна разбураны.Здымаць званіцу з царквы палез зусім малады чалавек, аднак не

ўтрымаўся і зваліўся, паламаўшы пры гэтым нагі. Язык звана захоўваецца зараз у школьным музеі як памяць пра мінулае і папярэджанне адначасова.

Не абмінулі лёсы нашых землякоў і рэпрэсіі 30-ых гадоў. Многа нявінных людзей сталі ахвярамі палітыкі рэпрэсій. ( **Дадатак №7** )

Разам з тым, першая палова 20 ст. стала часам актыўнага грамадскага і гаспадарчага будаўніцтва. Набірае моц створаны калгас, узводзяцца новыя будынкі грамадскага карыстання. Так, перад самай вайной, у 1940г., здадзены будынак школы, ўзведзены ў цэнтры вёскі. Пашыраецца калгасны двор, разбудоўваецца сама вёска за кошт перасялення з хутароў гаспадароў-аднаасобнікаў. Наўкол Бабыніч існавала разгалінаваная сістэма хутароў, якія часцей за ўсё насілі імёны родаў, што тут жылі: Пазнякі, Падсаднікі, Лабэцкія, Сапегі і г.д.

Памяць старажылаў аднаўляе наступную карціну мястэчка 30-40-ых гг. 20 стагоддзя.

Цэнтральная вуліца мястэчка была забудавана яўрэйскімі дамамі. Цэнтр уяўляў сабой нешта накшталт дзелавой часткі. Тут знаходзіліся два магазіны, швейная і абутковая майстэрні, будынак пошты. Крыху ўбаку ад цэнтра, бліжэй да возера, размяшчалася бальніца. Былі ў Бабынічах і прамысловыя прадпрыемствы: цагельня, вапнавы і малочны заводы, ваўначоска. Цагельня і вапнавы завод знаходзіліся крыху паводаль ад мястэчка, вышэй возера Несета, малочны завод размяшчаўся на беразе возера Бабына. Цэнтральная вуліца, на якой стаялі яўрэйскія дамы, была вельмі вузкай, дамы стаялі блізка адзін да аднаго. Насупраць магазінаў знаходзілася невялічкая рыначная плошча.

Яўрэі былі актыўнымі работнікамі ва ўсіх сферах жыцця мястэчка. Сярод першых піянераў і камсамольцаў былі яўрэйскія дзеці. Прыкладна з 1920г. доктарам працаваў Пэтлух. Яго намаганнямі да бальніцы быў прыбудаваны радзільны дом і адкрыта аптэка. Вытворчасцю на заводах кіравалі таксама яўрэі. Вядома, да прыкладу, што ваўначоскай загадваў Хаймура. На адкрытай на пачатку 30-ых г. тэлефоннай станцыі працавалі чатыры яўрэйкі. На гары, непадалёку ад цэнтральнай вуліцы, стаяла сінагога, а крыху вышэй знаходзілася царква.

Закройшчыцай швейнай арцелі была Герухман. Настаўніцай у школе працавала Соф’я Левіт. Эця Хацянава была піянерважатай. Рыва Герцык - бібліятэкарам. Іофэ загадваў аддзяленнем сувязі [30]

Актыўны удзел прымалі яўрэі і ў калгасным будаўніцтве. Так С.М. Глебава, унучка Соры і Ары-Лейба Фінкельштэйнаў, паведаміла, што яе дзед быў перадавіком у калгасе. За ўдарную працу напярэдадні вайны ён быў узнагароджаны канём [17]





*Эця Хацянава ( злева )  і Соф'я Левіт . Фота з фонду школьнага музея.*

Вялікая Айчынная вайна змяніла ход гісторыі Бабыніч, як і ўсёй Беларусі. Улетку **1941 г**. у Бабынічах размясціўся нямецкі гарнізон [4,с.143]

Перыяд усталявання акупацыйнага рэжыму ўсе сведкі вайны ўспамінаюць як адзін з самых цяжкіх часоў вайны. Яшчэ да прыходу немцаў вёску бамбілі. Многія жыхары засталіся без даху над галавой, бо дамы іх згарэлі падчас налётаў авіяцыі на пачатку вайны[19]. У час бамбёжкі быў разбураны будынак малаказавода. Людзі баяліся голаду, таму са склада малаказавода была разабрана гатовая прадукцыя. Калі немцы ўвайшлі ў вёску, яны пачалі хадзіць па дамах і патрабаваць вярнуць сыр і масла. Пры гэтым людзям пагражалі расстрэлам, таму амаль усе жыхары вёскі здалі прадукты фашыстам[ 27]. Становішча людзей на акупіраванай тэрыторыі ўскладнялася тым,што на пачатку акупацыі ў вёскі даволі часта выходзілі савецкія салдаты - акружэнцы.

Немцы  сурова каралі ўсіх, хто дапамагаў савецкім салдатам. Людзі баяліся тэрору, але пакінуць акружэнцаў без дапамогі таксама не хацелі. М.А. Булах успамінае*:" Недзе   на пачатку вайны, да нас прыйшлі тры салдаты, відаць, з акружэння, папрасілі паесці. А да Падсадніка Кліменція, нашага суседа, прыехалі на кані немцы. Мама дала салдатам хлеба і папрасіла іх хутчэй уцякаць да балота. Толькі яны паспелі ўцячы, як да нас прыйшлі немцы за яйкамі, маслам і хлебам. Я помню, як было страшна,бо калі б немцы засталі салдат у нас, то ўсім было б вельмі дрэнна. І немагчыма было нават уявіць,што было б,каб немцы спачатку зайшлі да нас"* [ 24].

Н.М. Падсаднік расказала, якое выйсце знайшлі людзі. Вечарам клалі прадукты ў кусты, што раслі пры дамах, ежу пакідалі і ў лазнях, свірнах. Раніцой, як правіла, нічога не знаходзілі [28].

На бабыніцкай зямлі, як і паўсюль, фашысцкія захопнікі вельмі жорстка абыходзіліся з палоннымі і акружэнцамі. Па сведчанні жыхаркі в. Жураўна, што па суседству з Бабынічамі, Н.Н. Кухарэнка , увосень 1941г. у гэту вёску немцы прывялі трох акружэнцаў – афіцэра, маладую дзяўчыну і салдата. У адной з хат іх доўга катавалі. Затым з хаты вынеслі акрываўленыя вілы і лавы, а праз нейкі час і залітыя крывёю трупы закатаваных. Іх закапалі на агародзе, адразу за хатай.

Неўзабаве пасля ўсталявання ў Бабынічах нямецкага гарнізона ў мястэчка вярнуліся двое мясцовых хлопцаў, што выйшлі з акружэння. Каб паходзіць на цывільных людзей, яны ўзялі на плечы косы. Але іх заўважыў адзін з жыхароў і выдаў немцам, што аказаліся паблізу. Абодва юнакі былі расстраляны літаральна за некалькі соцень метраў ад роднага дому [ 32].

Для насельніцтва былі ўведзены шматлікія падаткі. Сялянам даводзіліся нормы абавязковых натуральных паставак, якія дапаўняліся рознымі паборамі, рабаваннем. Кожны жыхар ва ўзросце ад 14 да 65 гадоў прыцягваўся да прымусовых работ на будаўніцтве абарончых аб’ектаў, аднаўлення мастоў і дарог.

Нямецкі гарнізон у Бабынічах мясціўся ў будынку школы, што быў збудаваны літаральна напярэдадні вайны. Школа размяшчалася за рэчкай Ганчароўка, і дарога да яе была дастаткова складанай. Фашысты прымусова выгналі людзей на будаўніцтва дарогі. Пясок для падсыпкі бралі з гары, на якоў некалі знаходзілася Мікалаеўская царква. Кожны працаздольны жыхар павінен быў адпрацаваць на будаўніцтве. Мужчынам неабходна было з’яўляцца з канём. Акрамя гэтага трэба было рэзаць лес, рамантаваць дарогі, рыць акопы. Апошні від работы быў асабліва працаёмкі, паколькі глыбіня акопа павінна была быць такой, каб салдат мог стаць у ім на ўвесь рост[ 30]

Акрамя падаткаў, фашысты ўвялі цэлы шэраг павіннасцей. Усю калгасную скаціну немцы адпраўлялі ў Германію. Часцей за ўсё стада гналі сваім ходам. Многіх маладых людзей фашысты прымушалі суправаджаць скаціну. Ісці трэба было пешшу. Так, С.І. Гарбаценка ўспамінала :*“Калі з’явіліся немцы, яны сталі забіраць скаціну. Так майго старэйшага брата Аляксандра адправілі ў Германію гнаць кароў”*[ 25]

Людзі ўвесь час знаходзіліся пад моцным псіхалагічным прэсам, што тлумачыўся страхам за жыццё, пагрозай голаду, адсутнасцю ўпэўненасці ў наступным дні.

**2 студзеня 1942 г**. карнікі знішчылі 108 яўрэяў, жыхароў мястэчка. Выратавацца не ўдалося нікому. Фашысцкая палітыка поўнага вынішчэння яўрэяў была ў нашым краі такой жа , як і ва ўсім свеце.

А было гэта так…

У канцы снежня ў Бабынічах з'явілася спецыяльная каманда немцаў. Усіх яўрэяў, 108 чалавек, сагналі ў два дамы, якія ўяўлялі сабой своеасаблівае гета. Тут людзей трымалі каля двух тыдняў.

2 студзеня 1942 г., раніцай, усіх выгналі з дамоў і пагналі па вуліцы ў накірунку да выхаду з вёскі ў бок Полацка. Па баках вуліцы стаялі людзі,бо вестка аб тым , што яўрэяў некуды гоняць, вельмі хутка абляцела вёску. Адна з дачок местачкоўца Шэрмана была замужам за пагранічнікам. Калі натоўп праходзіў па вуліцы, жонка Шэрмана звярталася да ўсіх з просьбай :
" Вазьміце Святлану, яна ж руская!" Так людзі, адчуваючы свой лёс, шукалі любую магчымасць паратунку. Калі сталі падымацца ўгору, ад натоўпу аддзяліўся Гірша Цырыхман, хлопчыку было 11 год, і яшчэ нехта з дзяцей. Але хлопчыкі не здолелі ўцячы, тут жа іх скасілі кулямётнай чаргой[26].

Многія былі вельмі моцна знясілены за той час, пакуль іх трымалі ў своеасаблівым гета. Пажылы Лейб Фінкельштэйн амаль нёс на сабе сваю жонку, настолькі слабай яна была. На гібель ішлі цэлыя сем'і. Так, у сям'і Герухман было чацвёра хлопцаў : Гірша, Эля , Топаз, Айзік. Самы старэйшы быў у арміі, ён застаўся жыў, астатнія ўсе загінулі разам з бацькамі.
Абутнік Хаім меў тры дачкі: Басю, Тэйбу, Лейку. Загінулі ўсе. Цалкам загінула сям'я Топаза Рухмана, жонка якога была закройшчыцай. У іх было двое сыноў - Айзік і Сойка. [ 32]

Сярод іншых была і сям'я Нохана Лейбы, у якой было трое дзяўчат. У сям'і Беленькіх было двое дзяцей – Зяма і Соня[32].У натоўпе ішла і Рыва Герцык са сваімі дзяцьмі. Яе мужам быў настаўнік-беларус. Яго прызвалі на вайну, і Рыва засталася з дзецьмі адна. Калі папаўзлі чуткі пра расстрэлы яўрэяў у Кублічах, Празароках, да Рывы прыйшла сястра мужа з Матырына і прапанавала аддаць ёй дзяцей. Рыва адказала : " Дзе буду я , там будуць і мае дзеці ", - і не згадзілася іх аддаць ятроўцы [ 32]

Перакладчыкам у нямецкім гарнізоне працаваў Іофэ. Яго не адпраўлялі ў гета, і таму ён спадзяваўся на лепшае. Але калі натоўп ужо схаваўся з вачэй, Іофэ таксама пасадзілі ў сані і павезлі ўслед за астатнімі.

Калі падышлі да Вусаўскіх могілак, што знаходзяцца на адлегласці прыкладна кіламетра ад Бабыніч, натоп павярнулі ўбок, далей ад дарогі, і загадалі людзям падняцца вышэй, на узгорак за могілкамі. Менавіта тут і пачаўся расстрэл. Людзей падводзілі да краю ямы, што была вырыта загадзя, і расстрэльвалі. Стралялі па аднаму на вачах у астатніх. Дзяцей вырывалі з

рук маці і таксама забівалі. Сведкі расказвалі, што Рыва Герцык усё імкнулася закрываць сабой дзяцей [ 32]

Так былі забіты ўсе. Адзін чалавек, той самы перакладчык Іофэ, быў толькі паранены. Вечарам ён апрытомнеў, выбраўся з-пад цел забітых і пайшоў у вёску. Іофэ накіраваўся у дом фельдшара Будзько , які жыў непадалёку ад бальніцы. На бяду няшчаснага чалавека, якраз там і вячэрала расстрэльная каманда. Будзько пазваў немцаў, Іофэ не паспеў нікуды ўцячы. Ён быў забіты тут жа , пад гарой. Яму было суджана загінуць двойчы.

Так трагічна скончылася багатая і цікавая яўрэйская гісторыя Бабыніч. Намаганнямі прадстаўнікоў гэтага народа , якія не адзялялі сябе ад іншых бабынян, вёска набыла статус мястэчка. Тут была створана важкая прамысловая база, існавала разгалінаваная сістэма абслугоўвання. Усё гэта было страчана . Пасля вайны яўрэі ў Бабынічах больш не сяліліся.

Дзеянні фашысцкіх захопнікаў выклікалі супраціўленне насельніцтва. На тэрыторыі Ветрынскага раёна дзейнічала партызанская брыгада імя Варашылава, утвораная ў снежні 1942 г. на базе атрадаў " Мсцівец" і " Смерць фашызму" [41, с.168].

У снежні 1942г. пачаў арганізоўвацца і атрад " За Радзіму", у склад якога ўваходзілі жыхары Бабыніцкага і Наўліцкага сельсаветаў (сёння адзін сельсавет – Бабыніцкі). Да лютага 1943 г. колькасць байцоў атрада дасягнула 56 чалавек. Камандаваў атрадам Маханькоў Антон Фёдаравіч. Начальнікам штаба з'яўляўся Сувораў К.В., затым Шэпін І.Р. Камісарам спачатку быў Мікалаеў М. Г., пасля яго гібелі Гайко У.Я.[41,с.169] Аднак яшчэ да афармлення атрада многія мужчыны збіралі зброю, каб скарыстаць яе для барацьбы. Ужо ў студзені 1942 г. немцы пачалі рэпрэсіі супраць цывільнага насельніцтва ў сувязі з гэтым. "*На Каляды 1942г. у нас быў вобыск. Аўдачонак Васіль данёс, што ў папы быццам ёсць зброя. Прыляцелі немцы, папу голага выгналі на вуліцу і паставілі пад акном з паднятымі ўгору рукамі. У хаце сталі ўсё перарываць. У скрыні мама хавала цукар, што вымяняла на крупы ў бежанцаў. Быў ён у кавалачках завернуты ў анучачку. Цукар забрашчаў, і немец думаў, што гэта патроны. Хаця ў нас нічога не знайшлі, бацьку ўсё роўна забралі. Данеслі таксама і на Карася ( старшыня калгаса),і немцы паехалі ў Наўліцу па яго. Да нас прыйшоў настаўнік Мікалай Усцінавіч і сказаў маме даць яму патроны, калі ёсць. Ён хацеў страляць у немцаў, калі тыя будуць вяртацца з Наўліцы з Карасём. Мама стала плакаць, гаварыць, што тады спаляць абедзве вёскі"*[28]

Калі партызанскія атрады аформіліся, многія мужчыны пачалі папаўняць шэрагі партызан. Аднак каб быць прынятым у атрад, неабходна было мець зброю. Яшчэ да вайны ў Фарынаве знаходзіўся склад зброі. У час бамбёжак

пачатковага перыяду вайны склад быў разгромлены. Менавіта там і знаходзілі для сябе зброю многія мужчыны.

*“Бацька і Карась сталі збіраць групу для адходу к партызанам. Сабралі 25 чалавек. Каб пайсці ў партызаны, абавязкова трэба было дабыць зброю. У Фарынаве былі савецкія склады. У пачатку вайны іх бамбілі, зброя была пашкоджаная, але мужчыны ўмелі чыніць. Так і бацька дастаў сабе вінтоўку. Калі бацька і Карась сабралі групу з 25 чалавек, іх узялі ў атрад”За Родину”. Штаб адзін час мясціўся ў Будзькаўшчыне. У старым панскім доме тут жылі і сем’і партызан. Нам было блізка, і мы з мамай жылі дома”*[28]

Нямецкі гарнізон у Бабынічах стаяў нядоўга. Пасля першых вылазак партызан немцы канчаткова размясціліся ў Ветрыне, дзе была ўзмоцненая ахова. Таму партызаны квартаравалі ў Бабынічах, Будзькаўшчыне. Месцам іх дыслакацыі ў Бабынічах спачатку была школа, а калі яе ў час бамбёжкі 1943г. разбамбілі, партызаны часткова мясціліся па ацалелых дамах, часткова – у будынку бальніцы. У Будзькаўшчыне да вайны была пагранзастава, якая размяшчалася ў старым панскім доме. Менавіта тут і стаялі партызаны.

Партызанскі рух на захопленых тэрыторыях быў бы немачымым без падтрымкі мясцовага насельніцтва, аб чым сведчаць і ўспаміны старажылаў. Сталаваліся партызаны па дамах вяскоўцаў. *”Партызаны па 2-4 чалавекі разыходзілася па хатах, мясцовыя жыхары павінны былі пакарміць іх. Мама гатавала заўсёды абед з улікам таго, што нехта можа зайсці. Елі партызаны тое, што і мы. Кожны дзень чамусьці прыходзілі розныя людзі”*
[ 25].

*“Мы ўсе ў вайну памагалі партызанам: вязалі рукавіцы, шылі адзенне. Бацька Ключонка Мірона быў партны, ён шыў партызанам кажухі. Немцы таксама загадвалі вязаць рукавіцы. Мама гаварыла мне вязаць немцам рукавіцы ў адну нітку, а партызанам ў дзве”*[ 28]

Уяўленне пра дзейнасць партызан на тэрыторыі Бабыніцкага сельсавета дае пісьмо камбрыга Дз.Цябута : *“ Атрады нашай партызанскай брыгады сталі грознай сілай у барацьбе супраць акупантаў. У баях і сутычках з немцамі нашы народныя мсціўцы знішчылі больш чатырох тысяч гітлераўцаў, узарвалі і скінулі пад аткос 29 варожых эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай, якія ішлі на фронт з Германіі, узарвалі 6 чыгуначных і да 25 шасейных мастоў,збілі двухматорны нямецкі самалёт,знішчылі танкеткі і 38 аўтамашын. Узарваны рэйкі і пашкоджана палатна на розных участках працягам каля 10 км, разгромлена чыгуначная станцыя, рад лесапільных заводаў…*

*Нашы падрыўнікі Андрэй Выркоўскі, Міхаіл Санько, Рыгор Лісоўскі, Анатолій Танічаў, Іван Лабоха пусцілі пад аткос па 5-7 воінскіх эшалонаў.На*

*іх баявых рахунках дзесяткі знішчаных фрыцаў. Больш сотні нямецкіх салдат і афіцэраў знішчыў са свайго кулямёта бясстрашны партызан Нікалай Кушняроў. Ён геройскі загінуў у баю, ва ўпор расстрэльваючы немцаў, ехаўшых на трох грузавых машынах. Заслужанай славай сярод партызан і насельніцтва, карыстаюцца мужныя партызаны, за баявыя подзвігі прадстаўленыя да ўрадавай узнагароды Антон Дубко, Жэнька Пяцюль, Пётр Забела, Уладзімір Сцежкін, Грыгорый Лоўкін і інш.”*[5]

Карціну супраціўлення фашысцкаму акупацыйнаму рэжыму дапаўняе сведчанне камандзіра атрада “ За Радзіму” У.А.Маханькова.

*“ Партизанский отряд « За Родину» был создан зимой 1942г. из маленькой группы патриотов Бабыничского сельсовета. В эту группу входили : Суворов Кирилл Викторович – начальник штаба отряда, Будько, Николаев, Забело, Дубко, Усов, Подсадник, Муравей и некоторые другие товарищи. На территории Ветринского района отряд занял посильную себе зону – несколько населённых пунктов, на которой сначала громил созданные оккупантами молокопункты, управы, группы полицейских, затем распространил свои действия на шоссейные и железную дорогу, разрушали и сжигали мосты, нарушали телеграфную связь.Первые боевые успехи окрыляли партизан, вдохновляли на более смелые операции. Группы стали выходить на дороги. Из засад громили фашистские обозы, срывали передвижение гитлеровских частей, защищали население от грабежей и уничтожения…*

*В начале 1943 г. в отряд прибыло много новых людей с окрестных деревень. С ростом отряда тяжело становилось с оружием, боеприпасами. Значительная часть партизан вооружались за счёт трофеев, за счёт оружия, оставленного на поле боя нашими солдатами.*

*Осенью 1943 г. мы получили значительное подкрепление оружием и боеприпасами из-за фронта…*

*В 1943 г. на партизанской зоне был выращен хороший урожай. В начале августа в немецкий гарнизон Ветрино прибыло дополнительно два батальона немцев численностью 1200 человек. Разведка донесла, что немцы намерены сорвать уборку урожая, ограбить население. Вечером 11 августа мы заняли оборону на наиболее вероятных направлениях. Утром 12 августа немцы заняли д. Навлица и двинулись на Гуры. Засада нашего отряда близко подпустила противника и завязался бой. За четыре дня боёв партизаны убили около ста немцев, уничтожили несколько повозок, миномёт и сбили транспортный самолёт противника. Мы потеряли трёх человек убитыми и восемь было ранено…*

*В августе 1943 г. на всех железных дорогах Беларуси партизаны провели*

*большую операцию по подрыву рельс и железнодорожных мостов. В ночь на третье августа вместе со всеми партизанами Беларуси бойцы нашего отряда вышли на железную дорогу Полоцк – Молодечно . За несколько часов было произведено 1200 взрывов. Было уничтожено около трёх тысяч рельс, и движение по железной дороге было прекращено на восемь дней. В 1943 – 1944 гг. эта операция повторялась неоднократно»*[16].

Дзеянні партызан і іх падтрымка мясцовым насельніцтвам выклікалі жорсткую рэакцыю акупантаў. У канцы жніўня 1942 г.групам гітлераўскіх армій была разаслана інструкцыя аб арганізацыі і дзеянні “ягдкаманд”, перад якімі была пастаўлена задача – змагацца супраць партызан і мірнага насельніцтва, якое ім дапамагае[41,с 117].

Фашысцкія каманды поўнасцю рэалізавалі гэтую ўстаноўку. Не стала выключэннем і бабыніцкая зямля. Тут былі знішчаны многія вёскі, некаторыя цалкам, асобныя – часткова. Масавыя рэпрэсіі прыйшліся на 1943 – 1944 гг.

*“Немцам даняслі, што з нашай вёскі многа партызан, і Гуры спалілі паліцаі з Наўліцы. Пасля мы жылі ў лесе ў зямлянцы. Мой хросны бацька, Любчык Якаў, выкапаў і сабе зямлянку, і нам з мамай”*[28]

Зімой 1943 г. у Бабынічах размяшчаўся партызанскі атрад “ За Радзіму”. У ранейшым будынку сельскага савета знаходзіўся штаб брыгады, у школе – партызаны. Вясной 1943г.вёску пачалі бамбіць фашысты. Самалёты прыляталі з Празарок. Здзяйсняліся па тры налёты за дзень, па 3-4 самалёты. Запальныя і разрыўныя бомбы ператварылі цэнтр вёскі у суцэльнае вогнішча. Згарэў будынак школы, дзе квартаравалі партызаны, акрамя гэтага ахвярамі агню сталі 32 дамы на цэнтральнай вуліцы вёскі.

Успаміны сведкаў тых страшных падзей аднаўляюць карціну знішчэння Бабыніч.

*“ Вясной 1943 г. на Бабынічы былі зроблены паветраныя налёты з аэрадрома ў Празароках. У гэты час я быў дзяжурным у штабе атрада. Самалёты кідалі запальныя бомбы, невялікія разрыўныя, стралялі з кулямётаў.Увесь цэнтр вёскі хутка заняўся агнём, здавалася, гарэла ўсё. Ніхто нічога не тушыў, гэта было небяспечна.Самалёты нацэльваліся на штаб, але ён застаўся цэлым. Самалёты прыляталі тры разы, але пасля першага налёту партызаны перамясціліся ў лес. Калі к вечару вярнуліся ў вёску, цэнтральнай часткі Бабыніч больш не існавала”*[33] [**Дадатак №4** ]

*“Вясной 1943 г., раніцай, пачаўся налёт. Колькі было самалётаў, не памятаю. Паколькі ногі ў мяне былі паломаныя, мяне вынеслі з дому на бераг возера. Калі першы налёт скончыўся, мяне загарнулі ў коўдру і павезлі ў Смолеўшчыну. Ехалі па палаючых Бабынічах, але дамы ніхто не тушыў, таму што яўрэяў ужо расстралялі і дамы іх пуставалі. Ад’ехаць далёка не ўдалося, бо пачаўся новы налёт. Самалёты ляцелі над самай дарогай. Адзін з*

*самалётаў пачаў сапраўднае паляванне за мной. Мусіць, лётчык падумаў, што на санках ляжыць паранены партызан. Ён пачаў страляць з кулямёта. Сястра схвалася пад мост, а я застаўся на дарозе. Зрабіўшы разварот, самалёт зноў пачаў атаку на мяне. Кулі лажылія побач, а я быў жывы. Затое асколкамі была паранена ў нагу сястра."*[29]

*" Была вясна, ужо раставаў снег. Нечакана з'явіліся самалёты. Маці нікога не выпускала з дому. праз вокны мы бачылі, як гарэў цэнтр Бабыніч. З будынку школы разбягаліся партызаны. На нашу хату таксама падалі запальныя бомбы і скачваліся з даху, паколькі ён быў крыты дранкай. Маці адкідвала запальныя бомбы, што не паспелі загарэцца. Самалёты лятаалі вельмі нізка. суседскі дом згарэў, бо дах у суседзяў быў саламяны. згарэў хлеў праз дарогу. Пасля налёту мы выехалі ў лясную вёску Блудавікі".*[35]

У 1943г. немцы знішчылі і іншыя вёскі сельсавета. Праз некалькі дзён пасля налёту на Бабынічы спалілі вёску Паддубы, дзе таксама стаялі партызаны. У 1943 г. была спалена вёска Старая Будзькаўшчына.

*" Па дарозе недалёка ад вёскі ішоў партызан. над ім вельмі нізка праляцеў нямецкі самалёт –вяртушка. Партызан выстраліў, але не трапіў ў лётчыка. Самалёт паляцеў, а праз нейкі час наляцелі карнікі і пачалі зганяць усіх жыхароў у былую панскую канюшню. Маладых здаровых жанчын аддзялілі асобна, адабраўшы ў іх дзяцей. Жанчын пагналі ў канцлагер, што знаходзіўся за 6 км. ад Будзькаўшчыны. Астатніх жыхароў вёскі, у тым ліку і дзяцей, спалілі.*

*Затым спалілі і саму вёску. У в. Новая Будзькаўшчына размясціўся карны атрад. Быў уведзены камендацкі час, пасля 18. 00 выходзіць на вуліцу забаранялася. Жыхары Новай Будзькаўшчыны сабралі астанкі людзей і пахавалі іх узбоч дарогі."*[36]

У студзені 1943 г. была спалена в. Баравыя, жыхары якой дапамагалі партызанам. Па сведчанні В.І. Селіванавай, сувязной партызанскага атрада " За Радзіму", мясцовы жыхар Дарафей Чарткоў данёс немцам, што баравенцы дапамагаюць партызанам. У гэтай мясцовасці на Каляды існаваў звычай пад назвай "жаніцьба Цярэшкі". У адзін з калядных вечароў моладзь" жаніла Цярэшку". Па дамах разышліся позна, а ўначы наляцелі карнікі. Жыхароў выгналі з дамоў, загналі ў вялікую калгасную адрыну і ўсіх спалілі[31]

У 1943 г. былі часткова знішчаны наступныя вёскі Бабыніцкага і Наўліцкага сельсаветаў: Замошша (май ) - 19 двароў з 44 мірнымі жыхарамі; Плігаўкі ( верасень) - 10 двароў; Забелле 1-ае і 2-ое (лістапад) – 36 двароў, 7ахвяр; Загацце ( верасень) – 11 двароў; Ухвішча (кастрычнік ) - 11 двароў , 21 чалавек. Акрамя гэтага ў лютым 1942 г. у в. Лесава быў спалены 21 дом з 24 і загінула 12 чалавек[4,с.152-155]

Так адрэагавалі фашысты на партызанскі супраціў акупантам толькі на тэрыторыі Бабыніцкага і Наўліцкага сельсаветаў.

Партызанскі рух у рэгіёне стаў прычынай масавай адпраўкі людзей у Германію. Масавая адпраўка ў Германію ў нашых мясцінах пачалася ў час блакады 1944 года. К гэтаму часу разгарнулася наступленне Чырвонай Арміі, і немцы баяліся, што пры адступленні партызаны створаць ім дадатковую небяспеку. Страх апынуцца ў акружэнні пры адступленні прымусіў немцаў пачаць буйную карную экспедыцыю супраць партызан.У раёне Ушач у акружэнне трапілі ўсе атрады брыгады імя Варашылава[42,с.73]. Паколькі асноўная частка партызан былі выхадцамі з Полацка-Лепельскай зоны, разам з партызанамі ў акружэнні апынуліся мірныя жыхары. Клопат пра блізкіх прымушаў партызан браць да сябе ў лес сямейнікаў: партызаны баяліся, што іх сем'і будуць пакараны. Менавіта гэтым тлумачыцца той факт, што сярод акружэнцаў было вельмі многа мясцовых жыхароў.

Партызанская блакада суправаджалася рэпрэсіямі супраць мірнага насельніцтва. Так, па ўспамінах сведкаў, пад рэпрэсіі трапілі вёскі Бабынічы, Рабчонкі, Шарагі, Лабэцкія, Вуглы, Жураўна, Баярова, Смолеўшчына, Ухвішча, Матырына, Саланевічы, Будзькаўшчына, Забелле, Замошша, Лесава, Мураўі і шматлікія хутары. Схема знішчэння была ўсюды аднолькавая. Гэтыя вёскі спачатку бамбілі, потым тут з'яўляліся немцы і пачыналі зганяць вяскоўцаў або ў лагеры, або ў асобны населены пункт, што размяшчаўся недалёка ад чыгункі. Так, лагеры, дзе нейкі час утрымлівалі людзей перад адпраўкай у Германію або знішчэннем, размяшчаліся ў вёсках Будзькаўшчына, Лесава, Ветрына. У лагерах і населеных пунктах ішла сарціроўка. Аддзялялі маладых, моцных, працаздольных. Лёс астатніх быў незайздросны. Звычайна ім суджана было гінуць у агні. Такі лёс спасціг жыхароў усіх вышэй пералічаных вёсак. Так, 85 жыхароў вёскі Рабчонкі, якія аказаліся непрыгоднымі для работы на карысць Германіі, былі спалены ў в. Шарагі, куды падчас блакады сагналі як жыхароў Рабчонак, так і насельнікаў навакольных хутароў[23]. Разлучанымі аказаліся многія сем'і. Вельмі малых дзяцей аддзялялі ад бацькоў, пакідалі таксама старых і нямоглых, каб знішчыць іх пасля таго, як працаздольных адпраўлялі далей. Вельмі часта рабілася гэта хутка, так што людзі бачылі дым і маглі зразумець, што адбывалася. Адабраных для адпраўкі зганялі ў Празарокі, дзе была чыгуначная станцыя.Успаміны сведкаў аднаўляюць многія старонкі тых трагічных падзей.

*“ Перад вайной я скончыла два класы. Помню вайну страшна. Наша зона была партызанская, мама варыла партызанам есці і пякла для іх хлеб. Калі ў 1944 г. пачалася блакада, Рабчонкі сталі бамбіць немцы. Мы хаваліся ў*

*кустах спачатку, а потым пайшлі ў Альховікі, дзе жылі нашы далёкія родзічы Бялевічы. Мы сядзелі ў іх склепе, а ў хляве Бялевічаў у саломе хаваліся чатыры партызаны. Нас уратавала тое, што немцы не сталі рыцца ў саломе і шукаць партызан, калі зайшлі на двор Бялевічаў. Нам немцы загадалі выйсці са склепа і падняць рукі. Нас разам з Бялевічамі пагналі спачатку на Вусаўшчыну, а затым павярнулі на Шарагі. Па дарозе да нас далучаліся іншыя людзі, якіх таксама гналі немцы з навакольных хутароў і вёсак.У Шарагах нас спачатку загналі ў пуню, а потым выгналі і сталі сарціраваць. Аддзялілі старых і зусім малых дзяцей. Маці прасілі не разлучаць іх з дзецьмі, але ніхто на іх просьбы не глядзеў. У Шарагах пакінулі малых і старых, іх усіх потым спалілі, мы бачылі дым. Нас пагналі ў Празарокі. Там пагрузілі ў таварныя вагоны, што вазілі скаціну, і павезлі ў Германію."* [34]

*" У час партызанскай блакады 1944г. наша сям'я хавалася ў Альховіках, гэта недалёка ад Рабчонак. Акрамя нас там у склепе хавалася яшчэ тры сям'і, усе з Рабчонак. У гэтым склепе нас і знайшлі немцы, калі пасля бамбёжкі пачалі прачосваць партызанскую зону. Адкрыліся дзверы, і мы пачулі каманду па -нямецку выходзіць. З намі быў наш сабака, ён кінуўся на немца, а той забіў яго. Нас гэта спужала, мы сталі моўчкі выходзіць, думалі, што і нас чакае такая смерць. Але нас усіх пагналі ў Гірсы, адтуль – у Празарокі, а затым у Шуты. Тут нас падзялілі. У мяне была старэйшая сястра Фрося. Яе муж Васіль быў у партызанах, ён загінуў. У іх было двое малых дзяцей, хлопчык і дзяўчынка, двух і васьмі год. Калі пачалася блакада, сястра з дзецьмі прыйшла да нас, хаваліся яны таксама разам з намі. Сястру з дзецьмі і нашага старога дзеда ад нас аддзялілі. Тата хацеў застацца з імі, бо не хацеў пакінуць іх адных, але немец так балюча яго ударыў, што тата адляцеў вельмі далёка, аж праз галаву перакуліўся. Тады мы яшчэ не ведалі, што не ўбачым іх болей, бо іх усіх спалілі Ў Шарагах разам з іншымі, каго не ўзялі ў Германію. У агні там згарэла сям'я майго дзядзькі па бацьку Прашковіча Зміtры. У яго было сямёра малых дзяцей"*[27]

*"Калі ў маі 1944г. пачалася блакада, нас сталі дужа часта бамбіць. Мы ўзялі карову і рушылі з мамай у Рабчонкі, бо там стаялі партызаны, мы спадзяваліся, што там будзе спакайней. Размясціліся мы разам з іншымі бежанцамі ў школе.*

*Раніцай мы прачнуліся ад разрываў, гэта немцы зноў пачалі бамбёжку. Я схапіла самае дарагое, што было ў мяне, – швейную машынку - і выскачыла на вуліцу. Як цяпер помню, як ляцелі бомбы і зямля падымалася ўверх. Ад страху я кінула машынку пад плот і пабегла назад у школу.Сястра таксама напалохалася. Яна насунула маміны чаравікі і лягла за камень – схавалася*

*так. Праз хвіліну яна таксама прыбегла назад. Мы хацелі паглядзець, дзе мама, бо як выскоквалі са школы – не помнім.*

*У суседнім класе спалі партызаны. Калі мы ўбеглі ізноў ў школу, то ўбачылі, што мама з братам на месцы, іх не пускалі партызаны выбегчы, бо баяліся, што немцы popstануць страляць па людзях. Яны звычайна так рабілі ў час блакады. Нас упусцілі назад, а выйсці таксама не дазволілі. Партызаны стаялі, засланіўшы сабой дзверы. Пасля бамбёжкі ўсе вырашылі разысціся па лесе. Мы з мамай рушылі назад у Запалле. Ісці трэба было праз балота, было вельмі мокра, мы проста танулі ў балоце. Час ад часу немцы зноў пачыналі бамбёжку, тады мы ўсёй сям'ёй хаваліся за адзін камень, каб загінуць усім разам. Калі падышлі да вёскі, убачылі , што там нікога няма. Дзверы ўсіх хат раскрыты. Каля вёскі ходзяць коні, некаторыя пад сёдламі, некаторыя без сёдзел. Раптам проста над нашымі галовамі сталі ляцець кулі. Мы пачулі каманду падняць рукі ўгору. Гаварылі па-руску. Гэта былі латышы. Яны былі ў карнай камандзе. Адзін з іх сказаў, што ўсіх з Запалля сагналі ў Ляпейкі. Нас жа пагналі ў Целяшы. Падвялі да склепа . Там мы ўбачылі дзядзьку – мамінага брата. У яго былі звязаны рукі і закручаны назад. Дзядзька быў са сваёй сям'ёй. Была там і яшчэ адна жанчына.*

*Назаўтра падагналі тры падводы. Мы маглі б памясціцца і на адной, але нас злавілі паасобку, таму і вязлі так. Мама вельмі хацела піць, але латыш нават не даў папіць ёй вады.*

*Нас прыгналі ў Празарокі. Там на плошчы мы ўбачылі многа пабітых людзей. Сярод іх хадзілі латышы і штурхалі нагамі пад жываты, мусіць, шукалі жывых. Я сказала маме, што і нам гэта будзе. Хутка прыйшоў нейкі тоўсты чалавек у ваенным адзенні і загадаў везці нас далей. Нас прывезлі ў Шуты. Там было вельмі многа людзей. Начавалі мы скопам, было цесна, людзі ляжалі плотна. Дзеці плакалі, прасілі есці і піць. Мне есці не хацелася.*

*Раніцай нас сталі сарціраваць. Палажылі доўгую жардзіну і сталі адных ставіць па адзін яе бок, другіх – па другі. На адзін бок ставілі маладых жанчын, калі ў іх былі большыя дзеці, адзінокіх, працаздольных мужчын. На другі трапілі жанчыны з малымі дзецьмі, старыя людзі. Тут разлучылі многія сем'і. Мы не ведалі, што з імі стала, пакуль не вярнуліся з Германіі. Усіх іх спалілі ў Шарагах. З адных толькі Рабчонак было 85 чалавек. Нас, Богу дзякаваць, не разлучылі. Усіх адабраных для Германіі паставілі ў шарэнгі па чатыры чалавекі і пагналі да крытых машын. На машынах нас давезлі да Зябкаў. Ноч мы пераначавалі ў бараку.Чуткі пра тое, што людзей павязуць у Германію, разляталіся вельмі хутка. Пачалі прыходзіць людзі і прасіць аддаць сваіх родзічаў. Некаторым шанцавала, іх аддавалі. За намі прыйсці не было каму."*[35]

*“ З 1934 года я пачала працаваць у калгасе, мне было тады 12 год. Старалася рабіць нараўне з дарослымі, жала па 50 сотак жыта за дзень, нават прэмію зарабляла. Рвала лён таксама старанна, каб не адстаць ад дарослых. Днём рвалі, а ўночы малацілі ўручную, цапамі. Без бацькі нам было цяжка.У вайну стала памагаць партызанам. Насіла запіскі з аднаго атрада ў другі. Партызаны стаялі па хатах, немцаў жа тут у нас не было, дык трэба было ім есці варыць, памыць бялізну.*

*Калі пачалася блакада ў маі 1944 года, мы ўсёй сям’ёй хаваліся ў лесе ад бамбёжкі і немцаў. У лесе мы правялі тры дні – з першага мая па чацвёртага. Затым партызаны загадалі выходзіць з лесу, каб хоць нехта застаўся жыць. Мы вярнуліся ў Барбарова. Коней з павозкамі паставілі ля склепа, а самі хаваліся ў склепе. Днём прыйшлі шасцёра немцаў, сталі ўсіх выганяць. Мама ў гэты час адышла, брат уцёк сказаць ёй, што немцы ўжо прышлі. Маме загадалі ўзяць з сабой карову , яна пайшла па карову, а нас у гэты час пагналі ў Гірсы. Так мы з сястрой аказаліся ўдвух. Мы вельмі плакалі, баяліся за маму і за сябе. Нас гналі полем каля Руднікаў. Побач з вёскай там былі польскія склепы, сюды нас і загналі. Людзей было вельмі многа.Многіх ад страху праняў панос, але выйсці нам не давалі, таму людзі павінны былі спраўляць надабнасць каля дзвярэй.*

*Раніцой нас пачалі сарціраваць. Адлучалі старых і малых. Многім сем’ям прыйшлося разлучыцца тут, тады мы яшчэ не ведалі, што навек.Мы з сястрой вельмі баяліся за маму, бо не ведалі, дзе яны з братам і што з імі.*

*Усіх маладзейшых і мацнейшых пагналі ў Зябкі, там мы і начавалі ў панскім свірне. Мы ўсё плакалі па маме.У ахове быў ліцвяк, ён сказаў, што адпусціць нас з братам, не будзе падымаць паніку, пакуль мы не адыдзем, але я не ведала, куды ісці. Раніцай нас пагрузілі ў поезд, сюды ж трапілі і мама з братам, але мы гэтага не ведалі.Калі пачалі пагрузку, то некаторых людзей адпускалі, калі знаходзіўся нехта з радні ці знаёмых, хто мог бы забраць ці паручыцца за чалавека. У Зябках жыў мамін брат, ён працаваў на чыгунцы. Калі ён даведаўся пра нас, прыйшоў, каб забраць, але крыху спазніўся – поезд ужо адправіўся. Так пачаўся наш шлях у Германію.”[31]*

*“ 1943-1944 гады былі самымі складанымі для нашай сям’і.Усіх жыхароў нашай мясцовасці сагналі ў лагер у Саланевічы. Адбіралі працаздольных людзей, каб адправіць у Германію.Старэйшых адлучылі і адправілі ў Глыбачку. Нас,непаўнагадовых, адправілі ў Багушова рыць акопы. Неабходна было за дзень выкапаць траншэю даўжынёй 4 метры і глыбінёй такой, каб нямецкі салдат мог схавацца з галавою.Такую работу неабходна было зрабіць усім, толькі потым нам давалі есці адзін раз у суткі. Ежа была такая:маленькая буханка хлеба на траіх, банка кансерваў і суп, які вельмі дрэнна пах. Елі,бо трэба было выжываць. Немцы,якія назіралі за намі, былі*

*розныя: адны строгія, другія не вельмі. Казалі так: "arbeiten, але памалу". Жылі мы ў бараку. Акопы капалі ў бок Забелля. Так працавалі прыкладна два месяцы. Да немцаў дайшлі чуткі аб тым, што яны нясуць шмат страт, і да нас сталі адносіцца крыху па-іншаму, не так строга. Пасля Саланевіч адправілі нас у бок Зябак на цягнік, каб адправіць у Германію."*[24]

Падобны лёс спасціг і жыхароў в. Баярова, суседняй з Бабынічамі. Падчас блакады мясцовых жыхароў сагналі ў лагер в. Будзькаўшчына. Непрыгодных для работы пакінулі ў Баярове. У вялікі хлеў, што стаяў на ўскрайку вёскі , зганялі палонных акружэнцаў, сярод іх было многа жанчын і дзяцей - сем'і партызан. Уночы іх спалілі. Усяго ў агні загінула болей двухсот чалавек.

*"У маі 1944 была блакада партызанскай зоны. У адзін дзень у Баярова прыгналі партызан ( адзін з іх быў паранены ) і бежанцаў, якіх злавілі ў лесе. Закрылі ў хаце Доньчыхі на ўскрайку вёскі. Туды загналі і баяроўскіх мужчын , сярод якіх быў мой бацька Агапончык Фрол. Помню яшчэ , што там былі і Кулак Кузьма і Прашковіч Антон.*

*На другі дзень з Будзькаўшчыны прыехаў конны немец і прывёз нейкі загад, пасля чаго ўсіх закрытых у доме і ўсіх вяскоўцаў пагналі ў Будзькаўшчыну. Разам з людзьмі гналі і скаціну, людзям дазволілі ўзяць невялікія пажыткі. Размясцілі нас у хляве за рэчкай. Тут памёр паранены партызын. У вёсцы было многа народу , шмат жывёлы. Недахопу ў ежы не было. Дні праз два – тры мы ўбачылі слуп дыму над нашай роднай вёскай. У той жа дзень мы даведаліся, што ў Баярове спалілі новую партыю партызан і бежанцаў, якіх вылавілі ў лесе. Палілі ў двух хлявах, што стаялі праз дарогу. Спачатку хлявы ўзарвалі, пасля спалілі. Яшчэ праз колькі дзён усіх маладых хлопцаў і дзяўчат прымусілі гнаць жывёлу ва Ушачы, затым у Лепель. Па дарозе сустракаліся спаленыя вёскі , забітыя людзі."*[ 22]

Лагер у Будзькаўшчыне таксама напаткаў трагічны лёс. Тут , як і ў іншых вёсках, усё ішло па адпрацаваным сцэнарыі. Людзей сарціравалі, раздзяляючы дзяцей і бацькоў, блізкіх і сваякоў. Працаздольных з гэтага лагера гналі спачатку ў Ветрыны, дзе была чыгуначная станцыя, а потым пачынаўся іх шлях у Германію.

Такім чынам, схема адпраўкі людзей з нашай мясцовасці ў Германію тыповая. Спачатку - выгнанне з вёсак, лагер або сарціровачны пункт, затым адпраўка ў Германію ў таварным вагоне. А там у кожнага быў свой лёс і ў той жа час лёс большасці з вязняў можна ў нейкай ступені назваць тыповым: голад, холад, нястача, адсутнасць чалавечых умоў жыцця, цяжкая, знясільваючая праца. Нядольных служыць на карысць вялікай Германіі чакаў прыкладна аднолькавы лёс. Як правіла, іх спальвалі.

У якасці ахвяр на помніку, установленым на месцы трагедыі ў в. Будзькаўшчына , значыцца каля ста чалавек. Жыхароў в. Зенькава лікам 120 чалавек спалі разам з вёскай, папярэдне адзяліўшы рабочую сілу для адпраўкі ў Нямеччыну. У в. Забелле знішчана болей за сто чалавек, як акружэнцаў, так і мясцовых жыхароў. У брацкай магіле в.Жураўна пакоіцца больш двухсот чалавек акружэнцаў і мясцовых жыхароў.Падчас блакады была спалена в.Паметнікі, аднак жыхары вёскі ў ўцалелі. (**Дадатак№10**)

Ад больш маштабных разбурэнняў і ахвяр людзей уратаваў прыход Чырвонай Арміі, што пачала вызваленне Полаччыны.

**Бабынічы былі вызвалены** ад нямецка – фашысцкіх захопнікаў **29 чэрвеня 1944г. [ 4]**

Пачаўся перыяд пасляваеннага аднаўлення і будаўніцтва, хаця многае з таго, што існавала ў Бабынічах да вайны, было страчана назаўсёды. У першую чаргу – людзі. У час вайны ,акрамя 108 знішчаных яўрэяў, загінула яшчэ 26 чалавек, партызан і вяскоўцаў, падчас партызанскай блакады 1944 г.. З фронту не вярнуліся 12 чалавек, 34 былі сагнаны ў Германію і вярнуліся хворымі і душэўна траўмаванымі.

Пасля вайны ўжо не ўдалося аднавіць работу вапнавага і малочнага заводаў, майстэрань, ваўначоскі. Былі разбураны ці згарэлі шматлікія будынкі, як грамадскага назначэння, так і дамы вяскоўцаў.

У пасляваенны час вёска была адбудавана, але Бабынічы страцілі статус мястэчка.

**У 1944г**. аднавілі работу сельсавет, школа, магазін, аптэка, аддзяленне сувязі, тэлефонная станцыя, бальніца з радзільным домам. Пасля заканчэння вайны ў Бабынічы вярнуўся доктар Пэтлух, намаганнямі якога бальніца ў даваенны час значна ўзмацніла матэрыяльную базу. Менавіта яго намаганнямі пры бальніцы быў адкрыты радзільны дом і аптэка. Але доктар не здолеў жыць і працаваць там, дзе былі знішчаны ўсе яго прадстаўнікі яго народа, і таму ён пакінуў Бабынічы.

Па заканчэнні вайны была адноўлена работа калгаса імя Мялешкі. Пасляваенны час быў надзвычай цяжкім для вяскоўцаў. Людзям прыходзілася літаральна па кроплях аднаўляць гаспадарку. З работу ў калгасе не было чым плаціць, і людзі працавалі на “ працадні”, калі брыгадзір адзначаў адпрацаваны дзень палачкай у разліку на атрыманне на працадні зерня, сена для скаціны. Вяскоўцам не выдавалі паспартоў і так прымацавалі іх да зямлі, не даўшы магчымасці паехаць на працу ў горад.

Хаця ўмовы жыцця і працы нельга было назваць добрымі, людзі працавалі самааддана і шчыра. У першае пасляваеннае дзесяцігоддзе ў Бабынічах вядзецца будаўніцтва аб’ектаў сельскагаспадарчай вытворчасці: пабудаваны тры фермы для буйной рагатай жывёлы, зернясховішча і зерняток,

механічная майстэрня, ветэрэнарная лячэбніца. Калгас спецыялізаваўся на вырошчванні бульбы, ільну, збожжавых культур, вытворчасці мяса і малака. Кіраваў калгасам спачатку Пазняк І.М. Затым яго змяніў на гэтай пасадзе дэмабілізаваны з войска Аўсеенка М.С. , які атрымаў назначэне на працу ў Бабынічы з Дубровенскага раёна. Калі Міхаіл Сямёнавіч перайшоў працаваць настаўнікам у школу, пасаду старшыні калгаса заняў Каркач Арсеній Васільевіч.

У 60-дзесятых гадах пачынаецца ўзбуйненне калгасаў, раёнаў, абласцей. З **1953 па1960 гг**. Бабынічы ў Ветрынскім раёне Полацкай вобласці, пасля скасавання яе ў студзені 1954 г. у Віцебскай вобласці, **з 1960г.** – у Ушачскім раёне. **У 1962 г**. тэрыторыя Бабыніцкага сельсавета адышла да Полацкага раёна[4]

Палітыка ўтрымання вяскоўцаў на зямлі дала свой плён. **На 01. 01 1968г.** у Бабынічах было 56 двароў, 162 жыхары. Аднак цяжкія ўмовы жыцця і працы на зямлі не спрыялі прыросту насельніцтва, акрамя таго ў час вайны загінула вялікая колькасць мужчынскага насельніцтва, што таксама адмоўна адбілася на колькасці насельніцтва. Ды і дзяржаўная палітыка ў адносінах да вёскі была непрадуманай: закрываліся аб'екты абслугоўвання. Так, у **1970г**. у Бабынічах была закрыта бальніца, перастаў функцыяваць радзільны дом. На базе бальніцы быў разгорнуты ФАП. Тэлефонная станцыя таксама спыніла работу. Усё вышэй пералічанае не садзейнічала павелічэнню колькасці насельніцтва, таму на **01. 01 1979г**. у вёсцы налічваецца 60 двароў, а колькасць жыхароў у параўнанні з перапісам 1968г. зменшылася на 12 чалавек , адпаведна 150 і 162 ( паводле перапісу )

**Канец 70-дзесятых, пачатак 80-ых гг**. пазнчаны ажыўленнем вясковага жыцця. У 1979г. у вёсцы пабудаваны і здадзены для эксплуатацыі першы шматкватэрны дом на восем сямей, дзяцічы сад. Працуе КПП з майстэрняй па пашыву адзення, аддзяленне збербанка, паштовае аддзяленне, ФАП, ветлячэбніца. У 1976г. узведзены будынак сельскага клуба . Значна ўмацавана і пашырана матэрыяльна – тэхнічная база калгаснай гаспадаркі. Вядзецца будаўніцтва новых жылых дамоў. У 1979 годзе ў вёсцы адкрыты дзіцячы садок, які значна аблегчыць жыццё многім жанчынам – працаўніцам. Усё гэта значна ажывіла жыццё Бабынічаў, садзейнічала замацаванню спецыялістаў, што прыязджалі на працу па размеркаванні. Вынікі такой

палітыкі не замарудзілі адбіцца на прыросце насельніцтва. Так, па стане перапісу на **01.01. 1990г. у Бабынічах 250** жыхароў**, 86** двароў, на **1995г. у** Бабынічах значыцца **98 двароў, 271 жыхар.**

За наступнае дзесяцігоддзе былі пабудаваны яшчэ тры шматкватэрныя дамы, дзве новых вуліцы з фінскіх і блочных дамоў, пяць катэджаў на дзве

сям'і. На вёсцы былі нядрэнныя ўмовы для жыцця і работы, аб чым ізноў жа сведчаць вынікі перапісу **на 01.01. 2005 г.: 109 двароў, 262 жыхары.** [40]

Агульныя крызісныя з'явы пачатку новага стагоддзя адбіліся і на жыцці Бабыніч. З канца 90-ых гг.20 ст.у вёсцы не вядзецца будаўніцтва дзяржаўнага жылля. Апошнім здадзеным у эксплуатацыю аб'ектам быў новы будынак школы, які пачаў функцыяніраваць з лістапада 1989г.

Калі ў канцы **90-ых гг**. пачалося чарговае ўзбуйненне сельскіх гаспадарак, калгас імя Мялешкі быў аб'яднаны з калгасам " Новае жыццё". Пасаду старшыні заняў Ізраілян А.А. Новаўтвораная гаспадарка спецыялізавалася на мяса-малочнай вытврчасці і раслінаводстве. Функцыянавалі тры брыгады: Ухвішча( цэнтр былога калгаса " Новае жыццё"), Бабынічы ( цэнтр калгаса іямя Мялешка) і Саланевічы ( брыгада старога калгаса імя Мялешка). Брыгада Ухвішча спецыялізавалася на свінагадоўлі, Саланевічы былі цэнтрам гадоўлі буйной рагатай скаціны, у Бабынічах працавала майстэрня, ферма па адкорму бычкоў, малочна – таварная ферма.Як перадавікі вытворчасці ў гэты час адзначаюцца механізатары В.І.Асташкевіч і Р.П. Мініцкі, цялятніца Л.А. Змітрачэнка, даяркі М.С. Белавусава, В.А. Якімовіч, М.М. Лагош, брыгадзір А.А. Ермаловіч.



У бабыніцкіх садах. *Фота В. Шугалея*

# Людзі бабыніцкай зямлі

У нашай мясцовасці здаўна жылі прадстаўнікі старажытных шляхецкіх беларускіх родаў: Корсакі, Селядзеўскія, Журавенскія, Прыляскоўскія, Бардзілоўскія, Судзілоўскія, Тамашэвічы, Шырыны.

Яны пакінулі пра сябе памяць, што жыве ў мясцовых назвах: Жураўна, Селядзеўшчына, Саланевічы; у памяці продкаў, у падмурках былых маёнткаў, у культурнай і гістарычнай спадчыне.

Сярод тых, хто прынёс гонар нашым мясцінам, славуты спадзвіжнік на гонях беларускай выдавецкай справы і ўсёй беларускай культуры пачатку XX стагоддзя прафесар **Браніслаў Эпімах-Шыпіла**. Нарадзіўся ён у фальварку Будзькаўшчына, што ў сямі кіламетрах ад Бабыніч, у сям’і дробнага шляхціца.

На працягу 42 гадоў Эпімах-Шыпіла збіраў фальклор, творы ананімных аўтараў (пераважна з родных мясцінаў на Віцебшчыне), якія склалі змест унікальнай у гісторыі беларускай літаратуры кнігі – рукапіснай “Беларускай хрэстаматыі”.

Прафесар адыгрываў выключную ролю ў дзейнасці выдавецкай суполкі “Загляне сонца і ў наша аконца”, што мясцілася ў яго кватэры на чацвёртай лініі Васільеўскага вострава ў Пецярбургу. Вучоны стаў хросным бацькам практычна ўсіх беларускіх пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя. Дзякуючы яму сталі вядомымі вершы іншых нашых славутых землякоў: Фелікса Тапчэўскага і І. Тамашэвіча, што стаялі ля вытокаў беларускай літаратуры.

У знак пашаны і павагі да славутага земляка пастаўлена мемарыяльная дошка каля Бабыніцкай сярэдняй школы.




*Фота А. Зайцавай*

Увагі заслугоўвае той факт, што Фелікс Тапчэўскі - беларускі паэт-дэмакрат - нарадзіўся ў 1838 годзе ў фальварку Лесава (зараз аднаіменная

вёска Бабыніцкага Сельскага савета. Скончыў Лепельскае павятовае дваранскае вучылішча, працаваў у Віцебскім земскім судзе. У 1864 арыштаваны за ўдзел у паўстанні Каліноўскага. Пасля арышту Тапчэўскі не вярнуўся на работу ў Віцебск, а стаў жыць і працаваць у маёнтку пані Івашэўскай у Ухвішчы, зусім побач з Бабынічамі. У Ухвішчы быў касцёл, куды кожную нядзелю з'язджалася на імшу мясцовая шляхта. Традыцыі шляхецкага гасцявання агульнавядомыя, таму сустрэча названых асоб магла адбыцца ў маёнтку пані. Цалкам верагодна, што **І. Тамашэвіч**, творы якога Эпімах-Шыпіла ўключыў у сваю "Беларускую хрэстаматыю" разам з вершамі Тапчэўскага, належыць да знакамітага роду Тамашэвічаў, якім у свой час належылі Бабынічы, Саланевічы, Будзькаўшчына, Мар'янполле (вёска у ваколіцах Бабыніч).

Эпімах – Шыпіла мог пазнаёміцца з абодвума падчас візітаў да пані Івашэўскай, у маёнтак якой , па ўспамінах старажылаў, кожную нядзелю пасля заканчэння службы ў касцёле з'язджалася шляхта з навакольных маёнткаў.

Сядзіба Івашэўскіх была сапраўдным прытулкам муз: малодшая дачка пані – Эльвіра- вучылася ў Парыжы і адтуль прывозіла сталічны шык. Старэйшая цудоўна іграла на фартэпіяна [30]

Безумоўна, тут панавала атмасфера творчасці, што было надзвычай спрыяльна для Тапчэўскага. Тут ён павінен быў адчуваць сябе ў сваёй стыхіі, што не магло не адбіцца на яго творчасці. Хутчэй за ўсё, ў " Хрэстаматыю…" трапілі далёка не ўсе вершы Тапчэўскага.

Як бы там ні было, паэзія Тапчэўскага – арыгінальная старонка беларускай літаратуры канца XIX стагоддзя. Сам творца – адзін з першых паэтаў-гуманістаў. Ліра былога паўстанца служыла ўзвелічэнню чалавечай годнасці простага чалавека, мужыка, праслаўленню яго таленавітасці.

Пісаў Тапчэўскі пад псеўданімам Хвэлька з Рукшэніц і Юрка. Вядомы чатыры яго творы: "Вечарына", "Саўсім не тое, што было", "Грошы і праца", "Ён і яна", што ў рукапісах хадзілі па Віцебшчыне.

Памёр паэт 17 снежня 1982 года, маючы 54 гады. Пахаваны на сельскіх могілках у вёсцы Глыбачка, дзе жыла яго сям'я [30]

Яшчэ адзін наш знакаміты зямляк – заслужаны пілот СССР **Павел Пятровіч Маскаленка**. Нарадзіўся ён у зусім іншы час, час і стварыў яму біяграфію. Яна была тыповай для свайго часу.

Ён вучыўся ў Бабыніцкай сярэдняй школе, быў адным з першых піянераў. Сям'я рана страціла кармільца, таму маці звярнулася з просьбай у валрэўвыканкам дапамагчы з уладкаваннем сына на працу. Так Павел

Пятровіч трапляе ў ФЗУ. У 1927 годзе юнак паступіў у камсамол. "Асноўнай задачай камсамольцаў было авалоданне ведамі", - пісаў Маскаленка ў пісьме да вучняў Бабыніцкай школы. Сам ён таксама вучыцца. Пасля ФЗУ, у 1930 – 1931 гады, была вучоба ў Сталінградскай ваеннай школе лётчыкаў. Пасля яе заканчэння - работа ў авіяцыі. У фінскую вайну быў на фронце. У час Вялікай Айчынай вайны ваяваў на розных франтах. Удзельнічаў у вызваленні Віцебска, Полацка.

Пасля вызвалення Бабыніч Павел Пятровіч зрабіў пасадку на маленькім самалёце ў вёсцы Лесава, дзе сустрэўся са знаёмымі, сябрамі і вельмі быў здзіўлены памерамі разбурэння ў родных мясцінах.

У пасляваенны час лятаў палярным лётчыкам, удзельнічаў амаль ва ўсіх экспедыцыях на Паўночны полюс, быў у Антарктыдзе. П. Маскаленка мае дванаццаць урадавых узнагарод, сярод іх – тры ордэны Леніна.



П. Маскаленка атрымоўвае ордэн Леніна з рук Л.І. Брэжнева.
Фота з фонду школьнага музея

З роднымі мясцінамі П.П. Маскаленка ніколі не траціў сувязі. Прыязджаў да сваякоў, бываў у роднай школе, ладзіў сустрэчы з вучнямі і настаўнікамі, дасылаў лісты краязнаўцам, падарыў роднай школе альбом, у якім знайшлі адлюстраванне старонкі яго біяграфіі у якасці лётчыка-палярніка.

Слаўны баявы шлях прайшоў у гады Вялікай Айчыннай вайны лётчык **Мікалай Георгіевіч Падсаднік**. Ён нарадзіўся 01.01.1922 года ў вёсцы Вуглы Бабыніцкага Сельсавета Полацкага раёна. Вучыўся ў Бабыніцкай сямігодцы.

У жніўні 1940 года М.Г. Падсаднік быў прыняты курсантам у авіяцыйнае вучылішча імя Чкалава. Пасля заканчэння яго ў 1942 годзе ў званні малодшага лейтэнанта ўдасканальваў баявую вывучку ў вучэбна-трэніровачных авіяпалках па баявому прымяненню самалёта ІЛ – 2. У маі 1943 года прыбыў на 1-ы Украінскі фронт у 165-ы гвардзейскі штурмавы авіяцыйны полк. За час вайны зрабіў 106 вылетаў. Удзельнічаў у вызваленні Кіева, Львова, Кішынёва, Ясы, Шапятоўкі, Югаславіі і ў разгроме нямецка-фашысцкіх войск на тэрыторыі Румыніі, Венгрыі і Аўстрыі.

К канцу вайны М.Г. Падсаднік камандаваў звяном штурмавікоў. За актыўныя баявыя дзеянні, адвагу і мужнасць мае 16 падзяк ад Вярхоўнага камандавання і ўзнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцягу, ордэнам Айчыннай вайны 2-й ступені, трыма медалямі.Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 18 жніўня 1945 года слаўнаму лётчыку за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза з уручэннем ордэна Леніна і медаля “Залатая Зорка”.Пасля вайны Мікалай Георгіевіч Падсаднік знаходзіўся на партыйнай, прафсаюзнай і адміністрацыйнай рабоце. У 1959 годзе скончыў Маскоўскую вышэйшую школу прафсаюзнага руху. Працаваў начальнікам аддзела кадраў інстытута “Аргтрансбуд” Міністэрства транспартнага будаўніцтва СССР і жыў у Маскве.



*М.Г. Падсаднік. Ксеракопія газетнага фота.*

Больш поўна асобу нашага знакамітага земляка раскрываюць успаміны яго сучаснікаў.

***З успамінаў В.І. Ліхачова, Гвардыі маёра запасу***

… Напярэдадні 26-й гадавіны Вялікага Кастрычніка – 6 лістапада 1943 года – 8 штурмавікоў “ІЛ - 2” узялі курс на Жытомірскую шашу. Вядучы групы – гвардыі лейтэнант М.Г. Падсаднік. У хуткім часе лётчыкі ўбачылі скапленне

войскаў ворага. Гітлераўцы, якія адступілі, трапіўшы ў акружэнне, спрабавалі прарвацца з яго. Дагнаўшы ворага, група Падсадніка нанесла па немцах раптоўны ўдар. У пяць заходаў савецкія “лятаючыя танкі” “прасавалі” гітлераўцаў, знішчаючы іх жывую сілу і тэхніку.

Аднойчы, гэта было 15 мая 1944 года, група савецкіх самалётаў “ІЛ - 2” пад камандаваннем М.Г. Падсадніка выйшла на баявое заданне. Перад вылетам
камандзір сказаў Падсадніку: “Ну, лейтэнант, ад цябе і тваёй групы залежыць поспех наступлення пяхоты на нашым участку. Задача – знішчыць фашысцкую калону танкаў. Браня павінна гарэць!”

Па дадзеных разведкі, немцы сканцэнтроўвалі танкі ў раёне Падліпцэ-Трасцянец, выцягвалі іх у калону,намерваючыся нечакана выйсці ў фланг нашым часцям, якія наступалі.

Дажджлівае надвор’е не спрыяла. Адлегласць між зямлёй і воблакамі – 200 метраў. Па інструкцыі бомбакіданне дапушчальна з вышыні не ніжэй за 400 метраў. Але вайна ўносіла свае карэктывы… У складаных умовах, праявіўшы высокае майстэрства і мужнасць, М.Г. Падсаднік вывеў 12 штурмавікоў у зададзены раён і дзёрзка атакаваў нямецкую танкавую калону.

- Заходзіць у хвост калоны! – скамандаваў Падсаднік.

Савецкія штурмавікі з брыючага палёту ўдарылі па танках рэактыўнымі снарадамі.

- Гараць, д’яблы! – радасна ўскрыкнуў Падсаднік. – Не шкадаваць боепрыпасаў, хлопцы!

Калі пайшлі на другі заход, было бачна, як нямецкія танкісты беглі прэч ад дарогі, на якой гарэлі танкі. Штурмавікі бязлітасна знішчалі фашыстаў.
Задума ворагаў была сарвана.

22 верасня 1944 года з аэрадрому ўзняліся на баявое заданне 2 штурмавікі “ІЛ - 2”. І ў гэты раз вядучым быў М.Г. Падсаднік. Задача была не з лёгкіх: у тыле ворага разведаць раён, дзе былі сабраны нямецкія войскі. Калі падыходзілі да зададзенага аб’екта, Падсаднік убачыў чатыры нямецкія “месершміты”. Скамандаваў:

- Манеўр і агонь па “месерах”!

Ведучы хуткацечны паветраны бой, Падсаднік памятаў пра галоўнае баявое заданне : разведаць указаны яму раён. Атакі варожых знішчальнікаў былі адбіты і загад выкананы. Калі апрацавалі дадзеныя авіяразведкі, камандзір сказаў:

- Работа выдатная! Прадстаўляю да ўзнагароды.

Камандуючы 2-й паветранай арміяй узнагародзіў гвардыі лейтэнанта М.Г.Падсадніка ордэнам Чырвонага Сцяга.

Надоўга ў памяці Падсадніка захавалася баявое заданне, якое ён выконваў на поўначы Югаславіі. Тады савецкія войскі з ходу фарсіравалі Дунай і спыніліся на плацдарме.

Вораг любой цаной імкнуўся скінуць нашы войскі з плацдарма, паколькі стваралася пагроза акружэння Будапешта з поўдня. Па адзінаму каменнаму масту праз Драбу з горада Асіека вораг кінуў вялікія сілы пяхоты і тэхнікі. Трэба было, чаго б гэта ні каштавала, знішчыць мост. Нямецкае камандаванне, разумеючы важнасць стратэгічнага назначэння маста, узмоцнена прыкрывала яго ад нашай авіяцыі шчыльным агнём зенітных батарэй і вялікай групай знішчальнікаў.

Знішчыць мост! – такая задача была пастаўлена перад лётчыкамі 165-га гвардзейскага штурмавога авіяпалка.Першыя спробы нашых лётчыкаў прарвацца да маста не мелі поспеху.Рыхтаваліся да новага вылету. Падабралі самых вопытных лётчыкаў-штурмавікоў. Падсаднік і яго таварышы прапанавалі план: дзве групы па 6 штурмавікоў пад прыкрыццём знішчальнікаў на вялікай вышыні, каб не дасталі варожыя зеніткі,імітуюць групавы ўдар па мосце,адцягнуўшы на сябе агонь зенітных батарэй ворага і яго авіяцыю. У гэты час дзве пары штурмавікоў на брэючым палёце незаўважна падыдуць да цэлі і дакладным бомбавым ударам накрыюць яе.

Вядучым адной з пар “ІЛаў” ішоў камандзір звяна М. Падсаднік. Пілоты на мінімальнай вышыні імкліва выскачылі на Асіекскі мост і з брэючага палёту разбамбілі яго. Немцы былі ашаломлены. І толькі калі самалёты адыходзілі ад разбуранага маста, вораг адкрыў па іх моцны кулямётна-артылерыйскі агонь. Шчыльнасць агню была настолькі высокай, што нашы самалёты атрымалі сур’ёзныя пашкоджанні: некалькі снарадаў прабілі іх плоскасці і фюзеляжы. Мужныя лётчыкі дацягнулі зраненыя машыны да свайго аэрадрома.

***З успамінаў Падсаднік Антаніны Сяргееўны***

Падсаднік Антаніна Сяргееўна нарадзілася ў 1926 годзе ў вёсцы Крынкі Полацкага раёна Віцебскай вобласці. Зараз пражывае ў г. Полацку па вул.Куйбышава, дом 1. Жонка Падсадніка Фёдара Яфімавіча, дваюраднага брата Падсадніка Мікалая Георгіевіча.

- Асабіста з Мікалаем знаёма не была. Памятаю крыху яго бацьку, сярод родных яго звалі Грышка. Чалавек быў чулай душы, энергічны, добразычлівы, любіў “рассыпацца” кампліментамі. Родныя яго паважалі і любілі. Пра маці сказаць нічога не магу, мабыць, яна рана памерла. Бацькі жылі ў Падмаскоўі, у Вышнім Валачку. Пра жыццё Мікалая ў Казахстане (як пра гэта пішацца ў газетах) нічога не магу сказаць. У Казахстане жыў

яго дваюрадны брат Падсаднік Мікалай Яфімавіч (наогул, у родзе Падсаднікаў імя Мікалай давалася кожнаму хлопчыку, які нараджаўся. Нават майго сына, якога зарэгістравалі Валянцінам, - звалі Мікалаем).

Ведаю, што Мікалай да вайны быў жанаты. Жонка яго працавала перакладчыцай. Але лёс склаўся так, што яны разышліся. Ужо пасля вайны Мікалай ажаніўся ў другі раз, і, магчыма, яго жонка была актрысай. У іх нарадзілася двое сыноў. Аднаго з іх таксама завуць Мікалаем і жыве ён у Маскве. Пра другога сына звестак не маю.

Пасля вайны Мікалай у родныя мясціны не прыязджаў. Чаму? Мабыць, былі на гэта свае прычыны. Яго ж родны брат Юрый Георгіевіч быў у нас частым госцем, хоть таксама жыў у Маскве.

Пра смерць Мікалая мы даведаліся ад яго роднай сястры Марусі, якая жыла ў вёсцы Жаўронкі Полацкага раёна. Мікалай памёр пасля цяжкой хваробы, хоць яму было ўсяго 53 гады, выглядаў ён вельмі старым.

На пахаванні Мікалая ў Маскву я ездзіла са сваім мужам і яго роднай сястрой. Там і бачыла яго другую жонку. Гэта была вельмі інтэлігентная і прыгожая жанчына. Хавалі яго як Героя Савецкага Саюза. Развітанне было наладжана ў клубе ветэранаў. Увесь час іграла жалобная музыка, стаяла ганаровая варта. На могілках выступалі яго сябры-ветэраны.[37]

Каларыт паслярэвалюцыйнага часу адчуваецца і ў біяграфіі наступнага нашага славутага земляка **– Васіля Сцяпанавіча Серафімава.**

Нарадзіўся ён 19 студзеня 1897года ў вёсцы Забелле Бабыніцкай воласці. Скончыў школу, пасля двухкласную настаўніцкую школу. Працаваў настаўнікам у в. Забелле, арганізаваў тут пункт па ліквідацыі непісьменнасці. Пасля стаў старшынёй Арэхаўскага валрэўкама. У час нямецкай акупацыі 1918 быў арыштаваны як актывіст, але аднавяскоўцы дапамаглі яму ўцячы. Завочна Серафімава прыгаворваюць да расстрэлу.

Пасля вызвалення ад нямецкай акупацыі Васіль Сцяпанавіч зноў працуе настаўнікам у роднай вёсцы. Ён прымае актыўны ўдзел у рабоце валаснога савета. Потым пачынае загадваць валасным аддзелам народнай асветы. Са снежня 1918года становіцца старшынёй першай бальшавіцкай партыйнай арганізацыі у Бабыніцкай воласці. З лета 1919г. ён камісар загараджальнага атрада па баацьбе з палякамі, які з цягам часу перарос у полк і разам з 45-ым палком утрымлівае абарону ў раёне Полацка. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецкай акупацыі вучыцца ў БДУ, які заканчвае ў 1925г. Васіль Сцяпанавіч атрымлівае накіраванне ў Бабруйск на пасаду загадчыка акружнога аддзела народнай адукацыі. Вядзе барацьбу з дзіцячай беспрытульнасцю. У 1930г. накіраваны ў АН БССР, дзе ўзначаліў масавы сектар. Затым працуе старшынёй Цэнтральнага бюро краязнаўства БССР. З 1937г. – першы

намеснік наркома асветы БССР. 10 верасня 1937 г. быў арыштаваны, але ў 1939 годзе вызвалены. Пасля вызвалення працуе лектарам Віцебскага абкома партыі.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Серафімаў працуе ў Ветрынскім раёне. Яго задача - арганізаваць усенародную барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Ён стварае баявую групу па барацьбе з дыверсантамі і шпіёнамі. Па яго прапанове камандзірам гэтай групы назначаны В.Дз. Цябут.

Пасля вайны , у 1951г., Васіль Сцяпанавіч скончыў Акадэмію грамадскіх навук пры ЦК КПСС і на працягу амаль 20 год працаваў рэктарам Брэсцкага педагагічнага інстытута. [39]

Памёр у 1972 годзе.



*В.С. Серафімаў. Фота з фонду школьнага архіва.*

Усё гэта былі людзі выбітныя, неардынарныя. Яны праславілі свае мясціны, пакінулі след не толькі ў гісторыі сваёй малой радзімы, але і ў гісторыі свайго народа. Разам з тым, гісторыю Бабыніч пісалі людзі простыя, якія нічым асаблівым не выдзяляліся. Кожны чалавечы лёс варты апісання, але паколькі задача гэта невыканальная, раскажам хаця б пра некаторых з тых, што жылі ў нашых мясінах і тварылі гісторыю гэтай зямлі, а калі пайшлі з жыцця, засталіся ў ёй ляжаць.

Адгалоскі яўрэйскай гісторыі мястэчка Бабынічы - на старажытных могілках, што назаўсёды прытулілі пад сваімі камянямі тых, для каго Бабынічы былі лёсам і радзімай. Што ж гэта былі за людзі? Чым жылі? Якімі засталіся ў памяці аднавяскоўцаў?

На сучаснай Цэнтральнай вуліцы некалі красаваліся дамы яўрэяў. У адным

з такіх дамоў жыў Лейб ( Лейба, як звалі яго на тутэйшы лад). Быў ён знакамітым майстрам, знаўцам сваёй справы. Лейб крыў дахі дранкай. Зробленыя ім дахі былі прыгожымі, адмысловымі, разнастайнымі. Была ў яго дачка Рыўка, прыгажуня і недасягальная мара ўсіх хлопцаў.

Па суседству з Лейбам жыў Мойша. Гэта быў надзвычай растаропны і дзелавы чалавек. Арэндаваў ён былыя панскія сады : Саланеўскі, Журавенскі, Селядзеўскі, а ўвосень прадаваў садавіну на Полацкім, Лепельскім, Дзісненскім рынках.

Насупраць дома Лейба стаяла хата Хаіма. Быў Хаім абутнікам. Хаім меў шмат дзяцей.Сярод іх дочкі Тайба, Бэся, Лейка, Святлана. Апошняя была замужам за пагранічнікам, рускім па нацыянальнасці.

Непадалёку ад сённяшняй школы мясцілася гандлёвая лаўка Бінькі ( Бенджаміна). Старажылы расказвалі, што ён не любіў даваць тавар напавер.

Сваю лаўку меў і Шэрман.Меў Шэрман вельмі прыгожую дачку Роху, якую пакахаў начальнік пагранічнай заставы ў Гірсах. Але бацька ні за што не хацеў аддаць дачку замуж за яго. Тады пагранічнік проста выкраў Роху. Няшчасны Шэрман доўга плакаў і ўсё прыгаворваў:” Роха, Роха…” З таго часу і пайшло выслоўе ў Бабынічах : “ Што ты плачаш, як Шэрман па Росе?”

Да сённяшняга дня захаваліся ў вёсцы яўрэйскія дамы , некаторыя хаты вяскоўцаў узведзены на фундаменце, што застаўся ад такіх дамоў. У адным з такіх дамоў, па суседству з аддзяленем сувязі, жыў доктар Пэтлух. Захоплены рэвалюцыйнымі пераменамі, ён змяняе сваё прозвішча і становіцца Кастрычнікавым. Невядома, ці пашкадаваў доктар пра свой учынак пасля, але дакладна вядома, што вельмі многа добрага зрабіў ён для Бабыніч. Гэта яго намаганнямі ў вёсцы быў адкрыты радзільны дом і аптэка, пашырыўся штат бальніцы. Вяскоўцы маглі атрымаць на месцы практычна любую ўрачэбную дапамогу.

Сярод першых піянераў і касамольцаў былі Левіты – Софья і Гелярый.



*Г. Левіт.*

*Фота з фонду*

*школьнага музея*

Гелярый Левіт нарадзіўся ў Бабынічах у 1907г. У школу пайшоў у 1916г. Як расказваў ён у сваім пісьме вучням Бабыніцкай школы, вучыўся вельмі

паспяхова, хацеў і любіў чытаць. Аб яго поспехах у вучобе красамоўна сведчыць той факт, што за адну зіму пад кіраўніцтвам свайго настаўніка Савы Уладзіміравіча Уладзімірава ён асіліў 4 класы пачатковай школы. У 1924 г. паступіў у Полацкі педтэхнікум. У 1929г. быў старшынёй камісіі па чыстцы савецкага апарата. У 1930г. едзе ў Маскву, вучыцца ў МВТВ імя Баўмана. Працаваў ва Уладзіміры на заводзе” Аўтапрыбор” на розных пасадах, затым выкладаў у Машынабудаўнічым тэхнікуме гэтага горада.[7]

Соф’я Левіт пасля вучобы ў Бабыніцкай школе працавала піянерважатай у сваёй школе. Перад вайной пакінула вёску.

Энергічнай камсамолкай, па словах яе настаўніцы Еўдакіі Васілеўны Уладзіміравай, была Эця Хацянава. [8]. Летам 1923 г. яна арганізавала першы ў Ветрынскім раёне піянерскі атрад. Сама яна пісала :”Праводзіла актыўную работу па калектывізацыі, што ў той час было вельмі новым і цяжкім. Праводзіла антырэлігіную прапаганду. Неабходна было знаёміць сялян з усім новым, змагацца са старым бытам.Часта з раённага цэнтра прыязджалі партыйныя кіраўнікі, з заставы ў Гірсах – пагранічнікі. Усе чыталі нам лекцыі. Мы вялі барацьбу з кулацтвам, рабілі камсамольскія паходы ў навакольныя вёскі. Усе касамольцы былі важатымі ў піянерскім атрадзе, вялі гутаркі з піянерамі, праводзілі сходы. Камсамольцы ставілі спектаклі, спявалі ў хоры. У рэпертуары былі новыя, рэвалюцыйныя, песні. На пахаванні першага старшыні калгаса камсамольцы спявалі “Замучен тяжёлой неволей”[8]

У жыцці сваім бабыняне-яўрэі былі простымі і непатрабавальнымі.

“На цэнтральнай плошчы мястэчка , густа забудаванай, любілі вечарамі збірацца людзі. Купкі местачкоўцаў можна было ўбачыць і каля ларкоў, і каля аптэкі, і побач з арцеллю,і ля пошты.

Вяртаючыся з работы, хто з цагельні , хто з малочнай, хто з вапнянкі, людзі разыходзіліся па сваіх патрэбах. Нехта спяшаўся да двухпавярховага будынка арцелі . Адны шылі тут сукенкі ў Лейкі Топаз, і яны кіраваліся на першы паверх прымерыць абноўкі, пакрасавацца і пагаварыць з Лейкай. Была яна актывісткай, ніводзін мітынг у Бабынічах не абыходзіўся без яе выступлення . Лейка заўсёды ведала пра канцэрты, мітынгі, ведала, калі прывязуць кіно, дакладвала, калі на танцы прыдуць пагранічнікі з заставы ў Гірсах, калі з Будзькаўшчыны. Сябравала Лейка з Фірай, прадаўшчыцай прадуктовага магазіна, і злыя языкі казалі, што сукенкі Фіры заўсёды самыя модныя, бо яна ж прыяцелька Лейкі. Але было гэта няпраўдай. Лейка ўсім шыла добра. Цанілі яе жанчыны, бо ўмела тая пераліцаваць, скамбінаваць, прыдумаць так , што з двух старых , ні на што не годных рэчаў,з’ўлялася

адмысловая новая сукенка. Нясорамна было пайсці ў ёй ні на канцэрт, ні на мітынг,ні на свята.

Ды сказаць да слова, і муж Лейкі, Рухман, быў майстрам свае справы. Яго местачкоўцы цанілі як печніка. Было ў іх двое дзетак—Айзік і Сойка , як і маці, школьныя актывісты і выдатнікі.

На другім паверсе месцілася абутковая майстэрня. Загадчыкам тут быў Лейтман. Удваіх з Хаімам яны і шылі, і рамантавалі боты, туфлі, бацінкі і нават майстрылі басаножкі мясцовым модніцам, каб тыя маглі падабацца не толькі сваім хлопцам , але і пагранічнікам. Абодва любілі пагаварыць, таму на другі паверх да іх спяшаліся не толькі кліенты.

Як магнітам цягнула мужчын у заготларок да Шэнкіна, бо той гаспадарыў не толькі свіннымі, авечымі ды цялячымі скурамі, але і думкамі мужчын. Справа ў тым, што Шэнкін выпісваў аж дзве газеты: "Савецкая Беларусь " і " Чырвоная Полаччына". Усе палітычныя падзеі і навіны жыцця абмяркоўваліся тут. Імперыялісты ўсіх краін і кантынентаў штодзённа асуджаліся, планы партыі і ўрада мелі падтрымку ўсіх перадавых местачкоўцаў, тэмпы калгаснага будаўніцтва на Полаччыне знаходзілі тут сваіх прыхільнікаў і праціўнікаў.

Загадчык другога заготларка , Нохан, мог скласці канкурэнцыю свайму суседу. Праўда , палітыка цікавіла яго мала. Затое быў Нохан знатаком Торы і Талмуда. З таго часу як закрылі сінагогу, да Нохана збіраліся ўсе , хто аддаваў перавагу вечнаму перад будзённым і надзённым.

Дочкі Лейба Нохана - камсамолка Доба і піянерка Лоя - не раз ушчувалі бацьку за рэлігійны дурман. Абедзве імкнуліся давесці яму, што ў наш час сорамна быць у палоне цемрашальства і забабонаў. " Рэлігія - опіум для народа , -павучала бацьку Доба. - Так вучыць нас Уладзімір Ільіч Ленін. Мне, камсамолцы, сорамна, што ты збіраеш такіх, як сам. Талмуд і Тора - учарашні дзень. Ім няма месца ў нашым жыцці." Ды і Лоя не раз павучала бацьку ў тым жа духу. Лейб усміхаўся сваёй добрай усмешкай , і яго разумныя вочы сыпалі вясёлыя іскаркі . " Ну, калі Ленін сказаў, то трэба верыць. Але ваш бацька не можа без опіума , ды і для народа ён неабходны, калі людзі ідуць да мяне"Злаваліся дзяўчаты. Калі заходзілі да іх сябры, суседскія дзеці Зяма і Соня Беленькія, таксама камсамолец і піянерка, яны ўсе разам вялі дыспуты з Лейбам Ноханам. Ды той не пераставаў збіраць вечарамі ў сваім ларку прыхільнікаў Торы і Талмуда.

Для хлопцаў жа вялікую прыцягальную сілу мела местачковая пошта. І тым самым звабным і прыцягальным, што прымушала іх штовечар бегчы сюды , былі чатыры маладыя тэлефаністкі- яўрэйкі, што працавалі тут пад

началам Іофэ. Былі дзяўчаты адна прыгажэй за другую. Усе хударлявыя , чарнавалосыя і чарнавокія, усе статныя. Звада для хлопцаў, адным словам. Другую палову будынка займала хата - чытальня. Тут бліжэй да вечара збіралася моладзь. Многія сапраўды прыходзілі пачытаць, але усё ж для большасці гэта было проста месца сустрэчы. Ва ўсякім разе , сярод чытачоў было нямала юнакоў, якіх больш вабіла маладосць і хараство тэлефаністак, чым глыбіня кнігі.”[40]



На старажытных яўрэйскіх могілках. *Фота В. Шугалея*

Яўрэйская гісторыя мястэчка Бабынічы скончылася ў час Вялікай Айчыннай вайны. Яўрэі – местачкоўцы , як і многія іншыя прадстаўнікі гэтага народа, былі знішчаны ўсе да аднаго. З іх гібеллю скончылася і гісторыя Бабыніч як мястэчка.

Старонкі яўрэйскай гісторыі вёскі Бабынічы ў многім былі адноўлены дзякуючы ўспамінам Ганчаровай Ганны Іосіфаўны. Дзявоцкае яе прозвішча Шынелька. Яна нарадзілася ў маі 1915г. у вёсцы Баравыя. Пасля заканчэння пачатковай школы ў Рабчонках вучылася ў Бабыніцкай сямігодцы. Затым скончыла курсы настаўнікаў пачатковых класаў, працавала ў Бабынічах загадчыцай клуба, у Рабчонках бібліятэкарам, пасля загадвала бібіліятэкай у вёсцы Бабынічы. Працяглы час працавала настаўніцай пачатковых класаў у Бабыніцкай школе. На пенсію вышла ў 1970г. Была замужам за Уладзімірам Васільевічам Ганчаровым, які быў начальнікам штаба атрада “ За Радзіму” брыгады імя Варашылава. Сям’я мела трох дзяцей: Сыноў Валянціна і Льва і дачку Ірыну. Сярэдні – Леў Уладзіміравіч – працяглы час працаваў настаўнікам, затым дырэктарам школы ў Бабынічах.

Гісторыя беларускіх Бабыніч прадстаўлена гісторыяй сямей, што здаўна насялялі гэту зямлю: Асташкевічы, Аўласенкі, Багдановічы, Булахі, Ганчаровы, Забелы, Марозавы, Падсаднікі, Пазнякі, Прашковічы, Сапегі, Саўчанкі, Сядлоўскія, Тарасевічы,Фрыдрыхі, Церашкевічы. Іх праца, рух душы, воля і стваральная дзейнасць змянялі выгляд Бабыніч, давалі вёсцы новае жыццё. Тут прайшло жыццё цэлых пакаленняў названых родаў. Тут

яны былі шчаслівымі і няшчаснымі, удачлівымі і не вельмі, багатымі і беднымі. Тут чакалі іх выпрабаванні, часам непамерна цяжкія.

Для многіх жыхароў Бабыніч найцяжэйшым выпрабаваннем стала вайна. Яна пакінула глыбокі след у лёсах, сэрцах і памяці людской. Вось як адбілася перажытае ў памяці бабынян.

*“Калі пачалася вайна, мне было 17 год. На вайну мяне не ўзялі па ўзросту. У партызаны я трапіў у 1943 годзе, зброю дастаў у в Маругі. Мяне ўзялі ў атрад “ За Радзіму” брыгады імя Варашылава.Камандаваў атрадам Маханькоў Антон Фёдаравіч. Служыў я ў другім узводзе, быў падрыўніком.У памяці бой пад вёскай Кублічы Ушацкага раёне, мы адбілі немцаў, але два камандзіры аддзяленняў - Селязнёў і Кухарэнка - кінулі сваіх людзей і ўцяклі. Людзі не разгубіліся, і толькі гэта нас уратавала. Потым здраднікаў расстралялі каля в. Паперына. Разам са мной ваяваў у атрадзе чэх Жорка, прозвішча не памятаю. Мужны быў чалавек. Праўда , гаварыць з намі яму было цяжка, ён дрэнна ведаў па - руску. Толькі камандзір разведкі Слаўскі добра мог размаўляць з ім па - чэшску. Жора застаўся жывы, але я страціў яго сляды.” 18 студзеня 1944г. у час налёту немцаў на вёску Кульгаі я быў паранены. За раненымі 23 лютага прыляцеў самалёт, і нас адправілі за лінію фронту. З Масквы цягніком нас павезлі у Казань. Лячыўся я у шпіталі 48/88 на станцыі Васільева . У Бабынічы вярнуўся ужо пасля вызвалення.*

***З успамінаў Браніслава Сямёнавіча Тарасевіча , партызана атрада “ За Радзіму “.***



*Л.А. Прашковіч.*

*Фота А. Марцынкевіча*

*“Да вайны я працавала ў калгасе, бо закончыла толькі чатыры класы і далей вучыцца не магла . Сям’я была вялікая, трэба было зарабляць на хлеб.*
*Пачалася вайна , але працаваць усё роўна трэба было.*

*Калі прыйшлі немцы, было вельмі страшна. Усіх прымушалі працаваць. Мы капалі акопы, выразалі лес, рамантавалі дарогі. Куды гналі, туды трэба*

*было ісці. Баяліся , не ведалі, што з намі будзе. А калі з’явіліся партызаны, жыць стала лягчэй  так ужо не баяліся.  Для партызан мы мылі , вязалі, шылі, дапамагалі. хто як мог.  Я таксама шыла. У мяне была машынка.*

*Для партызан мы таксама капалі акопы, вазілі іх на заданне, у каго быў конь.Зямлю падзялілі, бо трэба было неяк жыць: і партызан карміць , і самім есці нешта трэба. Жылі ў працы і ў страху. Немцы часта бамбілі. Мястэчка было вялікае, дамы стаялі блізка адзін да аднаго. Пакуль партызаны былі ў вёсцы, моладзь па вечарах збіралася разам. Танцавалі босымі, спявалі песні .*

*У канцы красавіка, пачатку мая немцы выгналі  партызан з вёскі. Усіх жыхароў, і малых , і вялікіх пагналі ў лагер ля вёскі Саланевічы, затым - ў Глыбачку . Там мы прабылі недзе каля тыдня. Хадзілі рыць акопы. Малых дзяцей , старых аддзялілі ад нас. Маладых сабралі ў асобную партыю і падзялілі на тры групы. Пачалі адпраўляць адну групу за другой. А куды – ніхто не ведаў. Нашу групу ў сорак чалавек накіравалі ў Ветрына. Спачатку размясцілі ў трохпавярховую будыніну. Людзей было многа , проста адзін на адным. Прабылі мы там трое сутак, затым нас пагрузілі ў вагоны і  павезлі ў Германію.*

*Спачатку прывезлі нас у Мюнхен і памясцілі ў лагер, дзе былі ваеннапалонныя- італьянцы, французы, рускія. Нас размясцілі асобна. Ноччу горад бамбілі амерыканскія самлёты. Было вельмі страшна, нам заставалася толькі маліцца Богу. Амерыканцы ляцелі бамбіць Дзюсельдорф, дзе было многа ваенных аб’ектаў. Самалёты лятуць, гудзяць, мы молімся , як хто можа. Пасля сталі бамбіць і “наш “ горад. Наляцелі аднойчы самалёты і разбамбілі ўсё, фабрыку нашу таксама. Ноччу страшна, спаць няможна, а днём гоняць усіх працаваць. Хаваліся мы ў бомбасховішчах, якія былі  пад баракамі, дзе мы жылі. У час адной бамбёжкі Тоня, Моня і я селі асобна ад усіх людзей.Я прапанавала падысці бліжэй да ўсіх, але дзяўчаты не хацелі. Я настойвала, І яны пагадзіліся. А на наша месца прыйшла жанчына з сынам. Тут разарвалася бомба. Барак абваліўся  і засыпаў бомбасховішча. Жанчына з сынам трапілі пад абвал і загінулі , а магло гэта здарыцца і з намі. Дзякуй Богу , мы засталіся жывымі. У Мюнхене мы расчышчалі завалы. Развозілі на тачках вугаль для мясцовых жыхароў, дапамагалі нямоглым людзям. Кармілі нас вельмі дрэнна. Асноўным харчам была пахлёбка з чырвонай капусты. Колер ежы быў агідны. Працаваць трэба было кожны дзень. Хоць мы ледзь - ледзь рухаліся, былі вельмі слабыя. Усе чакалі лепшага , спадзяваліся, што некалі ўсяму гэтаму прыйдзе канец.*

*З Мюнхена мы пастаянна пісалі дадому. Хаця добра разумелі, што нашы пісьмы наўрад ці могуць дайсці. Пасля таго як Мюнхен разбамбілі ,нас перавялі ў Глодбах. Тут быў велізарны лагер, абнесены калючым дротам. Глодбах таксама хутка сталі бамбіць. Аднойчы выйшлі з бамбасховішча, а ад нашага барака толькі агаркі. Мы засталіся толькі ў тым, што было на нас апранута. У вузельчыках, што прывезлі мы з дому ,было ўсё, што засталося ў нас . Немцы іх не адбіралі. Мы вельмі бераглі іх, бо гэта было адзінае, што заставалася ў нас ад дому. Абутку добрага ў нас не было , хадзлі ў дзеравяшках.*

*Калі фронт стаў набліжацца , нас пачалі вазіць на работу маленькімі групамі, чалавек па дзесяць. Вызвалялі нас амерыканцы. Той дзень я помню вельмі добра. Мы прачнуліся і ўбачылі , што ўсе вуліцы завешаны белымі сцягамі. Было ясна , сонечна. Мы ўбачылі сцягі і зразумелі, што гэта значыць. Потым пачулі па радыё : "Krieg vorbei". Колькі было радасці, немагчыма перадаць. Было і радасна, і страшна. Амерыканцы перадалі нас рускім, а тыя хутка адправілі нас дамоў. Некаторых яшчэ трымалі, а мы ўтрох хутка дабраліся дамоў. Разам са мной вярталіся Жаўронак Марыя і Булах Тоня.*

*Ніякага нямецкага дабра мы з сабой не бралі : баяліся падарвацца. Немцы ўсё замініравалі. З чым прыехалі, з тым і паехалі. Ехалі на цягніку праз Мінск. Злезлі з цягніка ў Кульгаях. Пакуль ехалі, я ўбачыла, што ў суседнім купэ едзе мой стрыечны брат. Ён партызаніў у нашых мясцінах, у яго я спытала пра сваіх родных. Мікалай расказаў, што ўсе мае жывы, а бацька на фронце. Сышоўшы з цягніка, мы зайшлі ў вёску Руднікі. У мяне там жылі сваякі. Там нас накармілі, бо мы былі галодныя, не елі многа дзён, валіліся з ног ад голаду. Брат пайшоў праз Рабчонкі, а мы праз Алёс. Ужо перайшлі Быстранку, і тут насустрач вышаў барадаты мужчына з аўтаматам. Галава ў яго была забінтована. Ён скамандаваў нам ісці назад за раку і там лажыцца на зямлю . Мы выканалі загад, бо вельмі баяліся. Мужчына пачаў распытваць нас пра ўсё : адкуль мы , куды ідзём, што нясём з сабой. Узяць у нас не было чаго , і ён адпусціў нас. Калі прыйшлі дадому, уся вёска сабраласяя ў нас , бо мы першымі вярнуліся. Кожны распытваў пра сваіх. З намі ў няволі былі Вера Фёдараўна, Вікця Ермаловіч і Насця Падсаднік . Мы пра іх нічога не ведалі. Я была так напалохана ўсім перажытым, што не магла заставацца дома адна нават на хвіліну. Адпачывала я тры дні, потым пайшла працаваць на малаказавод у Ветрына. Спачатку працавала простай рабочай. А потым стала лабаранткай."*

***З успамінаў Прашковіч Любові Аляксандраўны***

*“Многія з маіх аднавяскоўцаў не лічацца малалетнімі вязнямі, а яны столькі перажылі. Толькі міласцю Божай выратаваліся мы ад смерці. Я зусім не хачу ўспамінаць той час. Дужа баліць сэрца, калі пачынаю ўспамінаць усё, што перажыла. Сям’я ў нас была вялікая, пяцёра дзяцей , я старэйшая. У самым пачатку вайны ў Бабынічах у час бамбёжкі быў разбураны малаказавод. Пры заводзе быў склеп, дзе трымалі гатовыя вырабы. Людзі пачалі разбіраць вырабы і хаваць па хатах, бо баяліся голаду. Калі прыйшлі немцы, яны зразумелі, што сыр і масла трэба шукаць па хатах. Яны хадзілі па вёсцы і адбіралі ў людзей прадукты. Хоць я была і малая, але скумекала, што сыр трэба схаваць так, каб немцы не маглі знайсці. Пакінула толькі два кругляшы. Калі немцы зайшлі да нас, мы іх і аддалі . Дзякуючы гэтаму ў нас нешта засталося.*

*Спачатку немцы прабылі ў вёсцы нядоўга. Яны размясціліся ў Ветрына , Кублічах, Зябках. Яны ахоўвалі чыгунку. Калі з’явіліся партызаны, немцы перасталі прыязджаць у вёску, а толькі абстрэльвалі Бабынічы.*

*Аднойчы пад раніцу я пачула, як нехта ціхенька пастукаў у дзверы. Гэта быў Ганчароў Уладзімір, ён прыходзіў развітацца з татам перад адыходам у партызанскі атрад. Праз некалькі дзён у партызаны пайшоў і мой тата.*

*Пакуль партызаны стаялі ў Бабынічах, жыццё ішло сваім ходам. Працавалі, бо трэба было карміць сем’і і партызан.*

*Калі пачалася блакада, усіх жыхароў нашай вёскі сагналі ў лагер у Саланевічы.Там адабралі здаровых і дужых дарослых, астатніх вярнулі назад. У мамы на руках было грудное дзіця ( наша сястрычка), таму мама таксама была вернута. Мы з сястрой апынуліся сярод тых, каго гналі ў Лепель. Мы не проста ішлі, а гналі статак кароў. Мы ўвесь час былі галодныя, але есці малако ў той час я яшчэ не магла. Сястра мая , падаіўшы карову, піла сырадой, а мне рабіліся блага пры адной думцы пра гэта.*

*З Лепеля нас адправілі ў лагер недзе на мяжы з Польшчай, дзе мы прабылі нешта каля трох месяцаў. Мне было зусім дрэнна, сяброўкі баяліся, што я магу памерці. Дзяўчаты валілі лес. Адна з іх пасекла сабе палец, каб не хадзіць на работу.*

*Сярод ахоўнікаў быў адзін не такі, як усе. Дзяўчаты з горам папалам растлумачылі яму, што мне зусім дрэнна. Ён даў ім таблеткі і сказаў, што я ад іх ці зусім памру, ці папраўлюся. Я ўжо тры дні была ў беспамяцтве, і таму дзяўчаты рашыліся даць мне лекі. Пасля гэтага я хутка пайшла на папраўку. Па лагеру хадзілі ўпартыя чуткі, што нас збіраюцца адправіць у лагер у Германію.Знаёмы немец гэту чутку падцвердзіў. Сяброўка здабыла ў яго сякеру, бо мы збіраліся збегчы з лагеру. Немец доўга сумняваўся,*

*адпусціць нас ці не. Прамучыў нас ён доўга, але потым сказаў, у якім месцы рассячы дрот. Наш сябар сказаў, што трывогу ён узніме не адразу. Мы зрабілі ўсё, як той сказаў. Дзякуючы гэтаму чалавеку мы выратаваліся. Не магу назваць яго ніяк інакш, як толькі добрым чалавекам. Вярнуліся мы ў родную вёску дзякуючы Богу і гэтаму добраму чалавеку.*

***З успамінаў Прашковіч Надзеі Герасімаўны.***

*“ На пачатку вайны мне было 13 год, але я добра памятаю ўсе гады вайны. Мая сям’я жыла ў вёсцы Баярова. У памяць мне моцна ўрэзалася, як палілі з самалётаў Бабынічы. Над нашай вёскай немцы рабілі разварот, але вёску не закранулі – партызанаў тут не было.*

*Праз некалькі дзён пасля налёту на Бабынічы спалілі і вёску Паддубы , дзе таксама стаялі партызаны.*

*У маі 1944 была блакада партызанскай зоны. У адзін дзень у Баярова прыгналі партызан ( адзін з іх быў паранены ) і бежанцаў , якіх злавілі ў лесе. Закрылі ў хаце Доньчыхі на ўскрайку вёскі . Туды загналі і баяроўскіх мужчын , сярод якіх быў мой бацька Агапончык Фрол. Помню яшчэ , што там былі і Кулак Кузьма і Прашковіч Антон.*

*На другі дзень з Будзькаўшчыны прыехаў конны немец і прывёз нейкі загад, пасля чаго ўсіх закрытых у доме і ўсіх вяскоўцаў пагналі ў Будзькаўшчыну. Разам з людзьмі гналі і скаціну , людзям дазволілі ўзяць невялікія пажыткі. Размясцілі нас у хляве за рэчкай. Тут памёр паранены партызын. У вёсцы было многа народу,шмат жывёлы. Недахопу ў ежы не было. Дні праз два – тры мы ўбачылі слуп дыму над нашай роднай вёскай. У той жа дзень мы даведаліся, што ў Баярове спалілі новую партыю партызан і бежанцаў, якіх вылавілі ў лесе. Палілі ў двух хлявах, што стаялі праз дарогу. Спачатку хлявы ўзарвалі, пасля спалілі. Яшчэ праз колькі дзён усіх маладых хлопцаў і дзяўчат прымусілі гнаць жывёлу ва Ушачы, затым у Лепель. Па дарозе сустракаліся спаленыя вёскі , забітыя людзі.*

*Яды, што дала мама ў дарогу, ўжо не было - укралі . З Лепеля нас на машынах завезлі ў Беразіно , адтуль па вузкакалейцы – у Параф’янава . Тут нам далі трохі хлеба і тушонкі. Яшчэ праз дзень нас пагрузілі ў эшалон – таварняк і адправілі ў Мінск. Тут нас завезлі ў нейкі лагер, дзе пратрымалі яшчэ некалькі дзён. Бачыў , як бамбілі горад савецкія самалёты. Помню зарыва над горадам, пражэктары, разрывы снарадаў.*

*Затым зноў эшалон. Нас прывезлі ва Усходнюю Прусію , лагер называўся Гольдтштэйн. Тут я сустрэў некалькі знаёмых : бацька і сын Кучко з Быстрыцы, Садкоўскіх з Вуглоў. У гэтым лагеры нас прымусілі працаваць .*

*Групы рабілі па 10 чалавек . Адзін дарослы і падлеткі. Мы валілі лес, везлі яго на фурах на пілараму, дзе пілілі.*

*Кармілі нас вельмі дрэнна . Многія хварэлі жыватом, ледзьве ногі цягалі . Тут памёр Садкоўскі.Дзесьці ў ліпені нас зноў пагрузілі ў эшалон і павезлі, на гэты раз - у Германію, лагер Штаргарт. Многае сцёрлася з памяці, але добра памятаю аднарукага каменданта лагера. За малейшую правіннасць ён біў сваім пратэзам, збіваючы з ног моцных мужчын.*

*Дзесьці ў жніўні адабралі з нашай групы найбольш моцных мужчын, туды трапілі мой бацька і сын Кучко. Адабраных пачалі ўзмоцнена карміць, я шкадаваў, што не трапіў у гэту групу. Праз некалькі дзён іх адправілі ў шахту. Астатніх, у асноўным, маламетак, адправвілі на другі канец горада. Тут нядрэнна кармілі, далі лепшае адзенне. А хутка нямецкія гаспадары разабралі моладзь па сваіх гаспадарках. Я трапіў на тэрыторыю сучаснай Польшчы., назву паселішча не памятаю. Мой гаспадар, немец, працаваў кавалём. У яго былі жонка і нявестка. Я даглядаў жывёлу. У гаспадарцы былі тры каровы, свінні, куры. Да мяне ставіліся нядрэнна, але патрабавалі парадку. У іх я жыў да вызвалення. Але дадому трапіў не адразу. Два гады працаваў пры вайсковай часці. Дадому вярнуўся толькі ў 1947 г.*

***З успамінаў Агапончыка Георгія***

*“Як пачалася Вялікая Айчынная вайна, мне было 10 год , я закончыў 2 або 3 класы школы. Мая сям’я жыла ў в. Бабынічы , у доме , дзе зараз жыве Кашаляева В.Ф.*
*Як ішлі немцы праз вёску , яны стукалі ў вокны , але нікога не чапалі.*
*Фашысты прыйшлі ў вёску дарогай , якая ішла праз Вербачкі. Дарога была вельмі брудная , уся парэзаная. Немцы зганялі жыхароў вёсак , каб адрамантаваць дарогу.Фашысты спыніліся ў школе. Яны размясціліся ў класах. Нам , дзецям , цікава было назіраць за фашыстамі. Часта ім чынілі непрыемнасці. За гэта мяне аднойчы фашысты закрылі ў склеп дома Мароза Віктара Яўсеевіча, але я збег.*

*У Лагавых для партызан шылі абутак. А мы , дзеці , дапамагалі шыць і насіць боты партызанам. Мая сястра Зіна пайшла ў партызаны. Яна дапамагала перавязваць раненых. Маёй сястры Соні патрэбна была медыцынкая дапамога , і Зіна прыйшла ў вёску. Але суседка, Балаіха , яе здала немцам. Зіне ўдалося ўцячы. Але немцы схапілі мяне і маці, сталі страляць над нашымі галовамі, сталі катаваць. Зіне прыйшлося здацца. Фашысты яе схапілі і павялі ў лес , каб тая ім паказала , дзе стаянка партызан. Яна доўга вадзіла іх па лесе . І каля Казінцы фашысты яе*

*расстралялі. Толькі праз некалькі дзён мы змаглі забраць цела сястры і пахаваць.*

*Калі пачалося вызваленне , вёску вельмі часта бамбілі. Аднойчы у час бамбёжкі ў нашу хату трапіла бомба . Хата парушылася , і мне пераламала ногі. Доўгі час сястра мяне вазіла на тачцы. Людзі ад бамбёжкі хаваліся ў лесе, там адседжваліся. Колькі было самлётаў, не ведаю. З пачаткам налёту мяне аднеслі да возера амаль голага. Холаду я не адчуваў, можа, ад страху. Хутка пачалі гарэць дамы.*

*Калі першы налёт скончыўся, мяне загарнулі ў коўдру, і сястра павезла мяне на санях у Смолеўшчыну. Ехалі па вёсцы, якая гарэла. Ніхто пажар не тушыў, бо дамы былі пустыя, яўрэяў ужо расстралялі.*

*Ад'ехаць далёка не ўдалося. Ля самага маста, недалёка ад хаты У.С. Шынелька, самалёты з'явіліся зноў. Ляцелі нізка, над самай зямлёй. Адзін з самалётаў пачаў сапраўднае паляванне на нас , страляючы з кулямёта. Сястра схавалася пад мост , а я застаўся на дарозе. Зрабіўшы разварот, самалёт зноў знізіўся над дарогай. Я закрыў вочы. Кулі клаліся побач, а я быў жывы. На наступным развароце з самалёта скінулі бомбу ці гранату, а я зноў застаўся жывы. Затое асколкамі была паранена ў нагу сястра. Ад гэтай раны яна памерла ў Полацку пасля вызвалення.*

*Калі самалёты паляцелі, мяне ўсё ж завязлі ў Смолеўшчыну, не помню толькі хто. Пасля вайны часта з рабятамі я знаходзіў розную зброю : вінтоўкі , патроны , гранаты , каробкі з толам. Гулялі з ёй. Але потым прыйшлося ўсё здаваць ."*

***З успамінаў Пазняка Віктара Трафімавіча.***

***"****Мне было сем гадоў. Бацька мой быў у партызанах. Акрамя мяне ў сям'і было яшчэ трое дзяцей . Была вясна , ужо сышоў снег. Нечакана наляцелі самалёты. Кідалі ў асноўным запальныя бомбы. Праз акно я бачыў, як гарэў цэнтр. З будынка школы разбягаліся партызаны. На нашу хату таксама ўпала бомба. Пасёлак немцы не бамбілі. Маці залезла на дах і адкідвала бомбы , бо яны не адразу загараліся. Загарэўся суседні дом , там дах быў саламяны. Загарэўся хлеў і праз дарогу. Калі налёт скончыўся, мы паехалі ў лясную вёску Блудавікі"* ***З успамінаў Івана Кірылавіча Церашкевіча.***

*"Калі пачалася вайна, мне было 10 гадоў. Я скончыла толькі 2 класы, таму што ў школу пайшла з 8-мі гадоў. Школа была вялікая, новая, драўляная, пабудаваная літарай Ш. Яна стаяла на тым месцы, дзе зараз піларама.*



*Р.К. Станоўка. Фота А. Марцынкевіча*

*Павучыліся мы ў ёй толькі 2 гады. Мы пачулі ад дарослых, што пачалася вайна і немцы ўжо ў Бабынічах. Нам было цікава паглядзець на немцаў, бо дарослыя казалі, што ў іх шмат машын. А мы бачылі толькі адзін веласіпед. Мы адправіліся ў Бабынічы, паглядзець на немцаў.Сталі насупраць дома Льва Уладзіміравіча, глядзелі на нямецкую тэхніку. Мы босыя, у зрэбных сукеначках. Немцам было дзіўна на нас глядзець. Яны паказвалі на нас пальцамі і смяяліся. Яны адчувалі сябе пераможцамі, гаспадарамі. Адзін немец-афіцэр рукой паклікаў мяне да сябе. Калі я падыйшла, даў мне цукерку, якая дзялілася на дробныя часткі, і паказаў, каб я пачаставала ўсіх дзяцей. Я так і зрабіла. Немцы, тыя, што нас частавалі, пайшлі далей. Немцы, што прыйшлі ім на змену, размясціліся ў нашай любімай школе, у гарнізоне іх было 30 чалавек. Так пражылі мы да 1942-га года. Паміж немцамі і мясцовымі жыхарамі адбываўся натуральны абмен. Вяскоўцы насілі ім ягады, яйкі, прадукты, узамен немцы давалі мыла, ніткі.*

*У жніўні 42-га года па вёсцы прайшоў першы партызанскі атрад. Немцаў нібы падмянілі. Яны сталі злыя, жорсткія, бо ўжо не адчувалі сябе пераможцамі і гаспадарамі. Восенню 1942 года немцы пакінулі Бабынічы, але перад гэтым яны ўчынілі страшную расправу: расстралялі мясцовых яўрэяў. Сярод расстраляных было двое маіх аднакласнікаў: Гофман Гірша і Цырыхман Гірша. Расстралялі і маю сяброўку – трэцякласніцу Соню Беленькую.*

*Пасля гэтага мы жылі ў партызанскай зоне да 44-га года. Сеялі хлеб, кармілі партызанаў. А партызаны рабілі сваю партызанскую работу: узрывалі чыгункі, гамілі гарнізоны, усяляк шкодзілі немцам. Вясной 44-га года Бабынічы пачалі бамбіць з самалётаў. Згарэла наша новая школа. Было гэта днём. У гэты час фронт стаяў за Віцебскам. Было вельмі цяжка і страшна.*

*Пачалася блакада. Немцы вярнуліся. Успамінаюцца вельмі жудасныя эпізоды. У час блакады немцы бамбілі лес. 4-га мая 1944 года немцы загадалі ўсім жыхарам вёскі сабрацца, узяць дзяцей, і пагналі ў Бабынічы, дзе цяпер размяшчаецца будынак лясніцтва. З Бабыніч нас пагналі ў Саланевічы. На ноч размясцілі ў двух хлявах. Усю ноч мы чулі, як у Бабынічах ішла страляніна. Раніцай маладых людзей сабралі ў адзін шэраг і сказалі, што пагоняць у Германію. Засталіся старыя і жанчыны з малымі дзецьмі. Мы плакалі, баяліся, што з намі будзе. Але тут прыехаў конны пасыльны і прывёз загад, у якім забаранялася расстрэльваць грамадзянскае насельніцтва. Усіх нас пагналі ў вёску Глыбачка, дзе мы разам з немцамі адбылі 2 тыдні. У гэты час пачалася вызваленчая аперацыя "Баграціён". Нашу вёску вызвалілі, немцаў адагналі, і мы вярнуліся назад. У нашай вёсцы Вуглы нічога не было: ніводнай жывёліны, ні кавалка хлеба. Адно толькі добра: усе хаты былі цэлыя. У лесе вакол Вуглоў было шмат забітых. Сіськевіч Ганна, якая ўвесь час была з намі, шукала сваіх дзяцей, якія былі партызанамі. Нейкая незнаёмая жанчына знайшла ў лесе хатулёк, у якім была запіска ад Лены Сіськевіч, дачкі Ганны. У запісцы было сказана: "Франучка паранілі ў галаву, а мне адарвала ступню. Сябры нас не кінулі, і мы вярнуліся ў Максімаў акоп на Барсуковай гары". Вяскоўцы, а разам з імі і я, пайшлі ў гэты акоп. У акопе было пяцёра забітых, у тым ліку дзеці Сіськевічаў Сцяпан і Лена. Дарослыя гаварылі, што ўсе партызаны самі сябе падарвалі гранатамі, каб іх не захапілі немцы. Забітых пахавалі. Пагаравалі. Пацiху пачалі аднаўляць гаспадарку. Капалі зямлю пад яравыя лапатамі. Ганна Пятроўна Ключонак выкопвала па 8 сотак зямлі!*

*Мы пайшлі вучыцца. Я – у трэці клас. Мэблю сабралі ў вяскоўцаў. Вучыліся ў будынку старой закінутай школы. Вучыла нас настаўніца з Жураўна Феня Антонаўна. Аб свяце Перамогі даведаліся наступным чынам. 9 мая 1945 года ў наш клас прыйшла дырэктар школы Ганна Антонаўна Колмак, абняла нашу настаўніцу, сказала ёй штосьці, і яны заплакалі. А потым пачалі смяяцца. Нам яны растлумачылі, што скончылася вайна перамогай Савецкага Саюза. І сказалі, каб мы беглі дадому і неслі гэтую радасную навіну сваім бацькам. Але бацькоў і мам дома не было, яны пайшлі на працу. Мы пабеглі на поле і расказалі ім радасную навіну. Усе жыхары Вуглоў, Бабыніч, Быстрыцы сабраліся на мітынг у цэнтры Бабыніч, дзе цяпер хата Падсаднік Ніны Маркаўны. Гаварылі добрыя словы, абдымаліся, спявалі, жартавалі, танцавалі. Мы былі вельмі рады, што нашу вёску немцы не спалілі, як іншыя вёскі: Рабчонкі, Баравыя, Баярова.*

***З успамінаў Станоўка Раісы Кузьмінічны.***

*“Нарадзілася я ў 1927 г ., дзявочае прозвішча –Мароз. Сям’я была наша вялікая : тата-Іван Маркавіч, мама-Любоў Пятроўна (1900 г.н.), брат-Шура, дзве старэйшыя сястры-Марыя і Надзея. Я самая малодшая ў сям’і. Раней наша хата стаяла на хутары, які меў назву Падсосенцы. Сям’я наша была дружная і працавітая. Трымалі гаспадарку, вырошчвалі бульбу,зерне.*

*Жылі так, як і ўсе жыхары нашай мясцовасці. Тата працаваў ветэрынарам у калгасе, яму прыходзілася абслугоўваць вялікую тэрыторыю, бо больш спецыялістаў у Сельскім савеце не было.*

*У 1938г. тату арыштавалі . Аднойчы ў хату прыйшлі людзі ў форме, яны пачалі нешта шукаць. Адчынялі шафы, выкідвалі ўсё з іх. Знайсці, мусіць, ім нічога не ўдалося. Тату яны сказалі збірацца.Толькі праз нейкі час мы даведаліся,што гэта былі ваенныя з заставы ў Гірсах.*

*Так наша сям’я засталася без бацькі.Пасля вайны нам выплацілі 80 рублёў за два месяцы работы таты ў калгасе.*

*Калі немцы з’явіліся ў Бабынічах,то вельмі хутка мы засталіся без хаты. Дом наш спалілі, засталася толькі печ, якую мы па першасці тапілі і гатавалі ежу, бо было лета, нейкі час можна было так перабівацца. Бліжэй да зімы нас пашкадавала сям’я Зінаіды Максімаўны Госа(яна ў той час была яшчэ зусім малая). Яе бацькі, Максім і Еўдакія, далі нам жытло, а есці гатаваць мы хадзілі на Старыцу.Так мы перабіваліся датуль , пакуль не даведаліся, што ў Рабчонках карацелі знішчылі мясцовых жыхароў,засталіся пустыя хаты.*

*Карацелі выгналі ўсіх жыхароў вёскі на вуліцу і сказалі падзяліцца на дзве групы.У першую прапанавалі стаць тым, хто паедзе працаваць у Германію, у другую павінны былі стаць тыя, што не хочуць ехаць працаваць. Гэту групу людзей, дзе былі ў асноўным жанчыны з дзецьмі, немцы пагналі на “западную”, у вёску Шарагі каля Івесі . Там іх сагналі ў свіран і спалілі. У гэту групу трапіла мая цётка па маці -Анюта - з дзвума маленькімі дзецьмі.*

*Мама і нас чацвёра перабраліся жыць у Рабчонкі.*

*На пачатак вайны мне было 14 гадоў. Калі з’явіліся немцы, яны сталі забіраць скаціну.Так майго старэйшага брата Аляксандра адправілі ў Германію гнаць кароў. Пра яго лёс мы даведаліся значна пазней.*

*Той час вайны, калі ў нас стаялі партызаны, мне запомніўся на ўсё жыццё. У гэты час я пазаёмілася са сваім будучым мужам. Партызаны разыходзілася па хатах, мясцовыя жыхары павінны былі карміць іх. Мама гатавала заўсёды абед з улікам таго , што нехта можа зайсці. Елі партызаны тое, што і мы. Кожны дзень чамусьці прыходзілі розныя людзі.Таму з будучым мужам мы бачыліся вельмі рэдка. Наша гісторыя пачалася, калі мне было крыху больш за 16 год. Партызаны пасля абеду*

*збіраліся ў “штабе” – будынку ў пачатку вёскі.Там яны абмяркоўвалі план іх дзеянняў на ноч.На заданні яны хадзілі заўсёды ноччу.У асноўным, яны займаліся мініраваннем чыгункі.*

*Георгій, мой будучы муж, быў у групе падрыўнікоў, якая выконвала заданне партызанскага атрада імя Гастэлы. Калі пачалася блакада,то ён пайшоў у лес, і зноў сустрэліся мы яшчэ вельмі няскора , пасля вайны , ў 1947 годзе.*

*1943-1944 гады былі самымі складанымі для нашай сям’і. Усіх жыхароў нашай мясцовасці сагналі ў лагер у Саланевічы. Адбіралі працаздольных людзей, каб адправіць у Германію. Старэйшых адлучылі і адправілі ў Глыбачку. Нас, непаўнагадовых, адправілі ў Багушова рыць акопы. Неабходна было за дзень выкапаць траншэю даўжынёй 4 метры і глыбінёй такой , каб нямецкі салдат мог схавацца з галавою.Такую работу неабходна было зрабіць усім, толькі потым нам давалі есці адзін раз у суткі. Ежа была такая: маленькая буханка хлеба на траіх, банка кансерваў і суп, які меў вельмі дрэнны пах. Елі, бо трэба было выжываць. Немцы, якія назіралі за намі, былі розныя: адны строгія, другія не вельмі. Казалі так:”*arbeiten, *але памалу”. Жылі мы ў бараку. Акопы капалі ў бок Забелля.Так працавалі прыкладна два месяцы. Да немцаў дайшлі чуткі аб тым, што яны нясуць шмат страт, і да нас сталі адносіцца крыху па - іншаму, не так строга.Пасля Саланевіч павялі нас у бок Зябак на цягнік, каб адправіць у Германію. Мне было каля 17 гадоў, а маім сёстрам крыху больш. Гналі нас у калоне па чацвёра. Калі спыняліся, то можна было адлучыцца ў лес да ветру. Гэту магчымасць выкарыстоўвалі ўсе, так спачатку збегла мая сястра Маруся , адбылося гэта ля Загацця, потым Надзея з Кульгаёў. Так я засталася адна з нашай сям’і. Мне і яшчэ дзвюм жанчынам ўдалося збегчы толькі ў Зябках. Дацямна сядзелі ў лесе, калі стала шарэць, падыйшлі да хаты, якая стаяла ўбаку ад вёскі. Нам адчыніла жанчына, але яна пабаялася нас пусціць пераначаваць. Мы пайшлі далей і схаваліся ў жыце. На “заданай”усе палі былі засеяны, немцы да іх ставіліся інакш, чым да людзей з нашай мясцовасці. Праз нейкі час мы выбраліся на бальшак, тут мы ўбачылі наступнае: па бальшаку рухалася шмат падвод, гэта былі мужчыны, быўшыя паліцаі, якія схапілі свае пажыткі, кароў і рухаліся ўслед за адступаючымі немцамі.*

*Праз нейкі час на бальшаку ўбачылі машыну з вялікай будай. За рулём сядзела жанчына ў форме. Яна спыталася ў нас, хто мы такія і куды накіроўваемся. Мы расказалі ёй пра наша “падарожжа”. Жанчына ўважліва выслухала нас і папярэдзіла аб тым , што ў Зябках немцы, а ў Загацці будзе бой за вызваленне вёскі, прасіла нас быць асцярожнымі і пажадала хутчэй вярнуцца дадому. Адна з маіх спадарожніц ведала дарогу на Загацце,*

*таму мы прадоўжылі свой шлях у бок знаёмай вёскі. Калі прыйшлі ў вёску, гэта было пад вечар,папрасіліся пераначаваць у адну хату.Нам адчыніла жанчына, яна дазволіла нам застацца. Раніцою, калі мы прачнуліся , гаспадыня нас накарміла , дала хлеба і кіслага малака. Потым мы прадоўжылі свой шлях. Калі праходзілі ўздоўж чыгункі, то ўбачылі кінутую тэхніку і цягнікі . Вагоны былі запоўнены прадуктамі, адзін састаў быў з мукой. Па чыгунцы хадзілі мужчыны, яны сказалі:"Бярыце ,дзяўчаты , муку, паглядзіце колькі тут дабра."У той момант нам не хацелася нічога, акрамя як хутчэй дабрацца дадому. Потым прайшоў слых аб тым,што людзі, якія жылі побач з чыгункай , набралі мукі. Я часта ўспамінала гэты выпадак,бо дома не было чаго есці.*

*Калі я вярнулася, то даведалася аб тым, што мае сёстры ўжо дома, маму не адправілі ў Германію. Яна чакала нас і спадзявалася , што мы вернемся.Маці пасадзіла бульбу,у той час яшчэ быў жывы мой дзядуля. У яго нейкім цудам быў конь,таму маці мела магчымасць апрацаваць зямлю. Вырашчаную бульбу захавалі для насення на будучы год. Пасля вяртання дадому патрэбна было працаваць і выжываць. Хадзілі ўбіраць хлеб, малацілі жыта. Плацілі за работу зернем. Паступова наша сям'я назбірала дастаткова зерня , каб пракарміць сябе і яшчэ купіць хату ў вёсцы Быстрыца. Карову мы купілі ў " заходнай", заплацілі таксама зернем.*

*Восенню 1945 года Сельскі савет набіраў мясцовых жыхароў, якія былі адпраўлены ў Германію для таго, каб забраць у немцаў скаціну ўзамен той, якая была выгнана ў час вайны. Я таксама трапіла ў гэту групу. З нашай мясцовасці былі Тарасевіч Браніслаў Сямёнавіч і яго будучая жонка Ніна, яны пазнаёліся ў час гэтага падарожжа, Лімпа (бабуля Ключонка Валянціна) , Балай, Тоня Сіскевіч, Ганна Працуковіч , усяго каля 20 чалавек . У Германію мы адправіліся на цягніку. Размясціліся мы ў вялікай сядзібе, будынкі былі прыгожыя, рознай жыўнасці было шмат. Старэйшыя жанчыны варылі на ўсіх ежу, а мы, маладзейшыя, пасвілі кароў, даілі і даглядалі скаціну. З немцамі мы жылі добра. Малако здавалі ў г.Ісцінбург(Усходняя Прусія), а нам на абмен давалі мяса і муку.Так мы даглядалі кароў да вясны.Потым пехам мы рушылі дадому. У дарозе мы былі прыкладна 1,5 месяцы. Па дарозе пасвілі кароў і памалу рухаліся на Радзіму. Начавалі на вуліцы. Калі рухаліся па Польшчы, адбыўся ў нас канфуз. 10 чалавек гналі 100 кароў, іх неабходна было пасвіць . Загналі статак на пожню, якая належыла адной жанчыне. Яна прыйшла да нас і папрасіла сагнаць кароў, яе гэта моцна расхвалявала, і таму жанчына крычала. Адна з нашых жанчын у гэты час даіла карову, паднялася і выліла малако на гаспадыню гэтай зямлі. Мне было вельмі сорамна перад гаспадыняй. Праз нейкі час мы вярнуліся ў Бабынічы , за гэту няпростую работу нам далі па*

*карове або па падцёлку. Мне таксама выдалі падцёлка,але каровы прапалі.Карысці з нашага паходу было вельмі мала.*

*Калі я вярнулася з Германіі, пачала працаваць у калгасе. Аднойчы мне прынеслі пісьмо, якое было даслана на Сельскі савет. Ліст быў адрасаваны мне. Гэта Георгій Гарбаценка хацеў даведацца пра лёс нашай сям'і.Так мы пачалі перапіску з маім будучым мужам. Хутка ажаніліся .Так ён і застаўся жыць у нашай мясцовасці.*

*Нарадзіўся Георгій Гарбаценка на Віцебшчыне. Быў паранены ў 1944 годзе,тады ішлі баі за вызваленне, яму адстрэлілі палец на руцэ,калі ён пераплываў раку. Разам з ім ўратавалася сям'я Кармалысаў(муж,жонка і двухгадовая дзяўчынка.) Сям'я Кармалысаў і мой муж выртатаваліся,але загінула вельмі шмат людзей. Усіх параненых вывезлі на самалёце, які прыляцеў на Лепельшчыну. Георгій трапіў у шпіталь,пасля ён вярнуўся да маці, якая жыла ў вёсцы Сураж. З- за ранення майго будучага мужа больш не прызывалі ў армію. Гарбаценка Георгій 1925 года нараджэння.*

*Калі мы пажаніліся, калгас нам даў бясплатна лес на дом.Мой гаспадар сам пабудаваў дом, у якім я жыву і цяпер . З Георгіем у нас чацвёра дзяцей,9 унукаў і 5 праўнукаў.13 год таму назад мой муж памёр.*

***З успамінаў Соф'і Іванаўны Гарбаценка***

*( на здымку)*



*Фота В.Шугалея*



*Зуеў Уладзімір Рыгоравіч са сваёй матуляй Зуевай Уллянай Акімаўнай*

*“... Нарадзіўся я ў в.Гендзікі Полацкага р-на ( цяпер гэта Зялёнкаўскі Сельскі савет) 25 лістапада 1938 года.*

*Жылі мы дружна. Мая маці – Зуева Улляна Акімаўна, бацька – Зуеў Рыгор Іванавіч , дзед (бацька маёй матулі) – Гукаў Акім Кляменцьевіч, старэйшы брат – Зуеў Пётр Рыгоравіч і старэйшая сятра – Зуева Еўдакія Рыгораўна.*



*Маці – Зуева Улляна Акімаўна, дзед – Гукаў Акім Кляменцьевіч, старэйшы брат – Зуеў Пётр Рыгоравіч*

*Як пачалася вайна, я не памятаю, таму што мне не было яшчэ і трох год. Але памятаю , як хадзілі па вёсцы фашысты і мясцовыя паліцаі.*

*Я вельмі любіў свайго бацьку Зуева Рыгора Іванавіча . Ён ніколі нас не крыўдзіў. Да вайны працаваў брыгадзірам рыбалоўнай арцелі. Калі пачалася вайна, бацька ў рыбалоўныя сеткі паклаў дарагі посуд і затапіў у возеры, а пасля вайны мы шукалі гэты скарб , але не знайшлі.*

*Памятаю той дзень, калі забілі майго бацьку. Гэта было ранняй вясной 1942 года, яшчэ на азёрах быў лёд, а мой бацька сабраўся ехаць на поле гной растрасаць. Бацька пасадзіў мяне ў вялікі кошык, і мы на кані паехалі ў*

*“падмагілкі” ( так у нашай мясцовасці называлі пясчанае месца, дзе людзі на зіму закопвалі бульбу ў ямы). Бацька растрасаў па полі гной, а я сядзеў у кошыку на вазе. На суседніх палях таксама працавалі суседзі . Але раптам раздаўся выбух , і мой бацька ўпаў на зямлю (хтосьці выстраліў з лесу) Конь ад страху пабег да возера і каля берага праваліўся нагамі пад лёд, але там было не вельмі глыбока. Я не зваліўся з возу і нават не паспеў спужацца. Пасля прыбеглі суседзі, выцягнулі каня з возам і мне дапамаглі выбрацца. А бацьку мы пахавалі. Для нас гэта была вельмі балючая страта.*

*У 1943 годзе, калі было яшчэ цёпла, у вёску прыйшлі фашысты і паліцаі і нас пагналі ў Германію. Маці толькі паспела трошкі ежы ўзяць і цёплыя рэчы. Да станцыі г.Полацка нас везлі на конях , а там пасадзілі ў цягнік і павезлі ў Нямеччыну.*

*Высадзілі нас на чыгуначнай сатнцыі каля г.Гамбурга. Старэйшага брата Пятра пакінулі на станцыі. А нас павезлі на конях далей. Прывезлі нас да баўэра, які меў каменны чатырохпавярховы дом, вакол будынку вымашчаныя дарогі. Было ў яго шмат зямлі, была ферма з каровамі і конямі. Каля будынка рос прыгожы сад, і баўэр дазваляў есці яблыкі і грушы . Спачатку гаспадар быў цярплівым і не крыўдзіў нас, а потым, калі даведаўся , што яго брат загінуў пад Сталінградам, стаў жорсткім і злым і часта ўжываў бізун. Баўэр часта рабіў праверкі на сумленнасць. Падкідваў залатыя рэчы работнікам, а калі яны не вярталі знойдзенае, то моцна біў іх. Жонка баўэра, дарэчы,была вельмі ціхая і часта падкармлівала нас. У баўэра працавала шмат дзяцей з іншых мясцовасцей. Былі тут дзве дзяўчынкі з Украіны, з Тэрнопаля, Насця і Валя. Дзяўчаткі спужаліся, увесь час плакалі і не ведалі, да каго прытуліцца. Маці дапамагала ім і , наогул, стала адносіцца да іх , як да сваіх родных дзяцей. За пяшчоту і дабрыню дзяўчаткі сталі называць яе матуляй. Пасля вайны яны часта пісалі маці і нават прыязджалі да нас ў госці ў Гендзікі.*

*У абавязкі маці ўваходзіў догляд скаціны на ферме. Яна даіла кароў, чысціла за імі, скаціны было многа, таму і работы было шмат. Сятра Дуся таксама дапамагала гаспадыні па кухні і па дому: падмятала, прыбірала, чысціла бульбу, рабіла дробную кухонную работу, насіла есці работнікам на поле. Дзед Акім працаваў на канюшні конюхам. Старыйшы брат Пецька працаваў дзесьці недалёка ад нас на станцыі і часта прыходзіў да нас пабачыцца. А я дапамагаў калі матулі, калі дзеду, а калі і гуляў з такімі дзецьмі, як я. Часта бавіў час і з мясцовымі нямецкімі дзецьмі з бедных сямей. У баўэра быў сын Пубік, дык мы з ім таксама гулялі, але і часта*

*біліся. А калі Пубік жаліўся свайму бацьку, то баўэр мне балюча вушы круціў. Любілі мы гуляць на бульбяным складзе. Бульбы там было багата, вялікія горы насыпаны, вось мы там і гулялі ў хованкі.*

*Зуева Еўдакія Рыгораўна (старэйшая сятра)*



*Кармілі нас добра і кожны раз у час. Вялікая сталовая была размешчана ў чатырохпавярховым будынку на першым паверсе. Сталы былі даўгія , каля іх стаялі лаўкі. Работнікаў ў баўэра было шмат. Браў ён на работу толькі жанчын, старых і малалетніх дзяцей. Мужчын на работу ён не браў, але калі трэба было рабіць цяжкую работу, мужчын прывозілі са станцыі ( там быў размешчаны нейкі лагер)*

*Спалі мы ў асобным будынку з чырвонай цэглы. На ноч туды зводзілі усіх работнікаў і закрывалі. Мы жылі ў невялікім пакойчыку,ў якім стаялі два ложкі. На адным ложку спаў дзед, а на другім – маці, Дуся і я.*

*У 1945 годзе ўсё часцей сталі прылятаць самалёты і бамбіць Гамбург. Нашу мясцовасць яшчэ не чапалі.Прылятали самалёты ў асноўным ноччу. Бомбы разрываліся так, што зранку мы знаходзілі жалезныя пліты, якія прылятали да нас з гораду. Калі саюзнікі пачыналі бамбіць , то нас заводзілі ўсіх ў падвал, закрывалі, а каля дзвярэй дзяжурылі нямецкія салдаты са станцыі. Гаварылі, што гэта рабілі для таго, каб мы не змаглі падаць самалётам ніякага сігналу.*

*Памятаю, як прыйшлі саюзнікі. Пад'ехалі яны да будынка на танку, на галовах ў іх былі надзеты белыя каскі. Нам з хлопцамі было вельмі цікава на іх глядзець. Салдаты паклікалі нас і сталі частаваць ледзянцамі . Як зараз пямятаю тыя смачныя ледзянцы ў бліскучым пакеціку. Потым саюзнікі пагрузілі нас на машыны і адвезлі да нашай зоны. Мы былі вельмі рады ўбачыць нашых салдат. Савецкія салдаты пасадзілі нас ў цягнік , і мы паехалі дамоў. Старэйшага брата Пятра мы не знайшлі.*

*Калі прыехалі ў Гендзікі, то ўбачылі, што хата наша была занята. Усе рэчы з хаты былі вынесены. Толькі іконы засталіся. Іх схавала наша родзічка Ірына Марыненка – гэта маці вядомай усім Героя Савецкага Саюза Таццяны Марыненка. Гэта адзіны скарб, які застаўся ў нашай сям'і і перадаецца па мужчынскай лініі.*





*Зуеў Пётр Рыгоравіч (старэйшы брат )* *Зуеў У. Р. у маладосці*

*Старэйшага брата Пятра мы ўбачылі толькі праз некалькі гадоў. Пасля вайны ён паехаў на тэрыторыю, занятую савецкімі вайскамі , і яго адразу прызвалі ў Савецкую Армію на службу. Служыў ён у г.Баку. Там потым ажаніўся, вучыўся і застаўся жыць.”*

*З успамінаў Зуева Уладзіміра Рыгоравіча*

Усе гэтыя людзі пасля вайны жылі і працавалі ў Бабынічах, шмат карыснага і добрага зрабілі для сваёй вёскі. Агапончык Г. І., Зуеў У. Р., Пазняк В. Т., Церашкевіч І.К. працавалі механізатарамі ў калгасе. Прашковіч Л. А., Гарбаценка С. І. былі калгаснікамі. Прашковіч Н.Г. шмат гадоў працавала начальнікам аддзялення сувязі. Тарасевіч Б.С. на працягу многіх гадоў працаваў брыгадзірам у калгасе імя Мялешкі.

Станоўка Р.К. стала настаўніцай і 25 год працавала настаўніцай Загацкай пачатковай школы ў в. Мураўі, што знаходзіцца за 3 км ад Бабыніч. Штодзень яна хадзіла пешшу на работу і назад, бо ведала, што яе чакаюць вучні. Працавала у Мураўях Раіса Кузьмічна да закрыцця школы, так што без перабольшвання можна сказаць, што ўсё жыццё Раіса Кузьмінічна аддала людзям гэтай вёскі. Раіса Кузьмічна выгадавала траіх дзяцей.

Пазней гісторыю роднай вёскі будуць тварыць іх дзеці і ўнукі.

Сярэдні сын Станоўка Р.К., Аляксандр, прысвяціў сваё жыццё Бабынічам. Пасля службы ў арміі стаў працаваць шафёрам у калгасе імя Мялешкі. Пазней стварыў сям’ю з маладой настаўніцай пачатковых класаў Свірыдзенка Святланай Пятроўнай, што атрымала размеркаванне ў Бабынічы пасля заканчэння Віцебскага педагагічнага інстытута. Так з’явілася ў Бабынічах яшчэ адна сям’я Станоўка, у якой нарадзілася ізноў жа трое дзяцей. Двое з іх жывуць у Бабынічах. Меншая дачка Аляксандра Анатольевіча і Святланы Пятроўны, Марыя, скончыла БДУ і працуе настаўніцай у роднай школе.

Укараняцца ў Бабынічах і дзеці Прашковіч Надзеі Герасімаўны і Прашковіч Любові Аляксандраўны. Сын Надзеі Герасімаўны , Мікалай, будзе працаваць шафёрам спачатку ў калгасе імя Мялешкі, пазней – у лясніцтве. Ён мае сям'ю, у якой выгадавалася двое дзяцей, яго жонка – калгасны бухгалтар.

Малодшы сын Любові Аляксандраўны, Уладзімір, таксама прырасце ў Бабынічах, жыве і працуе тут, мае сям'ю. Яго жонка, Алена Яўгенаўна, дачка калгасных ветэрынараў, працуе настаўніцай нямецкай мовы ў роднай школе. Сям'я гадуе дачушку Алесю.

Аддацуць жыццё бацькаўшчыне і двое дзяцей Івана Кірылавіча Церашкевіча – Мікалай і Алена.

Сын Браніслава Сямёнавіча Тарасевіча – Віктар – таксама са сваёй сям'ёй будзе жыць і працаваць у Бабынічах. Ён будзе многа год загадваць фермай, затым стане паштальёнам. Яго жонка Вольга Уладзіміраўна загадвала складам гаспадаркі. Іх малодшая дачка Анжэла стала настаўніцай і зараз працуе ў Бабыніцкай школе. Мае сям'ю, гадуе двух дзяцей.

Сярод тых, хто лічыць сябе бабынянамі, шмат людзей , што нарадзіліся ў іншых мясцінах, але па волі лёсу сталі жыхарамі Бабыніч і ўзбагацілі гісторыю гэтай вёскі.

Адна з такіх - Кашаляева Валянціна Фядосаўна, якая аддала Бабынічам 53 гады свайго жыцця. Яна нарадзілася 26 жніўня 1929 г. у вёсцы Качаны Жарскага сельсавета Ушацкага раёна. Да вайны скончыла 4 класы Качаноўскай пачатковай школы. Восенню 1944г. пайшла у пяты клас Жарскай сямігодкі, якую скончыла ў 1948 г. Пасля паступіла ў Брэсцкую фельшарска- акушэрскую школу, якую скончыла ў 1952г. З 1958 па 2002гг. працавала па абранай прафесіі.

Валянціна Фядосаўна пачынала сваю працоўную дзейнасць у той час, калі яшчэ працавала Бабыніцкая ўчастковая бальніца. Загадчыкам тады працаваў Міхневіч Канстанцін Сцяпанавіч, затым яго змяніў Альберт Пятровіч Саладоўнікаў. Валянціна Фядосаўна працавала ў радзільным аддзяленні бальніцы, разам з доктарам Ліліяй Максімаўнай Федарэнка. У бальніцы была яшчэ адна фельдшар – Г.І. Рубіс ( Серафімава). Медперсанал налічваў у той час 26 чалавек [32]

У 1970г. бальніца спыніла дзейнасць, на базе яе стаў функцыяваць урачэбны ўчастак, які ў 1972г. быў рэарганізаваны ў ФАП. Загадвала ФАПам спачатку Г.І. Серафімава, а з 1986г. – Валянціна Фядосаўна.

Валянціна Фядосаўна карысталася павагай і любоўю у бабынян за сваю самаадданасць прафесіі, спачуванне да людзей, гарачае жаданне служыць ім на абранай ніве. Бадай, няма у Бабынічах сям'і, якая б не звярнулася да Валянціны Фядосаўны і не атрымала ад яе дапамогу Фельчар не адмаўляла

нікому з тых, хто меў патрэбу ў медыцынскай дапамозе. І ўдзень, і ўночы ішла яна туды, дзе яе чакалі. За гэта і карысталася яна любоўю аднавяскоўцаў. І сёння Валянціна Фядосаўна дапамагае людзям, наколькі можа, бо, хаця яна даўно на заслужаным адпачынку, але вяскоўцы працягваюць ісці да яе за дапамогай.



Здымак 60-ых гг.
Медыцынскія сёстры і санітаркі
Бабыніцкай участковай бальніцы.



Доктар Саладоўнікаў А.П.
з фельдшарамі (стаяць)
Г.І. Серафімавай(злева)
І В.Ф.Кашаляевай( справа)
і медсёстрамі.

*Фота з сямейнага альбома Т.В. Асташкевіч*

Сям’я Міхаіла Андрэевіча і Ніны Маркаўны Падсаднік утварылася ў далёкі пасляваенны час у Бабынічах , хаця родам абдва былі з іншых вёсак. Падсаднік Міхаіл Андрэевіч нарадзіўся 5 верасня 1919г. у в. Быстрыца. Вучыўся ў Бабыніцкай сямігодцы. Пасля заканчэння паступіў Ў Полацкі педістытут, які закончыў у 1939г. Працоўны шлях Міхаіл Андрэевіч пачаў настаўнікам пачатковых класаў Карпініцкай пачатковай школы Тураўлянскага сельсавета. Аднак працаваць давялося нядоўга. У лістападзе гэтага года маладога настаўніка прызываюць у Чырвоную Армію. Служыў Падсаднік у Верхнім Валачку ў складзе 301-га запаснога палка 48-й стралковай дывізіі. У сакавіку 1940 г. полк накіравалі ў Ленінград для ўдзелу ў фінскай вайне, але пакуль полк дабіраўся да месца прызначэння, баявыя дзеянні былі скончаны. Месцам новай дыслакацыі палка становіцца Прыбалтыка.Тут і сустрэў вайну Міхаіл Андрэевіч.

25 чэрвеня полк вышаў з Рыгі ў накірунку да Метавы. Перад выхадам было загадана здаць старую зброю. Салдаты разумелі, што пачалася вайна, хаця ніхто ім аб гэтым не казаў. Новай зброі полк так і не атрымаў. Супраць ворага выступілі маладыя салдаты літаральна бяззбройнымі.

Першая сустрэча з ворагам адбылася непадалёку ад вёскі Расіяне. Бою практычна не было. Чырвонаармейцы часткова былі забіты, часткова трапілі ў палон. Так Міхаіл Андрэевіч стаў вязнем Ліепайскага лагера для ваеннапалонных. Нямала цяжкіх хвілін выпала тут на долю маладога салдата. Тут давялося яму паглядзець у вочы смерці. Быў ён чарнявы, смуглы, меў нос з гарбінкай,усё гэта рабіла яго падобным да яўрэя.Нямецкія салдаты заўсёды пыталіся : “ Jude?”. Аднойчы двое з іх вырашылі давесці справу да канца. На адмоўны адказ не зрэагавалі, загадалі ісці з імі. Адвялі ўбок і загадалі капаць яму, яскрава даўшы зразумець, што тут ён скончыць сваё жыццё. Міхаіл Андрэевіч развітаўся з жыццём… І тут немцаў паклікалі абедаць. Яны нешта параіліся, і адзін махнуў рукою ў бок лагера , загадваючы маладаму салдату ісці туды. Доўга ён не мог паверыць, што ўратаваўся.Невядома, чым скончылася б гэта гісторыя, але хутка ў лагер сталі прыходзіць латышы, каб набраць сабе работнікаў. Падсаднік трапіў да гаспадара цаментнага завода. Працаваць было цяжка, але пагрозы жыццю тут не было. Гаспадар любіў добрых работнікаў, а малады беларускі хлопец быў старанны і акуратны, працаваць умеў .

На самым пачатку 1944г. палонных вывезлі ў Германію, у Магдэбург. Лагер там ахоўвалі чэхі. Дзякуючы ім тром палонным, сярод якіх быў і Міхаіл Андрэевіч, удалося ўцячы.Чэхі далі ім карту мясцовасці, і палонныя прабіраліся па начах насустрач фронту.Так апынуліся яны ў Польшчы. Увесь час над іх жыццём вісела пагроза . Мучыў голад, шмат нацярпеліся, пакуль у ваколіцах Сандаміра не сустрэліся з войскамі 1-га Украінскага фронту. Пасля доўгай праверкі палонныя атрымалі зброю, і сталі салдатамі 290-га гвардзейскага палка ў складзе танкавага дэсанта 5-ай арміі . Шлях арміі ляжаў на Дрэздэн. Узялі яго штурмам, і направіліся на Прагу. Дзень Перамогі Міхаіл Андрэевіч сустрэў у Празе. За штурм горада ён быў узнагароджаны медалём. Аднак змагацца з немцамі яму давялося яшчэ амаль два месяцы, а святкаваць Перамогу толькі 20 чэрвеня, пасля таго, як былі знішчаны немцы і ўласаўцы, што трымаліся ў Чэхіі да гэтага часу. І толькі ў гэты дзень у гонар Перамогі быў наладжаны ваенны парад, якім камандаваў герой Сталінградскай бітвы генерал Радзімцаў.

Міхаіл Андрэевіч запомніў , як ганаравалі іх жыхары чэшскай вёскі Огнічы: іграў аркестр,усе танцавалі, спявалі, дзякавалі вызваліцелям. Пасля была Вена, а дэмабілізаваўся Міхаіл Андрэевіч толькі вясной 1946.

Жыццёвы шлях яго быў поўны трагічных і радасных падзей. На Радзіме ён зноў стаў працаваць настаўнікам. Спачатку як настаўнік пачатковых класаў у в. Лабэцкія, Рабчонкі, Варонічы, пасля заканчэння Мінскага дзяржаўнага інстытута замежных моў,настаўнікам нямецкай мовы ў роднай Бабыніцкай школе.Тут ён знайшоў сваё шчасце. Калі пасля дэмабілізацыі стаў працаваць настаўнікам у Бабыніцкай сямігодцы, то сустрэў тут Ніну Маркаўну Будзько, якая працавала піянерважатай. Бацька яе быў дасланы сюды старшынёй сельсавета, атрымаўшы бронь пасля партызанскага атрада. Ніна Маркаўна стала абранніцай маладога прыгожага салдата. Разам яны пражылі доўгае і цікавае жыццё,выгадавалі траіх дзяцей.

Не стала Міхаіла Андрэевіча ў 2004 годзе.

Жыццёвы шлях Ніны Маркаўны быў не менш насычаны падзеямі, чым у яе мужа. Ніна Маркаўна расказвае : “ *Нарадзілася я ў в. Гуры Наўліцкага с/с Ветрынскага раёна ў 1926г. Бацька – Будзько Марк Цімафеевіч – быў брыгадзірам у калгасе. Маці - Іванькові́ч Фёкла Захараўна – калгасніца.*

*Вучылася ў Наўліцкай сямігодцы, скончыла ў1941г. У маі гэтага года стала камсамолкай, у камсамол прымалі ў Ветрынскім райкоме камсамола. Добра памятаю,што ў першыя дні вайны мы з сяброўкай, як камсамолкі, павінны былі дзяжурыць ля тэлефона ў сельсавеце. Старшынёй сельсавета быў тады Прашковіч Кірыл, старшынёй калгаса – Карась. Вось аднойчы зазваніў тэлефон, і мы пачулі, што немцы ужо кіламетраў за сем ад Ветрына. Нам загадалі перадаць старшыні калгаса тэрмінова выганяць калгасную скаціну (кароў, коней) і ісці ў напрамку да Гомлі. Паколькі бацька быў брыгадзірам, мы з мамай таксама адправіліся ў бежанцы. Калгасны статак гналі з сабою.Дайшлі да Гомлі і ўбачылі танкі. Адзін з хлопцаў падышоў бліжэй, каб заглянуць у танк, і пачуў адтуль на ломанай рускай мове: “ Што глядзіш,гэта не руская табурэтка, гэта нямецкі танк”. Мы павярнулі назад.*

*Калі вярнуліся, сталі раздаваць людзям скаціну, зерне. Такі быў загад.Немцы ўжо стаялі ў Ветрыне, а дужа часта праходзілі салдаты-акружэнцы . Прасілі есці, прасілі даць вопратку. Вечарам мама налівала ў бутэльку малака, брала хлеба і клала ўсё ў куст бэзу, што рос побач з домам. Раніцой нічога не было.Так рабілі ўсе людзі.Каля возера стаяла калгасная баня, туды таксама насілі ежу для акружэнцаў.*

*Аднойчы мама прывяла раненага. Узяла з дому посцілку, занесла яе ў калгасны свіран і там паклала раненага. Насілі яму есці, але нехта выдаў. Прыехалі немцы і забілі раненага. Маму не зачапілі, бо ніхто не ведаў, што гэта яна хавала салдата. І немцы тады яшчэ не дужа былі злыя.*

*Немцы прыязджалі конна ў вёску за малаком. Малако налівалі ў бідоны, што па форме нагадвалі каробкі, былі плоскія і вазілі іх за спіной, як рукзакі. Людзі павінны былі здаваць малако немцам, бо ў Ветрыне працаваў нямецкі малаказавод. Асабліва любілі немцы кураціну і яйкі.*

*Аднойчы нямецкі салдат заглянуў да нас і стаў шукаць сала. А ў нас быў яшчэ кумпяк. Немец сарваў з вяроўкі абрус, што сушыўся, завярнуў у яго кумпяк і пайшоў.Мама доўга плакала. Да немцаў людзі ставіліся па – рознаму. Наш сусед дабравольна стаў бургамістрам. Былі такія, што падтрымлівалі немцаў.Насця Пяцюль звязалася з нямецкім камендантам з Ветрына.*

*На Каляды 1942г. у нас быў вобыск. Аўдачонак Васіль данёс, што ў таты быццам ёсць зброя. Прыляцелі немцы, тату голага выгналі на вуліцу і паставілі пад акном з паднятымі ўгору рукамі. У хаце сталі ўсё перарываць. У скрыні мама хавала цукар, што выmяняла на крупы ў бежанцаў. Быў ён у кавалачках завернуты ў анучачку. Цукар забрашчаў, і немец думаў, што гэта патроны. Хаця ў нас нічога не знайшлі, бацьку ўсё роўна забралі. Данеслі таксама і на Карася,і немцы паехалі ў Наўліцу па яго. Да нас прыйшоў настаўнік Мікалай Усцінавіч і сказаў маме даць яму патроны, калі ёсць. Ён хацеў страляць у немцаў, калі тыя будуць вяртацца з Наўліцы з Карасём. Мама стала плакаць, гаварыць, што тады спаляць абедзве вёскі, ды і патронаў не было.*

*Бацьку з Карасём немцы павезлі ў Ветрына. Сказалі, выратаваць іх можа толькі пісьмо, падпісанае ўсімі жыхарамі, што партызанаў у вёсцы няма.Пісьмо напісалі, адзін чалавек не захацеў яго падпісаць, усе астатнія падпісалі. Гэта і ўратавала бацьку і Карася . Іх адпусцілі.*

*Бацька і Карась сталі збіраць групу для адходу к партызанам. Сабралі 25 чалавек. Каб пайсці ў партызаны, абавязкова трэба было раздабыць зброю. У Фарынаве былі савецкія склады. У пачатку вайны іх бамбілі, зброя была пашкоджаная, але мужчыны ўмелі чыніць. Так і бацька дастаў сабе вінтоўку.*

*У Бабынічах мясціўся штаб партызанскай брыгады ,тут стаяў і атрад ”За Радзіму”. Аднойчы бацьку арыштавалі партызаны гэтага атрада, ізноў жа па даносу.Не помню імя чалавека,што сказаў, быццам бацька прадаў яму*

*вінтоўку, а сам у партызаны не ідзе. Камандзір атрада, як аказалася, ведаў бацькавага брата, той быў начальнікам Халопеніцкага ГПУ да вайны. Але гэта бацьку не ўратавала. Запёрлі яго ў баню, а сторажам паставілі чалавека, які ведаў, што бацька – сувязны атрада" За Родину".Ён схадзіў да камандзіра і сказаў пра бацьку. Гэта і ўратавала яго.*

*Калі бацька і Карась сабралі групу з 25 чалавек, іх узялі ў атрад"За Родину". Штаб адзін час мясціўся ў Будзькаўшчыне. У старым панскім доме тут жылі і сем'і партызан.Нам было блізка, і мы з мамай жылі дома. Бацька прыязджаў рэдка, я сама і арала, і сеяла,і жала, і малаціла. Мама была слабай здароўем, робіць дужа не магла.*

*Аднойчы нам сказалі, што на Забельскім полі немцы пабілі партызан, і быццам папа быў там. Я пабегла ў штаб, даведацца, дзе быў папа. Мне сказалі, што ён паехаў у Забелле. Я пабегла на Забельскае поле, там убачыла пабітых партызан, але бацькі сярод іх не было. Як аказалася, ён уратаваўся, кінуўшы каня. Бацька быў намеснікам камандзіра атрада па гаспадарчай частцы. Ён быў блізкі з Цябутам і Маханьковым.*

*Мы ўсе ў вайну памагалі партызанам: вязалі рукавіцы, шылі адзенне. Бацька Ключонка Мірона быў партны, ён шыў партызанам кажухі. Немцы таксама загадвалі вязаць рукавіцы. Мама гаварыла мне вязаць немцам рукавіцы ў адну нітку, а партызанам ў дзве.*

*Немцам даняслі, што з нашай вёскі многа партызан , і Гуры спалілі паліцаі з Наўліцы. Пасля мы жылі ў лесе ў зямлянцы. Мой хросны бацька, Любчык Якаў, выкапаў і сабе зямлянку, і нам з мамай.*

*Партызанам забаранілі браць сем'і ў лес, таму партызанскія сем'і былі раскварціраваны ў Будзькаўшчыне. Нас з мамай падсялілі да Тумаша. Аднойчы наляцелі немцы. Тумаш заявіў немцам, што ў яго жыве жонка партызана. Мамы дома не было, прыйшоў немец, схапіў мяне за хустку і стаў выцягваць з дому. Ён гаварыў, што я жонка партызана. Я плакала і крычала, што ў мяне няма мужа. У суседнім пакоі ляжала старая Садоўская. Я стала прасіць яе сказаць немцу, што я не замужам. Тая ведала па-польску, і сказала, што я паненка. Немец выцягнуў мяне з хаты. Тут прыбегла мама, павалілася яму ў ногі і стала крычаць, што я дачка паліцая. Ён адпусціў мяне, махнуў рукой і пайшоў. Я стала крычаць яму ўслед:" Пан, а куды мне?"Ён яшчэ раз махнуў рукой. Скора з будынку панскай канюшні пачулася стральба. Калі немцы паехалі, мы з мамай пайшлі паглядзець, што там. Я ніколі не забуду, таго што ўбачыла. Каля абедзвюх сцен ляжалі маладыя людзі. Усе яна былі*

*забіты выстралам у галаву. Гэты лёс чакаў і мяне. Мусіць, Бог мяне ўратаваў.*

*Пасля мы з мамай жылі ў Глыбачцы Ў Хаткевічаў. Якраз пачаўся хапун: забіралі маладых і гналі ў Германію. У тую хату, дзе жылі мы з мамай, прыйшлі немцы. Мама загадала мне легчы пад лаўку і адвярнуцца да сцяны. Немцы сядзелі, мама падносіла ім есці. Адзін немец варыў курыны суп і дужа смачна пахла. Мне вельмі хацелася есці і было дужа страшна. Немцы спыталі, чаму я ляжу пад лаўкай. Мама сказала, што я ненармальная. Так мама ўратавала мяне ад хапуна.*

*Калі пачалася блакада, мы з мамай жылі ў Глыбачцы. Бацька забраў мяне з сабой у атрад. Мама не пайшла, бо была вельмі слабая здароўем. Праз Прарыў я праходзіла разам з бацькам. Наш атрад стаяў то ў Каравайне, то ў Галубіцкай пушчы. Елі каніну, было ўжо цёпла, бочку з мясам трымалі ў вадзе. З Асінаўкі прыганялі авечак. Пасля таго, як Асінаўку спалілі, хлеб пяклі ў печах спаленых хат. Цукар варылі з буракоў.*

*Цяжка было, што было многа вошай. Помню, як мы з бацькам дзяжурылі каля рацыі. Нашы ўжо наступалі. Мы пачулі па рацыі, што нашы ўжо каля Шандзялоў. Тут нехта закрычаў, што к атраду прыбліжаюцца дзве машыны. Людзі кінуліся ўцякаць, а з машын пачалі крычаць і зваць нас. Аказалася, што гэта ўжо нашы. Сколькі было радасці! Яны сказалі, што Бабынічы і Ветрына ўжо свабодны, і наш атрад з Галубіцкай пушчы адправіўся на Ветрына. Калі прыйшлі ў Ветрына, то запомнілася, што на беразе возера было многа нямецкіх трупаў, у асноўным ў ніжняй бялізне.*

*Бацька мой атрымаў бронь, і яго паслалі старшынёй сельсавета ў Бабынічы. Так я апынулася ў Бабынічах."*

Шчаслівае жыццё пражылі Падсаднікі ў Бабынічах, выгадавалі траіх дзяцей, многа карыснага і добрага зрабілі для вёскі, што стала ім роднай.



*Падсаднік Н.М. каля свайго дома.*
*Ужо без Міхаіла Андрэевіча.*
*Фота А. Марцынкевіча*

На сённяшні дзень у Бабынічах жыве многа людзей , што прыехалі сюды на працу. Многія атрымалі размеркаванне пасля ВНУ або ССНУ, некаторыя прыехалі самастойна. Сярод прывычных для мясцовых людзей
прозвішчаў з’явіліся новыя: Аскаленкі, Андронавы, Буханцавы, Біруковы, Бружасы, Вілішчукі, Голевы, Гукавы, Ендауравы, Жаўнерчыкі, Зайцавы, Кічовы, Лагошы, Угольнікі, Мітрафанавы, Ражноўскія, Семянцовы, Старавойтавы, Судакі, Шклянікі, Шугалеі, Церахі, Урублеўскія, Ягоравы, – усіх не пералічыць.

А значыць – будуць цікавыя лёсы, захапляльныя гісторыі, добрыя справы. Новыя людзі напішуць новую гісторыю старажытнага беларускага пасялення – Бабынічы. І ў той жа час гэта новая гісторыя будзе прадаўжэннем гісторыі вёскі, якой болей чым пяцьсот год, гісторыі драматычнай, поўнай падзей – Малой гісторыі Вялікай радзімы.




**Бабыніцкі фэст.** *Фота А Зайцавай*

**Дадатак № 1**

# Спіс яўрэйскага насельніцтва м. Бабынічы на 1894г.

| Нумар | Прозвішча | Імя | Імя па бацьку | Узрост | Папярэдняе месца жыхарства |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Скуратнікаў | Янкель | Залман | 60 | Ушачы |
| 2 | Скуратнікаў | Сорка-Геня | Берка | 58 | Ушачы |
| 3 | Скуратнікаў | Мендэль-Лейба | Янкель | 24 | Ушачы |
| 4 | Шэрман | Абрам-Іцык | Шая | 70 | Бабынічы |
| 5 | Шэрман | Малка | Насон | 64 | Бабынічы |
| 6 | Шэрман | Зундзель | Абрам-Іцык | 29 | Бабынічы |
| 7 | Шэрман | Шмуэль | Абрам-Іцык | 51 | Бабынічы |
| 8 | Шэрман | Бэйла | Абрам-Іцык | 25 | Бабынічы |
| 9 | Шэрман | Сіма-Хайка | Мэір | 25 | Бабынічы |
| 10 | Шэрман | Муся | Ісроэль | 45 | Бабынічы |
| 11 | Шэрман | Шалом-Міхель | Шмуэль | 27 | Бабынічы |
| 12 | Шэрман | Хаім-Гірш | Шмуэль | 25 | Бабынічы |
| 13 | Шэрман | Хая-Сорка | Шмуэль | 21 | Бабынічы |
| 14 | Шэрман | Рыўка | Шмуэль | 17 | Бабынічы |
| 15 | Топаш | Гірш | Гірш | 63 | Чашнікі |
| 16 | Топаш | Бася-Лея | Лейб | 60 | Чашнікі |
| 17 | Топаш | Песя | Гірш | 23 | Чашнікі |
| 18 | Топаш | Айзік | Гірш | 35 | Чашнікі |
| 19 | Топаш | Бася-Шэва | Ерухом | 34 | Чашнікі |
| 20 | Топаш | Ерухім | Гірш | 13 | Чашнікі |
| 21 | Топаш | Насон | Гірш | 10 | Чашнікі |
| 22 | Топаш | Хаім-Лейба | Гірш | 7 | Чашнікі |
| 23 | Топаш | Мойша | Гірш | 5 | Чашнікі |
| 24 | Топаш | Мэір | Гірш | 3 | Чашнікі |
| 25 | Топаш | Мерка | Гірш | 12 | Чашнікі |
| 26 | Топаш | Хая-Роха | Гірш | 0 | Чашнікі |
| 27 | Топаш | Еўно | Гірш | 30 | Чашнікі |
| 28 | Топаш | Бася-Ціўя | Абрам | 28 | Чашнікі |
| 29 | Топаш | Шэйна-Роха | Еўно | 5 | Чашнікі |
| 30 | Топаш | Хая-Рэйза | Еўно | 1 | Чашнікі |
| 31 | Шэрман | Аншэль | Пэйсах | 67 | Бабынічы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 32 | Шэрман | Нэхама | Міхэль | 60 | Бабынічы |
| 33 | Шэрман | Хаім-Руман | Аншэль | 39 | Бабынічы |
| 34 | Шэрман | Пэйсах | Аншэль | 36 | Бабынічы |
| 35 | Шэрман | Шая | Аншэль | 26 | Бабынічы |
| 36 | Шэрман | Эська-Фэйга | Эвель | 35 | Бабынічы |
| 37 | Шэрман | Янкель-Элья | Хаім-Руман | 14 | Бабынічы |
| 38 | Шэрман | Хана | Хаім-Руман | 12 | Бабынічы |
| 39 | Шэрман | Гэля | Хаім-Руман | 6 | Бабынічы |
| 40 | Шэрман | Рыўка | Іцык | 28 | Бабынічы |
| 41 | Шэрман | Арон | Пэйсах | 15 | Бабынічы |
| 42 | Шэрман | Алта | Пэйсах | 1 | Бабынічы |
| 43 | Шэрман | Шэйна | Руман | 24 | Бабынічы |
| 44 | Шэрман | Міхель | Шая | 10 | Бабынічы |
| 45 | Шэрман | Хана | Шая | 5 | Бабынічы |
| 46 | Шэрман | Крэйна | Шая | 4 | Бабынічы |
| 47 | Шэрман | Хана-Дрэйза | Шая | 2 | Бабынічы |
| 48 | Рыўлін | Шмуэль | Абрам | 45 | Бабынічы |
| 49 | Рыўлін | Сорка | Іцык | 47 | Бабынічы |
| 50 | Рыўлін | Залман-Хаім | Шмуэль | 25 | Бабынічы |
| 51 | Рыўлін | Вульф | Шмуэль | 19 | Бабынічы |
| 52 | Рыўлін | Хайка | Шмуэль | 13 | Бабынічы |
| 53 | Рыўлін | Сося-Лея | Сімха | 24 | Бабынічы |
| 54 | Рыўлін | Абрам-Йосл | Залман-Хаім | 8 | Бабынічы |
| 55 | Рыўлін | Элья-Іцык | Залман-Хаім | 3 | Бабынічы |
| 56 | Рыўлін | Ітка-Рыўка | Залман-Хаім | 1 | Бабынічы |
| 57 | Белькінд | Мэір | Давід | 60 | Бабынічы |
| 58 | Белькінд | Хана-Двойра | Абрам | 40 | Бабынічы |
| 59 | Белькінд | Берка | Мэір | 32 | Бабынічы |
| 60 | Белькінд | Мендэль-Лейба | Мэір | 23 | Бабынічы |
| 61 | Белькінд | Бэйла-Злата | Берка | 30 | Бабынічы |
| 62 | Белькінд | Сора-Лея | Берка | 8 | Бабынічы |
| 63 | Белькінд | Хана-Блюма | Берка | 6 | Бабынічы |
| 64 | Белькінд | Доба-Хая | Берка | 1 | Бабынічы |
| 65 | Шэрман | Насон | Пэйсах | 65 | Бабынічы |
| 66 | Шэрман | Эстра | Йосл | 39 | Бабынічы |
| 67 | Шэрман | Хаім | Насон | 46 | Бабынічы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 68 | Шэрман | Мар'яся | Вульф | 45 | Бабынічы |
| 69 | Шэрман | Шлома | Хаім | 19 | Бабынічы |
| 70 | Шэрман | Мойша-Файвіш | Хаім | 17 | Бабынічы |
| 71 | Шэрман | Пэйсах | Хаім | 16 | Бабынічы |
| 72 | Шэрман | Крэйна | Хаім | 18 | Бабынічы |
| 73 | Шэрман | Гіта | Хаім | 10 | Бабынічы |
| 74 | Шэрман | Эстра | Хаім | 5 | Бабынічы |
| 75 | Шэрман | Стэрна | Хаім | 1 | Бабынічы |
| 76 | Шэрман | Міхель | Хаім | 25 | Бабынічы |
| 77 | Шэрман | Малка | Лейб | 22 | Бабынічы |
| 78 | Шэрман | Крэйна-Мэрка | Міхель | 2 | Бабынічы |
| 79 | Шэрман | Іцко-Йосл | Хаім | 70 | Бабынічы |
| 80 | Шэрман | Сося | Берка | 68 | Бабынічы |
| 81 | Шэрман | Абрам | Іцко-Йосл | 38 | Бабынічы |
| 82 | Шэрман | Голда | Мойшэ | 35 | Бабынічы |
| 83 | Шэрман | Ісроэль | Абрам | 18 | Бабынічы |
| 84 | Шэрман | Аншэль | Абрам | 11 | Бабынічы |
| 85 | Шэрман | Шулька | Абрам | 8 | Бабынічы |
| 86 | Шэрман | Брайна | Абрам | 5 | Бабынічы |
| 87 | Шэрман | Ітка | Абрам | 2 | Бабынічы |
| 88 | Шэрман | Хаім | Іцко-Йосл | 30 | Бабынічы |
| 89 | Шэрман | Буня | Йосл | 25 | Бабынічы |
| 90 | Шэрман | Борух | Хаім | 12 | Бабынічы |
| 91 | Шэрман | Міхель | Хаім | 10 | Бабынічы |
| 92 | Шэрман | Элька | Хаім | 7 | Бабынічы |
| 93 | Шэрман | Залман | Хаім | 3 | Бабынічы |
| 94 | Хацянаў | Хана-Муся | Мойшэ | 45 | Арэхаўна |
| 95 | Хацянаў | Абрам-Мойшэ | Руман | 19 | Арэхаўна |
| 96 | Хацянаў | Хая-Міхля | Руман | 25 | Арэхаўна |
| 97 | Хацянаў | Бэйля | Руман | 17 | Арэхаўна |
| 98 | Марковіч | Давід-Лейба | Ісроэль | 62 | Арэхаўна |
| 99 | Марковіч | Эстра | Нохум | 61 | Арэхаўна |
| 100 | Марковіч | Ісроэль | Давід-Лейба | 45 | Арэхаўна |
| 101 | Марковіч | Сорка-Рыўка | Міня | 44 | Арэхаўна |
| 102 | Марковіч | Хаім-Мэндэль | Ісроэль | 21 | Арэхаўна |
| 103 | Марковіч | Абрам-Іцык | Ісроэль | 15 | Арэхаўна |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 104 | Марковіч | Міня | Ісроэль | 8 | Арэхаўна |
| 105 | Марковіч | Нохум | Давід-Лейба | 44 | Арэхаўна |
| 106 | Марковіч | Роха-Рыўка | Рэфаэль | 44 | Арэхаўна |
| 107 | Марковіч | Іцык | Нохум | 12 | Арэхаўна |
| 108 | Марковіч | Юда | Нохум | 11 | Арэхаўна |
| 109 | Марковіч | Бэйла-Фаня | Нохум | 17 | Арэхаўна |
| 110 | Марковіч | Іта | Нохум | 16 | Арэхаўна |
| 111 | Марковіч | Тоўба | Нохум | 13 | Арэхаўна |
| 112 | Марковіч | Хана | Нохум | 10 | Арэхаўна |
| 113 | Марковіч | Голда | Нохум | 4 | Арэхаўна |
| 114 | Марковіч | Гутман | Нохум | 3 | Арэхаўна |
| 115 | Марковіч | Мар'яся | Нохум | 1 | Арэхаўна |
| 116 | Шымкін | Іцык | Вульф | 32 | Чашнікі |
| 117 | Шымкін | | Ісроэль | 33 | Чашнікі |
| 118 | Шымкін | Залман-Ліпа | Іцык | 12 | Чашнікі |
| 119 | Шымкін | Йосл-Бэр | Іцык | 1 | Чашнікі |
| 120 | Гофунг | Янкель | Шэпсэль | 75 | Арэхаўна |
| 121 | Гофунг | Пэся-Мэрка | Залман | 60 | Арэхаўна |
| 122 | Гофунг | Сорка | Янкэль | 25 | Арэхаўна |
| 123 | Гофунг | Орка | Янкэль | 24 | Арэхаўна |
| 124 | Гофунг | Рыўка | Янкэль | 18 | Арэхаўна |
| 125 | Гофунг | Мордкэ | Янкэль | 28 | Арэхаўна |
| 126 | Гофунг | Фрада | Йосл-Янкэль | 30 | Арэхаўна |
| 127 | Йофэ | Шмуэль | Мордкэ | 43 | Бабынічы |
| 128 | Йофэ | Цырля | Лей | 64 | Бабынічы |
| 129 | Йофэ | Абрам-Йосл | Шмуэль | 19 | Бабынічы |
| 130 | Йофэ | Нота | Шмуэль | 14 | Бабынічы |
| 131 | Йофэ | Мордкэ | Шмуэль | 8 | Бабынічы |
| 132 | Йофэ | Йосл | Шмуэль | 1 | Бабынічы |
| 133 | Йофэ | Сорка | Шмуэль | 20 | Бабынічы |
| 134 | Йофэ | Фрэйда | Шмуэль | 15 | Бабынічы |
| 135 | Йофэ | Мася | Шмуэль | 10 | Бабынічы |
| 136 | Фейгельман | Залман-Міхель | Мордкэ | 35 | Бабынічы |
| 137 | Фейгельман | Хана | Янкэль | 29 | Бабынічы |
| 138 | Фейгельман | Йосл-Мордкэ | Залман-Міхель | 8 | Бабынічы |
| 139 | Фейгельман | Абрам-Іцык | Залман-Міхель | 2 | Бабынічы |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 140 | Фейгельман | Рэйза | Залман-Міхель | 10 | Бабынічы |
| 141 | Фрыдман | Насон | Іцык-Біня | 65 | Бабынічы |
| 142 | Фрыдман | Сора-Іта | | 63 | Бабынічы |
| 143 | Мільман | Бэрка | Ісроэль | 60 | Арэхаўна |
| 144 | Мільман | Фэйга | Файтэль | 58 | Арэхаўна |
| 145 | Мільман | Янка-Іцык | Бэрка | 23 | Арэхаўна |
| 146 | Мільман | Сорка | Бэрка | 20 | Арэхаўна |
| 147 | Мільман | Гірш | Бэрка | 35 | Арэхаўна |
| 148 | Мільман | Геня-Эстра | Юда | 33 | Арэхаўна |
| 149 | Дворын | Залман | Іцык-Орка | 80 | Бабынічы |
| 150 | Дворын | Сорка-Рыўка | Шая | 75 | Бабынічы |
| 151 | Дворын | Мойшэ | Шалом | 17 | Бабынічы |
| 152 | Хацянаў | Йосл | Руман-Арон | 35 | Арэхаўна |
| 153 | Хацянаў | Шыфра | Залман | 30 | Арэхаўна |
| 154 | Хацянаў | Залман-Арон | Йосл | 8 | Арэхаўна |
| 155 | Хацянаў | Хана-Іта | Йосл | 4 | Арэхаўна |
| 156 | Гандман | Эстра | Йосл | 1 | Арэхаўна |
| 157 | Гандман | Абрам | Янкэль | 55 | Ушачы |
| 158 | Гандман | Хайка | Гершон | 47 | Ушачы |
| 159 | Гандман | Шмуэль | Абрам | 11 | Ушачы |
| 160 | Гандман | Муся | Абрам | 22 | Ушачы |
| 161 | Гандман | Мася-Фая | Абрам | 14 | Ушачы |
| 162 | Гандман | Рыўка-Мар’яся | Абрам | 12 | Ушачы |
| 163 | Гандман | Хена-Двойра | Йосл | 75 | Ушачы |
| 164 | Хацянаў | Мэір-Лейба | Шалом-Перац | 53 | Арэхаўна |
| 165 | Хацянаў | Дрэйза | Арон | 40 | Арэхаўна |
| 166 | Хацянаў | Шалом-Перац | Мэір-Арон | 19 | Арэхаўна |
| 167 | Хацянаў | Мэір-Лейба | Мэір-Арон | 6 | Арэхаўна |
| 168 | Хацянаў | Элья | Мэір-Арон | 14 | Арэхаўна |
| 169 | Хацянаў | Роха | Мэір-Арон | 24 | Арэхаўна |
| 170 | Хацянаў | Мася-Бэйла | Мэір-Арон | 9 | Арэхаўна |

ЦДГАБ ф.2501, воп.1,с.336, арк.466-468



Сямейства Шэрман, 1916г
Фота з персанальнага архіва А. Шэрман



1912 г. ЧАСТЬ I. О РОДИВШИХСЯ. 1912 г.

| № Женскаго. | № Мужского. | Кто совершалъ обрядъ обрѣзанія. | Число и мѣсяцъ рожденія и обрѣзанія 1912 г. Христіанскій. | Число и мѣсяцъ рожденія и обрѣзанія 1912 г. Еврейскій. | Гдѣ родился. | Состояніе отца, имена отца и матери. | Кто родился и какое ему или ей дано имя. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| " | 124 | Тотъ же | Мартъ 29 Апрѣля 5 | Нисанъ 24 Іюаръ 1 | [illegible] | Отецъ: Бобыничскій, Лепельскаго уѣзда, мѣщанинъ Михель Шаевъ Шерманъ, Мать: Гитель Хаимова, ур. Гришканъ. | Сынъ: Яковъ. |

6.II.2009

Пасведчанне аб нараджэнні Я. Шэрмана, прадзеда А. Шэрман.
Дакумент з асабістага архіва А. Шэрман

## Дадатак №2




*Бабынічы на польскай карце. Дакумент з фонду школьнага музея*

**Дадатак № 3**

Спіс

жыхароў в. Бабынічы на здачу зерня ( красавік 1924)

1.Левіт Гірша
2. Брэвдзев Кастрэль
3. Мільман Юда
4.Гофунг Грена
5.Гофунг Янкель
6.Іофе Хаім
7. Кравец Лейба
8.Шэрман Ізраэль
9. Палітыка Фёдар
10. Равкінд Абрам
11.Шэрман Зальман
12.Хацянаў Маісей
13. Шэрман Міхал
14. Агапаў Сцяпан.
15.Фінкельштэйн Лейб
16.Кароўчанка Цімафей
17. Шэркін Зэйман
18.Рабіновіч Іосель
19. Ціравшын Абрам
20.Іофэ Моця
21. Беленькі Берка
22. Левіт Ілля
23. Гофунг Займан
24. Тарасевіч Сяргей
25. Бляхман Іахам
26.Сорын Ізраэль
27. Сорын Юда
28. Пагодзін Уладзімір
29. Топаз Айзік
30. Топаз Евель
31. Блант Міхель
32. Шэрман Борух
33. Лефлер Беджамін
34.Фегельман Хана
35. Свердлін Рахім
36.Нарбут Пётр
37. Мільман Ізраэль
38. Шынелька Іосіф
39. Язмір Берка
40. Вінтер Давід
41. Вінтер Двейль
42. Рывшын Хаім
43. Шуб Аўтер
44.Іофэ Сора
45. Гельман Лейзер
46.Пэн Сіма
47. Перэц Хацянаў
48. Гельман Абрам
49. Аўласенка Аляксей
50. Гафунг Мортфель

51.Семканава Палагея

52. Іваноўскі Мікалай.

53.Рэвзен Янкель

54.Перэльсон Шавель

55.Фегельман Файфель.

56. Сорын Нохіль.

57.Шэрман Гольда

58.Беленькі Абрам.

59. Хацянаў Мірон.

60. Шэріан Пейсах.

61. Шэрман Біда

62. ліфунг Хаім.

63. Левіт Эля.

64.Бляхав Ноім

65.Марковіч Нолан.

66.Свердліна Рахіль

67. Гельман Абрам

68. Гельман Лейзер

69.Гельман Абрам

70. Шэрман ( імя неразборліва)

/ Занальны архіў у г. Полацку. Ф. 734, воп.1, арк.31

**Дадатак №4**




*Малюнак Л.У. Ганчарова. Фонд школьнага музея*

**Дадатак №5**

## Воіны, якія загінулі ці прапалі без звестак

### Вёска Бабынічы

Баланчук Пётр Антонавіч, н.у 1912 г., радавы, прапаў без звестак у кастрычніку 1944 г.

Булах Якаў Канстанцінавіч, н. у 1914 г., радавы, прапаў без звестак у кастрычніку 1944 г.

Глебка Васіль Сцяпанавіч , н. у 1909 г., радавы, прапаў без звестак у кастрычніку 1944 г.

Жаўранак Фёдар Паўлавіч, н. у 1917 г., радавы, прапаў без звестак у жніўні 1941г.

Лейтман Ізраіль Яфімавіч, н. у 1919 г., старшы лейтэнант, прапаў без звестак у кастрычніку 1944 г.

Мароз Пётр Аўсеевіч, н. у 1921г., радавы, палявая пошта 44193, прапаў без звестак 01.03.1945г.

Мароз Яўсей Маркавіч, н. у 1905 г., радавы, прапаў без звестак у кастрычніку 1944.

Мурашка Іосіф Піліпавіч, чырванафлоцец, прапаў без звестак 06.10.1941 г.

Падсаднік Антон Яфімавіч, н. у 1913 г., радавы, прапаў без звестак у верасні 1944 г.

Падсаднік Кірыла Радзівонавіч, н. у 1915 г., радавы 172-га асб 108-й сд, прапаў без звестак 29.07.1941 г..

Падсаднік Леанід Радзівонавіч, н. у 1921 г., радавы 51-й сд, памёр ад ран 12.12.1944 г., пахаваны ў г. Слабадскі Кіраўскай вобл.

Падсаднік Міхаіл Радзівонавіч, н. у 1918 г., радавы, танкіст, прапаў без звестак у кастрычніку 1944 г.

Пазняк Нічыпар Нічыпаравіч, н. у 1920 г., старшы сяржант, прапаў без звестак у кастрычніку 1943г.

Пазняк Пётр Паўлавіч, н. у 1922 г., радавы, прапаў без звестак у верасні 1944 г.

Рыўлін Уладзімір Яфімавіч, н. у 1913 г., радавы, загінуў 02.02.1942, пахаваны ў пас. Бетліца Куйбышаўскага р-на Калужскай вобл.

Садкоўскі Антон Вікенцьевіч, памёр у палоне ў 1942 г.

Сапега Максім Антонавіч, н. у 1927 г., радавы, прапаў без звестак у верасні 1944 г.

Сапега Мікалай Данілавіч, н. у 1912 г., гвардыі радавы 22-га гв. сп 9-й сд, загінуў 15.08 1944 г., пахаваны на Скайсткалненскіх вайсковых могілках, Латвія.

Сапега Парфен антонавіч, н. у 1912 г., радавы 334-й сд, загінуў 30.10.1944 г., пахаваны ў в. Муцэніоне, Латвія.

Серафімаў Іван Васільевіч, н. у 1920 г., радавы, прапаў без звестак у верасні 1944 г.

Храмёнак Мікалай Антонавіч, н. у 1921 г., малодшы сяржант, 100-й сд, загінуў 18.09.1942 г., пахаваны ў в. Чыжоўка Варонежскай вобл.

Церашкевіч Іван Захаравіч, н. у 1920 г., радавы, прапаў без звестак у верасні 1944 г.

Церашкевіч Кірыла Захаравіч, н. у 1913 г., радавы. прапаў без звестак у кастрычніку 1944 г.

Шэрман Ізраіль Ізраілевіч, н. у 1921 г., сяржант, прапаў без звестак у студзені 1944 г.[4]



Гр. ЛЮБЧИК М.Н.

БССР, Витебская обл.,
Полоцкий район,
Бабыничский с/с
д. Будьковщина

На Ваше письмо сообщаю, что в книге учета безвозвратных потерь личного состава 1 гв. бомбардировочной авиадивизии за 1942-45 гг., значится :

" Штурман экипажа 80 гв. бомбардировочного авиаполка, гв. мл. лейтенант ЛЮБЧИК Владимир Парфилович ( так в тексте), 1922 года рождения, 17.9.1944 г. погиб при взлете на боевое задание (аэродром Яссеньки) сбит истребителем противника.
Похоронен : Польша, Жешувский уезд, с. Яссеньки, кладбище"

ОСНОВАНИЕ : фонд 20001, опись 2, д.3, л. 30.

Других данных нет.

НАЧАЛЬНИК АРХИВОХРАНИЛИЩА

( КОРЕНЯК )

исп. Сицкая
отп. кз

**Адзін з нашых землякоў, што аддалі жыццё за Радзіму.**

*Дакумент з фонду школьнага музея*

**Дадатак № 6**

**Партызаны, падпольшчыкі, удзельнікі антыфашысцкага руху, асобы, якія садзейнічалі партызанскаму руху і падполлю, члены іх сем’яў і мірныя жыхары - ахвяры фашысцкага тэрору**

**Вёска Бабынічы**

Аўласенка Уладзімір Іванавіч, н.у 1922 г., партызан, загінуў 05.05.1944 г.

Бруквін Эдуард Карлавіч, н. у 1924 г., партызан, загінуў 28.03.1943 г., пахаваны ў в. Пашкі.

Гаўрылічык Герасім Пятровіч, н. у 1907 г., партызан, загінуў 07.05.1944 г., пахаваны ў в. Рабчонкі.

Гладышаў Міхаіл Барысавіч, н. у 1927 г., партызан, прапаў без звестак 04.05.1944 г.

Крынчык Пётр Паўлавіч, н. у 1908 г., партызан, прапаў без звестак.

Кучко Віктар, прапаў без звестак.

Лейтман Навум Яфімавіч, н. у 1903 г., расстраляны.

Лейтман Фаіна Яфімаўна, н. у 1922 г., расстраляна.

Лысак Дзмітрый Гаўрылавіч, н. у 1913 г., партызан, прапаў без звестак 05.05.1944 г.

Лысак Іван Гаўрылавіч, прапаў без звестак.

Нікалаеў Аляксандр Якаўлевіч, н. у 1895 г., партызан, прапаў без звестак 07.05.1944 г.

Падсаднік Пётр Лук’янавіч, н. у 1910 г., прапаў без звестак.

Падсаднік Трафім Пятровіч, н. у 1899 г., партызан, прапаў без звестак.

Расейкін Антон Васільевіч, н. у 1905 г., партызан, загінуў 07.05.1944 г., пахаваны ў роднай вёсцы.[4]

**Дадатак № 7**

## Ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій

## Вёска Бабынічы

Баравік Аляксей Антонавіч, н. у 1902 г., калгаснік калгаса імя Мялешкі, арыштаваны 15.10.1938 г., расстраляны 06.11.1938 г., рэабілітаваны пасмяротна 24.04.1964 ВТ БВА.

Беленькі Іосіф Абрамавіч, н. у 1899 г. у в. Бабынічы, кравец арцелі “Чырвоны пагранічнік”, арыштаваны 02.12.1937 г., зняволены ў ППЛ, рэабілітаваны ў 1989 г.

Прашкевіч Барыс Кліменцьевіч, н. у 1877 г. у в. Бабынічы, калгаснік, арыштаваны 21.01.1933 г., зняволены ў канцлагер, рэабілітаваны ў 1989 г.[4]

**Дадатак № 8**

**Яны вярнуліся пераможцамі**

**Вёска Бабынічы**

Аўсеенка Міхаіл Сямёнавіч

Ключонак Мірон Фадзеевіч

Мароз Іван Васільевіч

Мялешка Арцём Патапавіч

Падсаднік Міхаіл Андрэевіч

Свірыдзенка Лідзія Апанасаўна[4]

**Дадатак № 9**

**Брацкая магіла ў вёсцы Бабынічы**

Васюковіч Міхаіл Ягоравіч, н. у 1923 г. у Докшыцкім р-не, партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 10.05.1944 г. у в. Бабынічы.

Гаўрыльчык Герасім Пятровіч, н. у 1907 г. у в. Бабынічы, партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 07.07.1943 г. у в. Рабчонкі.

Глебка Аляксей Вікенцьевіч, н. у 1921 г. у в. Забелле, партызан брыгады імя Варашылава, памёр ад хваробы 06.07.1944 г.

Голер Франц Францавіч, н. у 1924 г. у в.Бабынічы, партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 06.05.1944 г. у в. Бабынічы.

Запарожац Аляксей Іванавіч, н. у 1912 г. у г.Адэса, партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 19.11.1943 г. на ст. Загацце.

Кузьмін Міхаіл Паўлавіч, партызан брыгады імя Дзяржынскага, загінуў 06.05.1944 г. у в. Рабчонкі.

Кухарэнка Пётр Якаўлевіч, н. у 1924 г.у в.Быстрыца, партызан брыгады імя Чапаева, загінуў 21.06.1943 г. у в. Бабынічы.

Лесовіч Цярэнцій Філіпавіч, н. у 1916 г. у в. Лесава, журналіст, складаў гісторыю брыгады імя Варашылава, загінуў 07.06.1944 г. у в. Рабчонкі.

Лукашэвіч Андрэй Іванавіч, н. у 1925 г. у г. Полацку, партызан брыгады імя Варашылава, памёр ад ран 03.05.1944 г. у в. Лабэцкія.

Мар'ін Леанід Дзяменцьевіч, н. у 1919 г., сяржант, загінуў 10.05.1943 г. у в.Жураўна.

Мачульскі Канстанцін Вітольдавіч, н. у 1917 г. у Чашніцкім р-не, радавы, загінуў 04.05.1944 г. у в. Рабчонкі.

Паўлаў Мікалай Міхайлавіч, н. у 1923 г. у г. Масква, партызан брыгады імя Варашылава, памёр ад ран 22.01.1944 г. у в. Бабынічы.

Падсаднік Дзмітрый Ігнацьевіч, н.у 1926 г. у в. Рабчонкі, партызан брыгадыімя Варашылава, загінуў 14.09.1943 г. у в.Рабчонкі.

Пыр’еў Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1919 г. у Навасібірскай вобл., гвардыі яфрэйтар 9-й сд, загінуў у в. Забелле.

Расейкін Антон Васільевіч, н. у 1905 г., партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 07.05.1944 г. у в. Жураўна.

Раманенка Павел Грыгоравіч, н. у 1906 г. у Іркуцкай вобл., радавы, загінуў 29.06.1944 г. у в. Жураўна.

Раманаў Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1919 г. у Калінінскай вобл., партызан Смаленскага партызанскага палка, загінуў 08.03.1944 на ст.Загацце.

Сарока Сцяпан Аляксеевіч, н. у 1909 г. у в. Петухоўшчына, партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 05.05.1944 г. у в. Буярова.

Стратовіч Міхаіл Сямёнавіч. н. у 1920 г. у Жытомірскай вобл., партызан брыгады імя Варашылава, загінуў 03.05.1944 г. у в.Лабэцкія.

Цярэнцьеў Міхаіл Карповіч, н. у 1922 г. у Лёзненскім р-не, партызан Смаленскага партызанскага палка, загінуў 08.03.1944 г. на ст. Загацце.

Філіпенка Сцяпан Антонавіч, н. у 1923г. у Шумілінскім р-не, партызан брыгады імя Дзяржынскага, загінуў 06.05.1944г. у в.Рабчонкі.

Чаркасаў Дзмітрый Іванавіч, радавы, загінуў 01.07.1944г. у в. Бабынічы.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. ”Аднавяскоўцы. Дэмаграфічны нарыс”. Навукова-даследчая праца АсташкевічУ., Зайцавай І., Станоўка М. Кіраўнік С.П. Станоўка. Бабынічы 2011.

2. Архіўныя дакументы : /"Памятная кніга Віцебскай губерніі на 1883 год", ЦДГА : /ф.2507, воп. 1., с. 186, арк. 32 об.;33/ /ф.2507,воп. 1.,с.4869, арк. 38-39 .; ф.2507, воп. 1., с.4963, арк. 18/, /ф.2507, воп.1.с. 2574/, /ф.1446, воп.6, с.830, арк. 277-278 /, / ф.2507, оп.1, д.4809, лл38-39 / , / ф.2507, воп.1, с. 2574 / , /ф.2507, воп.1,с.25-74 /, / ф.1416, воп.6, с.830, арк.227-278 / , ф.2501, воп.1,с.336, арк.466-468
Філіял дзяржархіва Віцебскай вобл. у г.Полоцку / ф.51, воп.1,с.10, арк..4./, / ф.374, воп.1, арк.31/

3. “ Вялікая гісторыя малой радзімы. Акупацыя на бабыніцкай зямлі.” Навукова- даследчая праца. Вілішчук М., Грыднева К. , Падсаднік Я. Кіраўнік З.Дз.Шклянік. Бабынічы 2011.

4. Памяць. Полацкі раён. Гісторыка-дакументальная хроніка гарадоў і раёнаў Беларусі. – Мн., 1999

5. Пісьмо Цябута Дз., камандзіра брыгады імя Варашылава ў газету”Віцебскі рабочы” / НГАБ, ф.1499, воп. 1,арк.8/ (Цытуецца з захаваннем аўтарскай арфаграфіі і пунктуацыі

6. Пісьмо настаўніка Бабыніцкага народнага вучылішча В.Драздзецкага ў газету “Віцебскі голас” ад 2 лістапада 1906 г. ЦДГА . /ф.1416, воп.6, с.830, арк.227-278 /

7.Пісьмо Гелярыя Левіта, які вучыўся ў Бабыніцкай школе ў 1916-1917 г.г. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

8. Пісьмо Е.В.Уладзіміравай, настаўніцы школы ў 1926-1931 гг. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

9.Пісьмо сакратара Бабыніцкай ячэйкі камсамола Рыгора Сядлоўскага. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

10. Пісьмо Пазняк Надзеі Мікалаеўны, якая працавала дырэктарам Бабыніцкай школы ў 1944 годзе. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

11.Пісьмо Кімстач М.В., настаўніцы Бабыніцкай школы ў 1906-1910 гг. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

12. Пісьмо Пазняк Надзеі Мікалаеўны, якая працавала дырэктарам Бабыніцкай школы ў 1944 годзе. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

13.Пісьмо старшыні Арэхаўскага волрэўкома В.Серафімава ў Полацкі ўездны выканкам ад 30 снежня 1920 г.(Цытуецца з захаваннем аўтарскага стылю,арфаграфіі і пунктуацыі) Філіял дзяржархіва Віцебскай вобл. у г.Полоцку, ф.51, воп.1,с.10, арк..4.

14. Пісьмо Кімстач Марыі Васільеўны,настаўніцы Бароўскай школы ў 1916-1928гг. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

15..Пісьмо заслужанага пілота СССР , лётчыка-палярніка Маскаленкі П.П.ад 12 кастрычніка 1968г. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)

16. Пісьмо Маханькова У.А., камандзіра атрада “ Мститель” брыгады імя Варашылава ад 5.04.1975 краязнаўцам школы. ( Цытуецца на мове арыгінала)

17. Пісьмо Глебавай С.М., 1954г.н., жыхаркі г. Жукоўскі Маскоўскай вобласці

18. Спірыдонаў М. Полаччына : 16 стагоддзе. “ За перадавую навуку” , студзень 1990г.

19.Тябут Д.В. Сквозь огонь. – Мн., 1979

20. Тябут Д.В. На освобождённой земле. – Мн.,1982

21. Тябут Д.В. На земле опалённой. – Мн., 1984

22. Успаміны Агапончыка Г.А. 1928 г.н., жыхара в. Баярова.

23. Успаміны Бубновай Н.В., 1932 г.н., жыхаркі в. Рабчонкі
24. Успаміны Булах М.А. ,1931г.н., жыхаркі в. Вуглы
25. Успаміны Гарбаценка С.І., 1927 г.н., жыхаркі в. Вуглы
26.Успаміны Кухарэнка Н.Н. , 1924 г.н., жыхаркі в. Жураўна
27.Успаміны Мялешка Н.В. , 1926 г.н., жыхаркі в. Рабчонкі
28. Успаміны Падсаднік Н.М. , 1926 г.н., жыхаркі в. Бабынічы
29. Успаміны Пазняка В.Т. , 1931 г.н., жыхара в. Бабынічы
30. Успаміны Прашковіч Л.А., 1926 г.н., жыхаркі в. Баярова
31. Успаміны Селіванавай В.І., 1922 г.н., жыхаркі в. Рабчонкі
32. Успаміны Станоўка Р.К., 1930 г.н., жыхаркі в. Вуглы
33.Успаміны Тарасевіча Б.С., 1922 г.н.,жыхара в. Бабынічы
34. Успаміны Ценеравай А.М., 1926 г.н., жыхаркі в. Рабчонкі
35.Успаміны Церашкевіча І.К., 1934 г.н., жыхара в. Бабынічы
36. Успаміны Шпілецкага А.А., 1926 г.н., жыхара в. Будзькаўшчына
37. Успаміны Падсаднік Антаніны Сяргееўны,1926 г.н.,жыхаркі г.Полацка.
38.Успаміны Ліхачова В.І.,гвардыі маёра запасу. ( фонд школьнага краязнаўчага кутка)
39. Шклянік З.Дз. “ Пераклад з ідыш”. Апавяданне.
40.Энцыклапедыя гісторыі Беларусі.Мн.,” беларуская энцыклапедыя”, 1993
41. Энцыклапедыя : Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941– 1945 г.г. –Мн., 1990
42. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ў 6-ці тамах. Полацка-Лепельская партызанская зона. т.5. –Мн.,1999
43. Энцыклапедыя прыроды Беарусі. Мн., 1974